

## Бавім канікулы з карысцю

СТАР. 7



## Оперны: што за кулісамі?

СТАР. 15



## Правілы маркетынгу… для кіёскаў

СТАР. 19

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 МАЯ 2016 г. СУБОТА № 100 (28210) Кошт 2400 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Рэпартаж з нагоды

# НАДЗЕЙНАЯ МЯЖА



Старшы лейтэнант Вадзім ЧАПАЙЛА і лейтэнант Дзяніс БРАЦКІ з аддзялення беспілотных авіяцыйных комплексаў з апаратамі «Шэршань».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка павіншаваў камандаванне, асабовы склад, ветэранаў органаў пагранічнай службы краіны з прафесійным святам — Днём пагранічніка.

«Абарона рубяжоў Айчыны ва ўсе часы лічылася справай мужных воінаў, якія стойка аберагаюць родную зямлю ад любых замахаў. Мы схіляем галовы перад памяццю тых байцоў, якія ў гады Вялікай Айчыннай вайны першымі сустрэлі ворага і заплацілі сваім жыццём за нашу мірную будучыню», — гаворыцца ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што цяперашняе пакаленне пагранічнікаў беражліва захоўвае і прымнажае ратныя традыцыі сваіх папярэднікаў, актыўна процідзейнічаючы міжнароднаму тэрарызму, незаконнай міграцыі, кантрабандзе і іншым правапарушэнням. «Упэўнены, што ва ўмовах новых рызык і выклікаў сучаснасці вы, як сапраўдныя патрыёты, будзеце і надалей з гонарам абараняць нашы непарушныя межы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт выказаў словы асаблівай удзячнасці ветэранам-пагранічнікам, якія паказалі сапраўдны прыклад адданасці Радзіме і самаахвярнага служэння свайму народу, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

**Многія, пэўна, уяўляюць сабе абрысы нашай краіны, выява якіх часта выкарыстоўваецца пры афармленні прыгожых білбордаў, турыстычных праспектаў і іншай даведачнай літаратуры. Менавіта гэта замкнёная лінія — наша дзяржаўная мяжа. Яна пад надзейнай аховай. У гэтым карэспандэнтам «Звязды» давялося пераканацца, што называецца, на ўласным досведзе. Напярэдадні Дня пагранічніка Дзяржаўным пагранічным камітэтам быў наладжаны прэс-тур для кіраўнікоў рэспубліканскіх СМІ.**

СТАР. 5

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Васіль ЖАРКО, міністр аховы здароўя:**

*«Сёлета, зыходзячы з патрэбнасці арганізацый аховы здароўя ў медыцынскіх кадрах, павялічаны набор у медыцынскія каледжы і нязначна паніжаны — у вышэйшыя медыцынскія ўстановы адукацыі. Прыём у медуніверсітэты складзе 1515 чалавек на бюджэтнай аснове, у тым ліку 605 чалавек па мэтавых напрамках, у медыцынскія каледжы — 1955 чалавек на бюджэтнай аснове, у тым ліку 718 — па мэтавых дагаворах. Патрэба ў вузканакіраваных спецыялістах (эндакрынолагах, хірургах, флеболагах і інш.) папаўняецца за кошт спецыялістаў, якія маюць вопыт практычнай работы ў ахове здароўя і праходзяць ва ўстаноўленым парадку перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.05.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19712,00 | ▲ |
| Еўра | 22037,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 298,80 | ▼ |
| Укр. грыўня | 784,17 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Прамая лінія

## УСЁ, ШТО ВЫ ХАЦЕЛІ ДАВЕДАЦЦА ПРА ПЕНСІІ

**Ці павялічыцца перадпенсійны ўзрост, у якім выпадку працадаўца не мае права не падоўжыць кантракт? Калі будуць выходзіць на пенсію вайскоўцы і міліцыя? Якая выслуга гадоў будзе патрэбна дзяржслужачым? На гэтыя і іншыя пытанні нашым чытачам адказалі падчас «прамой лініі», якая адбылася ў «Звяздзе» 19 мая, спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны — начальнік упраўлення арганізацыі пенсійнага забеспячэння Алена ДРОНАВА і кансультант упраўлення пенсійнага заканадаўства Аляксандра САМАДУМСКАЯ.**

***— Быхавец Людміла Аркадзеўна са Смаргоні. У мяне да вас такое пытанне: цяпер усе гавораць аб страхавых унёсках, але калі я сыходзіла на пенсію ў 90-х гадах, нічога такога не было, і гаворка пра іх не вялася. Так што атрымліваецца — нам такі стаж не залічваецца?***

— Вы ведзяце гаворку пра стаж, які напрацавалі да выхаду на пенсію? Скажыце, калі ласка, калі вы выйшлі на пенсію?

***— У 1995 годзе.***

— У такім выпадку вам быў залічаны ўвесь напрацаваны вамі стаж. У часы СССР перыяд працы людзей, якія падлягалі сацыяльнаму страхаванню, прыраўноўваецца да перыяду працы з уплатай страхавых унёскаў. У вашым выпадку Указ №534, калі вы яго маеце на ўвазе, не аказвае ўплыву ні на атрыманне права на пенсію, ні на памер пенсіі.

СТАР. 4

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## ...АЛЕ НАША МОВА НЕ ЗНІКНЕ!

**Іван Іванавіч АСТРОЎСКІ, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт, намеснік загадчыка кафедры Белдзяржуніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі.**



«Звязду» я выпісваю «сто гадоў» — з тых самых часоў, калі служыў у войску. Малады, здавалася б, быў, але выбар зрабіў свядома — выбраў газету найперш з-за мовы. А потым да яе паступова дадаліся завочныя спаборніцтвы па шашках, складанне прыпевак, удзел у конкурсе «Хто каго?»... Заўсёды любаваўся здымкамі Анатоля Клешчука, чытаў «Фотасловы» Яўгена Пясецкага, смяяўся і, часцяком здаралася, пераказваў іншым «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі» з рубрыкі «...Народ на провадзе!», суперажываў думкам Алены Ляўковіч, Святланы Яскевіч... Жонка (а яна, дарэчы, настаўніца беларускай мовы і літаратуры), апроч гэтага, досыць уважліва чытала і, што называецца, брала на ўзбраенне парады з «Краіны здароўя», «Крынічкі», «Хатняй энцыклапедыі»... Нас цікавіла і цікавіць усё!

Але ж галоўнай адметнасцю «Звязды» была і застаецца мова.

Што рабіць: ад роднай, ад матчынай горад, а тым больш вялікі, прымушае адмаўляцца — хочучы-няхочучы «пераводзіць» людзей на рускую. Менавіта на ёй — і, можна сказаць, адной, хоць афіцыйна ў нас двухмоўе — вырасла ўжо некалькі пакаленняў гараджан. Таму не дзіва, што многія з іх не разумеюць першай з дзяржаўных, горш за тое — пагарджаюць ёй...

І як жа прыемна са старонак «Звязды», «Чырвонкі» даведвацца, што сярод моладзі ўсё больш папулярнай становіцца беларуская, што ёсць цікавасць да нашай гісторыі і культурнай спадчыны...

А зрэшты, прозай можна пісаць доўга, вершаваным радком — карацей:

*На мове дзяцінства чытаць, гаварыць*
*Зусім адвучылі: «Нязвыкла...»*
*Але*
*наша слова гучыць і гучыць,*
*Але*
*наша мова не знікла!*
*І жыць яна будзе, паверце, заўжды:*
*Мы звязаны з роднай навекі!*
*Прымайце ж яе са старонак «Звязды»,*
*Як водар духмяны, як лекі!*

# РАБОТА НА ВЫНІК

## Стратэгію развіцця машынабудавання вызначаць у найбліжэйшы час

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ў час наведвання прадпрыемства холдынга «Амкадор» у Пінску, якое спецыялізуецца на выпуску экскаватараў, пагрузчыкаў, дарожных каткоў і іншай тэхнікі.**

«Мы рыхтуем буйную нараду на ўзроўні Прэзідэнта, каб прыняць стратэгічныя рашэнні, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Зараз спецыялісты працуюць над праграмай стратэгіі ў машынабудаванні. Але скажу галоўнае: нашаму машынабудаванню быць, і не ва ўрэзаным выглядзе. Мы канкурэнтаздольныя. Ужо няма размовы аб тым, што мы не можам канкурыраваць з Германіяй, Швецыяй або Францыяй. Умеем рабіць не горш за іх».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў свой час было шмат размоў наконт таго, ці трэба ў Беларусі захоўваць і развіваць буйныя прамысловыя вытворчасці, такія, як МТЗ, МАЗ, БелАЗ, «Амкадор». Выказваліся думкі, што іх трэба ліквідаваць або прадаць, а займацца чымсьці іншым. «Мы ўсё гэта захавалі, у тым ліку «Амкадор». Сёння гэта ўжо не тое прадпрыемства, якое было калісьці. Гэта велізарны холдынг, куды ўваходзіць каля двух дзясяткаў прадпрыемстваў з больш чым 6 тысячамі работнікаў. Гэта новая прадукцыя найвышэйшага ўзроўню, якая карыстаецца попытам у свеце», — канстатаваў Прэзідэнт.

«Трэба развіваць тое, што ўмеем рабіць. Таму мы заняліся машынабудаваннем і поўныя рашучасці тут прыбавіць», — падкрэсліў беларускі лідар, не выключыўшы, што цікавасць да арганізацыі вытворчасці ў Беларусі можа праявіць і шэраг замежных інвестараў.

Як было далажана Прэзідэнту, прадпрыемствы холдынга «Амкадор» у цэлым і ЗАТ «Амкадор-Пінск» у прыватнасці працуюць устойліва, асвойваюць вытворчасць новых перспектыўных лінеек тэхнікі, выпрацоўваюць канкурэнтаздольную прадукцыю і бачаць перспектывы росту. Разам з тым ёсць пэўныя цяжкасці, абумоўленыя знешнімі фактарамі, курсавой розніцай, неабходнасцю абслугоўваць крэдыты, узятыя пад стварэнне новых магутнасцяў. Аляксандр Лукашэнка заявіў, што пытанне аб магчымасці падтрымкі планаў развіцця холдынга «Амкадор» будзе разгледжана. «Але, вядома, патрэбна аддача. Толькі наперад, чаго б нам ні каштавала», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Гаворачы аб рабоце на знешніх рынках, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што беларускім прадпрыемствам не трэба там канкурыраваць паміж сабой і дзейнічаць раз'яднана. За мяжой неабходна ствараць адзіныя пляцоўкі для продажу тэхнікі і прадастаўлення паслуг.

Асобна Аляксандр Лукашэнка закрануў тэму занятасці, назваўшы найвышэйшай каштоўнасцю захаванне кадравага патэнцыялу, кампетэнтных спецыялістаў рознага ўзроўню, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Гэта асабліва актуальна ў крызісны перыяд, калі, дзейнічаючы выключна на рынкавых прынцыпах, можна спакусіцца пайсці па самым простым шляху, скарачыўшы колькасць работнікаў. У выніку можа быць страчана кампетэнцыя ў той ці іншай сферы і нанесены ўдар па будучым развіцці прадпрыемства. «Гэтага дапусціць нельга. Няхай гэты чалавек крыху менш атрымлівае, але крызіс калісьці закончыцца», — падкрэсліў беларускі лідар.

***

Падчас рабочай паездкі ў Брэсцкую вобласць размова таксама ішла аб сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёна і горада Пінска. Кіраўнік дзяржавы падрабязна цікавіўся ходам нарыхтоўкі кармоў у сельскай гаспадарцы.

Аляксандр Лукашэнка таксама пагутарыў з прадстаўнікамі працоўнага калектыву ЗАТ «Амкадор-Пінск». Адно з галоўных пытанняў, на якое адказаў Прэзідэнт, датычылася маючага адбыцца Усебеларускага народнага сходу. Гэтае мерапрыемства перш за ўсё важнае для кіраўнікоў рознага ўзроўню. «Яны павінны пачуць і ўбачыць, у якім кірунку будзе развівацца краіна, — адзначыў Прэзідэнт. — Будзе сур'ёзная дыскусія па праблемных пытаннях. Гэта не простыя пытанні. Яны перш за ўсё адчуюць на сабе той груз задач, якія будуць пастаўлены, і будуць прымаць удзел у выпрацоўцы гэтага курсу».



Фота БЕЛТА.

«Усебеларускі народны сход выпрацоўвае перспектыву. Ён будзе глядзець у цэлым на прамысловасць (як будзем развівацца, якімі тэмпамі), на сельскую гаспадарку, транспарт, будаўніцтва і г.д.», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Але галоўны блок — гэта эканоміка. Усе астатнія напрамкі мы прапрацавалі. А па эканоміцы вельмі шмат спрэчак, нават рознагалоссяў. Таму я даручыў на працягу дзесяці дзён дапрацаваць гэтую праграму», — дадаў Прэзідэнт.

На яго думку, у праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на пяцігоддзе, якая будзе вынесена на абмеркаванне падчас Усебеларускага народнага сходу, павінны быць прапісаны досыць сур'ёзныя і напружаныя заданні для ўрада. «Мы павінны за пяцігодку, я так думаю, прырасці хоць бы на 12% у ВУП. Урад прапануе пакуль 10,1%», — адзначыў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка таксама расказаў аб рабоце па дыверсіфікацыі экспартных рынкаў, шляхах пераадолення крызісных з'яў у эканоміцы, падыходах да развіцця прамысловасці.

Не засталася ў баку і спартыўная тэма, у прыватнасці няўдалае выступленне зборнай Беларусі па хакеі на нядаўнім чэмпіянаце свету. «Сёння ў хакей не гуляюць, на хакейнай пляцоўцы нават не дужаюцца, не змагаюцца. Сёння на хакейнай пляцоўцы і ў іншых відах спорту ваююць. Калі ты туды выходзіш, то павінен біцца да апошняга. Мы гэтага не зрабілі. Вось галоўны недахоп нашых хакеістаў. Гэта тычыцца і некаторых іншых нашых спартсменаў», — заўважыў Прэзідэнт. Пры гэтым ён падкрэсліў, што ў тым, што тычыцца дзяржавы, для развіцця хакея зроблена ўсё неабходнае. «Нам трэба надаць асаблівую ўвагу ўнутранаму чэмпіянату, каб тут былі добрыя гульцы і каманды гулялі на высокім узроўні. Не трэба спадзявацца на адно «Дынама», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Унутраны чэмпіянат, трэнерскія кадры і жорсткі падыход да падрыхтоўкі хакеістаў. Спачатку вынік — потым зарплата. Такі будзе падыход».

■ Парламенцкі дзённік

# У НАПРАМКУ «ПЛЮСА»

## У другім паўгоддзі «адмоўны трэнд» у эканоміцы будзе пераломлены

**Такія спадзяванні ўрада агучыў першы намеснік прэм'ер-міністра Васіль МАЦЮШЭЎСКІ, які ўчора выступіў перад парламентарыямі з дакладам, прысвечаным эканамічнаму развіццю нашай краіны. Так, нягледзячы на замаруджанне тэмпаў эканомікі, эфект ад ужо прынятых кабінетам міністраў захадаў павінен хутка даць аддачу.**

### БЕЗ АЖЫЯТАЖУ ВАКОЛ ВАЛЮТЫ

Першы віцэ-прэм'ер на пачатку даклада асобна падкрэсліў: сёлета ўрад сумесна з Нацыянальным банкам рэалізуе меры макраэканамічнай балансіроўкі ў эканамічных умовах, якія істотна адрозніваюцца ў горшы бок ад умоў мінулага года.

— Няўстойлівасць на нафтавым, калійным і іншых сыравінных рынках прывяла да падзення аб'ёмаў экспарту нашай краіны на 16,7%, — паведаміў Васіль Мацюшэўскі. — Бюджэт пры гэтым недаатрымаў даходы. У першым квартале даходы ад мытных пошлін на нафтапрадукты склалі толькі 140 мільёнаў долараў пры гадавым плане ў 1,1 мільярда долараў.

У той жа час, звярнуў увагу першы намеснік прэм'ер-міністра, пры ўсёй складанасці сітуацыі забяспечана фінансавая і валютная стабільнасць:

— Мы захавалі балансы знешняга гандлю. За студзень—сакавік 2016 года сальда гандлю таварамі і паслугамі знаходзіцца ў рамках прагнозаў. Своечасова і без страт для міжнародных рэзерваў разлічваемся па валютных пазыках.

Васіль Мацюшэўскі адзначыў, што ў краіне захоўваецца гнуткі валютны курс.

— У першым квартале ваганні курсу дасягалі 22 тысяч за долар пры запланаваным гадавым значэнні 18,7 тысячы, — нагадаў ён. — Рыначныя ваганні валютнага курсу, тым не менш, не выклікалі ажыятажнага попыту на валюту і не абвастрылі сітуацыі на валютным рынку. За чатыры месяцы чыстыя продажы валюты насельніцтву склаў 347 мільёнаў долараў у эквіваленце, у тым ліку ў красавіку — 199 мільёнаў долараў.

Прадстаўнік урада зазначыў, што ў пойнай меры задаволены патрэбы суб'ектаў гаспадарання:

— Пачынаючы з лютага, яны таксама сталі чыстымі прадаўцамі валюты. У красавіку на чыстай аснове юрыдычныя асобамі прададзена прыкладна 116 мільёнаў долараў у эквіваленце.

### ПРОСТЫХ РАШЭННЯЎ НЯМА

— Меры макрабалансіроўкі, роўна як і выкананне знешніх абавязацельстваў, не маглі не адбіцца на тэмпах развіцця эканомікі — перш за ўсё на яе рэальным сектары, — адзначыў Васіль Мацюшэўскі. — Па росце эканомікі ідзём у рамках песімістычнага прагнозу, а гэта, на жаль, адлюстроўваецца і на даходах насельніцтва, на магчымасцях бюджэту расшырыць падтрымку розных галін і сфер эканомікі. Простых рашэнняў, якія даюць маментальны рост эканомікі, на жаль, сёння няма.

Па словах першага віцэ-прэм'ера, ідзе звычайная карпатлівая праца па вырашэнні цэлага шэрагу праблемных пытанняў. У першую чаргу на парадку дня стаяць пытанні росту і выніковасці выкарыстання тых рэсурсаў, што ёсць, зніжэння затрат, павышэння эфектыўнасці прадпрыемстваў і галін.

— Пераходзім на бюджэтаванне, арыентаванне на вынік, — звярнуў увагу прадстаўнік урада. — Што гэта такое на практыцы? Ёсць дзяржаўная праграма, накіраваная на дасягненне пэўных мэт развіцця. Ёсць ліміт бюджэтных сродкаў на фінансаванне гэтай праграмы. Аказанне дзяржаўнай падтрымкі ў рамках названых праграм будзе праводзіцца на ўмовах конкурсу па адборы праектаў з забеспячэннем роўнага доступу суб'ектаў гаспадарання незалежна ад формаў уласнасці. Такі парадак ужо ўстаноўлены.

Васіль Мацюшэўскі зрабіў акцэнт на тым, што эканамічная палітыка ўрада будзе гнуткай, адаптаванай да вонкавых змен.

— Эфект ад ужо прынятых мер дасць магчымасць, паводле нашых ацэнак, у другім паўгоддзі бягучага года выйсці з адмоўнага трэнда эканамічнага развіцця, — заявіў ён.

### АДКАЗЫ НА «ВЫТВОРЧЫЯ» ПЫТАННІ

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Валянціна Лявоненка пацікавілася ў першага віцэ-прэм'ера, ці існуе ва ўрадзе стратэгія развіцця індустрыяльнага сектара эканомікі, якая дазволіць скарацiць наша тэхналагічнае адставанне ад заходніх краін.

Васіль Мацюшэўскі адказаў, што ўрадавыя праграмы якраз і прысвечаны развіццю розных галін эканомікі, яны павінны дапамагчы падняцца нашай краіне на больш высокую тэхналагічную прыступку.

— Мы лічым, што гэтыя 20 праграм павінны істотна паўплываць як на структуру нашай эканомікі, так і на яе ўклад — з пункту гледжання інавацыйных перспектыўных прадпрыемстваў, — адзначыў першы віцэ-прэм'ер.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Вольга Паліцыка спытала першага віцэ-прэм'ера пра стварэнне новых працоўных месцаў. Яна звярнула ўвагу на той факт, што беспрацоўе не зніжаецца.

Дэпутат звярнулася да статыстыкі і адзначыла, што па выніках першага квартала гэтага года на сярэдніх і буйных прадпрыемствах на 30 тысяч чалавек больш было звольнена, чым прынята. Зніжаецца таксама, па словах дэпутата, колькасць людзей, прынятых на дадаткова ўведзеныя працоўныя месцы. Вольга Паліцыка лічыць важным паклапаціцца пра гэта ўжо сёння, каб мы падышлі падрыхтаванымі да наступнага года, калі пачнецца павелічэнне пенсійнага ўзросту, а таксама будзе двайны выпуск у ВНУ — тых, хто вучыўся па чатырохгадовай і пяцігадовай праграмах.

— Гэта ключавое пытанне, — пагадзіўся Васіль Мацюшэўскі. — Самае галоўнае — стварэнне ўмоў для з'яўлення вялікай колькасці эфектыўных, высокааплатных працоўных месцаў. На жаль, гэтая задача хутка не вырашаецца. За месяц-два стварыць умовы для рэалізацыі такой няпростай задачы немагчыма. Мы вельмі сур'ёзна ва ўрадзе працуем над гэтым, у тым ліку з мясцовымі органамі ўлады.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

■ Перспектыва

# ДАМОВА АБ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ



Фота БЕЛТА.

**Учора паміж Міністэрствам замежных спраў Беларусі і саюзам юрыдычных асоб «Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва» (РКП) у Мінску было падпісана пагадненне аб узаемадзеянні на 2016-2020 гады. Дакумент падпісалі міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ і старшыня прэзідыума СЮА «РКП» Уладзімір КАРАГІН.**

Падчас мерапрыемства міністр адказаў на пытанні журналістаў, датычныя некаторых момантаў у знешняй палітыцы. У прыватнасці, Уладзімір Макей адзначыў, што папрокі Літвы наконт бяспекі БелАЭС незразумелыя. Ён звярнуў увагу, што пры правядзенні неабходных стрэс-тэстаў спецыялісты прыйшлі да высновы: калі б рэактар таго тыпу, які будзе на БелАЭС, быў пабудаваны на «Фукусіме», то такой трагедыі там бы не здарылася.

Уладзімір Макей лічыць, што ў апошні час вакол эканамічнага праекта, якім з'яўляецца будаўніцтва БелАЭС, разгарнулася палітычная вакханалія. Ён нагадаў, што літоўскія партнёры займалі канструктыўную прагматычную пазіцыю ў часціцы адмены санкцый ЕС у дачыненні да Беларусі, за што беларускі бок ім удзячны. Аднак, падтрымаўшы адмену санкцый, літоўскія партнёры другой рукой галасуюць за тое, каб шэраг фінансавых еўрапейскіх інстытутаў не супрацоўнічаў з нашай краінай па інфраструктурных праектах, якія так ці інакш могуць быць звязаныя з будаўніцтвам БелАЭС. Такая пазіцыя абсалютна незразумелая. Гэта азначае фактычна новыя завуаляваныя санкцыі», — лічыць кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства.

Таксама міністр паведаміў, што Беларусь гатовая прыняць з візітам Папу Рымскага. Уладзімір Макей удакладніў, што пакуль аб канкрэтных тэрмінах казаць зарана, але ёсць прынцыповая гатоўнасць. Беларусь, паводле яго слоў, гатовая не толькі прыняць пантыфіка з візітам, але і арганізаваць на беларускай зямлі яго сустрэчу з кіраўніком Рускай Праваслаўнай Царквы.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ШМАТНАЦЫЯНАЛЬНЫЯ МАТЫВЫ БЕЛАРУСКАГА ДОМА

## У заключных імпрэзах XI Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур у Гродне прымуць удзел прадстаўнікі 35 грамадскіх аб'яднанняў

**Як Хрыстос, паводле Уладзіміра Караткевіча, прызямліўся ў Гародні, так і заключныя мерапрыемствы фестывалю, які яднае нашых землякоў розных нацыянальнасцяў, атрымалі «прапіску» ў сталіцы Прынямоння. 4-5 чэрвеня гэтае свята адбудзецца ўжо адзінаццаты раз.**


Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

***— Як лічыце, чаму фестываль нацыянальных культур праводзіцца менавіта на Гродзеншчыне? — пацікавіўся карэспандэнт «Звязды» ў начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Аляксандра ВЯРСОЦКАГА.***

— Гэты вельмі пачэсны для Гродзеншчыны выбар, на мой погляд, вызначылі некалькі складнікаў. Безумоўна, тут вялікая заслуга людзей, якія стаялі ля вытокаў ідэі, арганізацыі фестывалю нацыянальных культур і здолелі даказаць у рэспубліканскіх структурах, што лепш за ўсё яго праводзіць менавіта ў горадзе над Нёманам. Не толькі таму, што гэта прыгранічны горад, які суседнічае з Літвой і Польшчай. Адзін з ключавых момантаў, пэўна, у тым, што на тэрыторыі Гродзеншчыны пражываюць людзі больш як 90 нацыянальнасцяў — у міры, згодзе, падтрымліваючы адзін аднаго і паважаючы традыцыі прадстаўнікоў нацыянальных дыяспар, пераймаючы ў іх ўсё лепшае. Яны жывуць у нашым агульным доме пад назвай Рэспубліка Беларусь, захоўваючы, так бы мовіць, часцінку сваёй малой радзімы, дзе калісьці жылі яны альбо іх продкі.

На Гродзеншчыне створаны 24 нацыянальныя грамадскія аб'яднанні, сярод якіх 3 польскія, 6 літоўскіх, 4 яўрэйскія, 2 украінскія, а таксама суполкі рускіх, татар, татара-башкір, чувашоў, грузін, армян, азербайджанцаў і цыганаў. Летась зарэгістравана яшчэ адно, казахскае — абласное аддзяленне міжнароднага грамадскага аб'яднання «Ата-мекен». Дзейнічаюць 6 дамоў палякаў, Літоўскі цэнтр культуры, адукацыі і інфармацыі. У Гродне і Ваўкавыску працуюць сярэднія школы з польскай мовай навучання, а ў Пелясе Воранаўскага раёна і ў Рымдзюнах на Астравеччыне — школы з навучаннем на літоўскай мове. Да таго ж на базе нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў створаны 10 школ выхаднога дня, дзе ўсе ахвотныя (палякі, літоўцы, яўрэі) вывучаюць сваю родную мову, гісторыю, традыцыі.

Што тычыцца культурных падзей, то пры нацыянальных суполках і Дамах культуры Гродзеншчыны дзейнічаюць 34 творчыя калектывы, якія з'яўляюцца пастаяннымі ўдзельнікамі гарадскіх, раённых і абласных святаў, фестываляў, канцэртаў. Прычым яны ўдзельнічаюць не толькі, напрыклад, у святах літоўскай ці польскай культуры, а ў большасці агульнарэгіянальных імпрэз. Пры гэтым улады дапамагаюць нацыянальна-культурным аб'яднанням у набыцці сцэнічных касцюмаў, на льготных умовах і бясплатна прадастаўляюць ім памяшканні для рэалізацыі культурных, адукацыйных, спартыўных і іншых праектаў. Летась на падтрымку іх статутнай дзейнасці з абласнога бюджэту выдзелена больш за 170 мільёнаў рублёў.

Адзначу і тое, што на многія культурныя мерапрыемствы мы запрашаем гасцей з суседніх краін. Нашы сябры з Польшчы і Літвы, у прыватнасці, заўсёды прыязджаюць на фестываль «Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў». У фестывалі-кірмашы «Казюкі», які сумесна з Гродзенскім гарвыканкамам праводзіць гарадскі аддзел Саюза палякаў Беларусі, сёлета ўдзельнічалі больш за 50 народных умельцаў з Беларусі, Польшчы, Украіны. А ўжо таксама традыцыйны фестываль «Паланэз», які ладзяць Саюз палякаў Беларусі і Слонімскі райвыканкам, нядаўна сабраў удзельнікаў з пяці краін.

Дарэчы, адным са складнікаў нядаўняга фестывалю «Аўгустоўскі канал збірае сяброў» стаў беларуска-літоўскі турыстычны форум. Ідэя, лічу, вельмі важная, бо менавіта турызм дае найлепшую магчымасць пазнаёміцца з гісторыяй і культурай іншых народаў. І гэта кладзецца ў скарбонку добрасуседскіх адносін.

***— Чым будзе адметны заключны этап XI Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур?***

— Пра ўсе задумкі казаць не буду — лепш прыехаць у Гродна і ўбачыць самому. Назаву толькі некаторыя адметнасці. Спадзяюся, што цікава будзе з самага пачатку — з шэсця ўдзельнікаў фестывалю пад назвай «Мовай культур размаўляем са светам». Мова танца будзе прадстаўлена класічным рускім балетам, музыка — карэйскімі барабанамі, а тэатральнае мастацтва — майстэрствам кіравання... галавой кітайскага дракона. Пры гэтым будуць выкарыстаны не толькі платформы на аўтамабілях, але і «нацыянальны транспарт» — напрыклад, цыганскія кібіткі.

Хацеў бы звярнуць увагу і на спартыўную старонку фестывалю. Спорт — гэта дух нацыі, у кожнага народа ёсць нейкія нацыянальныя гульні, якімі захапляліся людзі старэйшых пакаленняў, а моладдзю практычна забытыя. Дык вось, на ЦСК «Нёман» правядзём гульні з нацыянальным каларытам — лапта, гарадкі, кітайскі маджонг і іншыя.

Яшчэ адна сёлетняя фестывальная «фішка» — так званы музей пад адкрытым небам у парку Жылібера, які пазнаёміць усіх зацікаўленых з прыладамі для прыгатавання розных нацыянальных страў. Мы ведаем, дапусцім, што такое манты. Але як яны гатуюцца, з дапамогай чаго?

Упершыню генеральным інфармацыйным партнёрам фестывалю сёлета будзе тэлеканал АНТ. Выдадзім фотаальбом «Летапіс рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур». А ў СШ №8 ствараюць яго музей, які будзе прысвечаны розным нацыянальна-культурным аб'яднанням.

***— Фестываль нацыянальных культур — гэта як вішанька на сёлетнім культурным «торце». А што яшчэ цікавага праводзіцца на Гродзеншчыне ў Год культуры?***

— Ужо па добрай традыцыі самыя лепшыя работнікі сферы культуры і мастацтва ўшаноўваюцца прэміяй імя Аляксандра Іосіфавіча Дубко абласнога выканаўчага камітэта. Вельмі ўдала, на мой погляд, нядаўна прайшоў традыцыйны фестываль «Гальшанскі замак», напярэдадні Свіслацкі кірмаш і іншыя фэсты. Асабіста мне вельмі па душы фестываль «Паўночныя Афіны сустракаюць сяброў» на маёй роднай Смаргоншчыне, у аграгарадку Залессе, дзе адноўлена сядзіба Агінскіх.

У Гродне сёлета плануем правесці фестываль класічнай музыкі «Тызенгаўз», а таксама мяркуем наладзіць шэраг цікавых імпрэз на вуліцы Савецкай у гістарычным цэнтры горада. Неўзабаве там пройдзе свята рушніка з паказам розных яго відаў і майстар-класамі па вырабе. Паклапоцімся і аб шырокім асартыменце сувенірнай прадукцыі для турыстаў, якой шмат, асабліва ў летні перыяд, прыязджае ў Гродна. З чэрвеня да майстроў з «Гарадзенскага каларыту» далучацца народныя ўмельцы з раённых цэнтраў рамёстваў, якія выпрацоўваюць тую ці іншую прадукцыю.

***— Вашы пажаданні ўдзельнікам і гасцям фестывалю нацыянальных культур...***

— Мне хочацца, каб яны набылі ў Гродне новыя станоўчыя эмоцыі, а самае галоўнае, каб пасля фестывалю ў іх узнікла жаданне сюды вярнуцца. І не толькі самі прыехалі зноў, але і параілі зрабіць гэта сваім сябрам, знаёмым.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*



# З АКТЫЎНАЙ ПАЗІЦЫЯЙ

**Актывісты аб'яднання «Белая Русь» абмеркавалі ў сталіцы пытанні дзяржаўнага і грамадскага жыцця краіны напярэдадні V Усебеларускага народнага сходу. Таксама з мэтай удзелу ў абмеркаванні ў Мінск прыбыла дэлегацыя Мазырскага актыву раённай арганізацыі «Белая Русь».**

Як адзначыў **начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мазырскага раённага выканаўчага камітэта і старшыня Мазырскай раённай арганізацыі «Белая Русь» Пётр ШУЦЬКО,** незалежна ад прафесійнай дзейнасці, у кожнага дэлегата V Усебеларускага народнага сходу з Мазырскага раёна ўжо ёсць свае канструктыўныя прапановы, накіраваныя на паляпшэнне якасці жыцця беларускага грамадства. Адно з іх датычыцца аптымізацыі і рэструктурызацыі будаўнічай галіны рэгіёна.

«Будаўнікі, дэлегаваныя на Усебеларускі народны сход, бачаць існуючыя недахопы, але ў іх ужо ёсць прапановы па іх ліквідацыі і нават шляхі выхаду на новыя рынкі. Бо ў Мазырскім раёне ёсць будаўнічыя арганізацыі, якія працуюць не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Яны будуюць якаснае і таннае жыллё, кошт за квадратны метр якога самы нізкі ў Беларусі. За кошт рэструктурызацыі і аптымізацыі галіны можна знаходзіць аб'ёмы працы і рабіць яе на належным узроўні», — цытуе БЕЛТА Пятра Шуцько.

У канцы пасяджэння **кіраўнік рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Аляксандр РАДЗЬКОЎ** прыняў у шэрагі арганізацыі новых удзельнікаў і ўручыў ім членскія білеты. Далей госці сталіцы пазнаёміліся з работай Мінскай гарадской арганізацыі, пярвічных арганізацый Нацыянальнай бібліятэкі і гісторыка-культурнага комплексу «Лінія Сталіна». Як адзначыў старшыня «Белай Русі», правядзенне такіх семінараў-сустрэч стала ўжо традыцыйным і дае значны імпульс далейшаму развіццю аб'яднання.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

■ Шпацыр па Камароўцы

# НАСТАЎ ЧАС АМАТАРАЎ САЛОДЗЕНЬКАГА

## НА РЫНКУ ПАЧАЎСЯ ЯГАДНЫ СЕЗОН

**Аматары клубніц ды чарэшняў ужо з усіх сіл шукаюць на прылаўках гэтыя салодкія ягады па выгадных цэнах. Што маем у асартыменце? Вялізныя сакавітыя ўзбекскія чарэшні (ягадкі — адна ў адну) добра аблегчаць ваш кашалёк: кілаграм абыходзіцца ў 90-100 тысяч рублёў. У параўнанні з імі малдаўскія чарэшні выглядаюць блякла і нават крыху губляюцца сярод латкоў: яны і драбнейшыя, і не заўжды спелыя, сустракаюцца нават пабітыя ягады. Затое гэты варыянт бюджэтны — 50 тысяч рублёў за кілаграм (лічыце, за такія ж грошы вам прапануюць журавіны з браслаўскіх мясцін).**

### ЛІЧЫЛЬНІК «ЗВЯЗДЫ»

**(цэны за кілаграм, калі не пазначана іншае)**

**Сала салёнае — 90-120 тыс.**
**Свініна (філе) — 120 тыс.**
**Ялавічына (філе) — 60-95 тыс.**
**Цяляціна (філе) — 85-120 тыс.**
**Індычына (філе) — 130 тыс.**
**Кураня бройлернае — 32 тыс.**
**Фарш (свініна) — 45 тыс.**
**Шашлык (свініна) — 75-99 тыс.**
**Сардэлькі (цяляціна) — 75-80 тыс.**
**Паляндвіца свойская — 220 тыс.**
**Яйка курынае Д-В — 16 тыс. (дзясятак)**
**Алей сланечнікавы — 22-25 тыс. (бутэлька)**
**Грэчка — 21-23 тыс. (800 г)**
**Рыс «Басмаці» — 25 тыс. (800 г)**
**Сачавіца — 31 тыс. (800 г.)**
**Гарох — 12 тыс. (800 г.)**
**Разынкі без костачак — 70 тыс.**
**Грэцкія арэхі ў шалупінах — 50 тыс.**
**Фінікі карамельныя — 45 тыс.**
**Сыр «Расійскі» — 85 тыс.**
**Сыр «Галандскі» — 90 тыс.**



Клубніцы на прылаўках у асноўным таксама прывезеныя з іншых краін. За кілаграм украінскіх просяць 50-55 тысяч рублёў, грэчаскія ягады каштуюць на 10 тысяч рублёў даражэй. На мой погляд, асаблівай розніцы паміж імі няма. Нектарыны, персікі і абрыкосы не саступаюць ягадам па папулярнасці — іх таксама даволі шмат на прылаўках, і пакупнікі бяруць іх з вялікай ахвотай. Малдаўскія абрыкосы ідуць па 35-45 тысяч за кілаграм, нектарыны і персікі ўтрымліваюць аднолькавую планку: ад 45 да 65 тысяч за кілаграм. Сунічнае ківі аддаюць па 35 тысяч за кілаграм. Будзьце пільнымі, выбіраючы апельсіны: хоць часцей сустракаюцца цэннікі з лічбай 40, ёсць нічым не горшыя варыянты па 23 тысячы рублёў за кілаграм. Бананы таксама варта пашукаць вельмі ўважліва: сярэдні цэннік складае 25-27 тысяч рублёў, але можна знайсці і па 20-21 тысячы.

Да сезона кавуноў яшчэ далекавата, аднак першыя паласацікі ўжо чакаюць ахвочых паласавацца імі. Каштуе гэтае смакоцце нямала — 35 тысяч рублёў за кілаграм. Дыні выходзяць таннейшымі — па 25 тысяч за кілаграм. Варта прыглядзецца да груш: кіло сакавітых «бэр» мядовых стане вашым за 30 тысяч рублёў, прыгожых аргенцінскіх «абатаў» — за 45 тысяч рублёў.

Пераходзім да прылаўкаў з гароднінай: дзе-нідзе ёсць чэргі па памідоры ды агуркі. Апошнія з Пінска разыходзяцца на «ўра» — гэта нядзіўна, бо аддаюць іх па 13-15 тысяч рублёў за кілаграм (у мінулым месяцы за кіло «куражу» даводзілася выкласці ажно 32 тысячы рублёў). Ранняя бульба ідзе ў сярэднім па 14 тысяч рублёў за кілаграм, а ранняя капуста — па 11-12 тысяч рублёў за кілаграм. Прылаўкі поўняцца зяленівам: так, вялікі пучок зялёнай цыбулі абыдзецца ў 2,5-4 тысячы рублёў, «букеты» пятрушкі ды кропу — у 8 тысяч рублёў.

Беларускія таматы даражэйшыя за прывезеныя іспанскія: першыя аддаюць за 29 тысяч рублёў, другія — за 19 тысяч рублёў. Сярэдняя цана айчынных памідораў складае 26 тысяч рублёў. Я выбрала гладкія чырвоныя плады сярэдняга памеру, хоць спакушалася ўзяць драбнейшыя таматы гатунку «малышок» па 18 тысяч рублёў за кілаграм. Даволі ўдалымі выглядаюць украінскія «мясістыя» памідоры — за кілаграм вялізных пладоў просяць 30 тысяч рублёў. Дарэчы, калі параўноўваюць кошты гэтага і папярэдняга шпацыру, заўважу, што ў мінулым месяцы іспанскія памідоры каштавалі якраз 30 тысяч рублёў, а беларускія выходзілі на 15 тысяч даражэй.

**Кацярына РАДЗЮК**

# УСЁ, ШТО ВЫ ХАЦЕЛІ ДАВЕДАЦЦА ПРА ПЕНСІІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Алена ДРОНАВА.



Аляксандра САМАДУМСКАЯ.

***— У мяне яшчэ адно пытанне: скажыце, калі ласка, а наколькі павінна павышацца пенсія пасля дасягнення 75 гадоў?***

— Што датычыцца ўзроставай даплаты пры дасягненні чалавекам 75 гадоў, то яе памер складае 75% мінімальнай пенсіі па ўзросце. Сёння памер мінімальнай пенсіі па ўзросце роўны 424 858 рублям, значыць, памер узроставай даплаты — 318 644 рублі.

* * *

***— Што зменіцца ў пенсіях за выслугу гадоў у настаўнікаў з 2017 года? Колькі трэба стажу, які ўзрост? (Пытанне прыйшло па электроннай пошце.)***

— Узрост для прызначэння пенсіі за выслугу гадоў будзе паступова павялічвацца, як і агульны пенсійны ўзрост — па 6 месяцаў за год, але не больш чым на 3 гады ў агульнай складанасці. Для набыцця права на гэтую пенсію патрабуецца спецыяльны стаж, працягласць якога застаецца ранейшым: для жанчын — не менш за 25 гадоў, для мужчын — не менш за 30 гадоў педагагічнага стажу.

* * *

***— Вас турбуе Лішак Валянціна Аляксандраўна, я жыву ў Мядзельскім раёне. Я адпрацавала 24 гады даяркай у саўгасе, потым гэта быў калгас, далей — ГАА. Летась мне споўнілася 50 гадоў, і я палічыла, што мне хопіць гэтага стажу, каб пайсці на льготную пенсію. Але аказалася, што ва ўстанове не захаваліся адпаведныя дакументы, якія б дазволілі мне зрабіць гэта. Я не магу пацвердзіць, што выконвала ўстаноўленую норму: абслугоўвала пэўную колькасць пагалоўя. За 1991 год наогул няма нават дакументаў, якія б пацвярджалі, што наша арганізацыя працавала...***

— Валянціна Аляксандраўна, органы сацыяльнай абароны прымаюць рашэнне толькі на падставе пададзеных дакументаў. У такой сітуацыі, без дакументальнага пацвярджэння ўсіх умоў, якія даюць права на датэрміновую пенсію, на жаль, пытанне аб яе прызначэнні не можа быць вырашана станоўча. Са свайго боку, магу сказаць, што працадаўца нясе адказнасць за захаванне дакументаў, неабходных для прызначэння пенсіі, а таксама за іх няпоўнае афармленне. І калі вы лічыце, што вам нанесены матэрыяльны ўрон, вы можаце звярнуцца да свайго працадаўцы па яго кампенсацыю ў добраахвотным парадку альбо ў суд.

* * *

***— Гэта Германовіч Таццяна Мікалаеўна, г. Заслаўе. Патлумачце, калі ласка, ці ўключаецца ў працоўны стаж перыяды водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў?***

— Таццяна Мікалаеўна, перыяд водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў уключаецца ў агульны працоўны стаж, але ён не ўваходзіць у страхавы стаж. Менавіта стаж працы з уплатай страхавых унёскаў фарміруе права на працоўную пенсію. У якім годзе вы нарадзіліся?

***— У 1972-м.***

— Значыць, згодна з сённяшнім заканадаўствам, вам неабходна будзе мець 20 гадоў страхавога стажу. Калі іх не будзе — не будзе і права на працоўную пенсію. Калі 20 гадоў страхавога стажу ёсць, то да яго будуць прыбаўлены і гады, калі вы знаходзіліся ў водпуску па доглядзе дзяцей. І ў сукупнасці гэта будзе складаць стаж працы, з улікам якога будзе вылічацца памер працоўнай пенсіі.

* * *

***— Ці можа настаўнік пачатковых класаў, які афармляў пенсію за выслугу гадоў, працаваць намеснікам дырэктара па выхаваўчай працы ва ўстанове адукацыі і атрымліваць гэтую пенсію? (Пытанне прыйшло па электроннай пошце.)***

— У адпаведнасці з артыкулам 83 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні» пенсіі за выслугу гадоў у перыяд работы, якая дае права на гэтую пенсію, не выплачваецца. Праца на пасадзе намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце пры выкананні ўстаноўленых заканадаўствам умоў уключаецца ў спецыяльны стаж працы, які дае права на пенсію за выслугу гадоў, таму ў перыяд такой працы выплата названай пенсіі не робіцца.

* * *

Наступныя два пытанні ад чытачоў, прысланыя нам па электроннай пошце, мы аб'ядналі, таму што адказ на іх спецыялісты Мінпрацы далі адзін і той жа.

**ПЫТАННЕ 1:** ***Мая мама нарадзілася 17.01.1962 года. З 1 жніўня 2015 года з ёй не працягнулі кантракт, і з гэтага ж часу яна знаходзіцца на ўліку ў органе па працаўладкаванні. Агульны працоўны стаж у яе 34 гады. Па накіраваннях у працаўладкаванні ёй адмаўляюць. Ці могуць яе адправіць на пенсію датэрмінова і што для гэтага патрэбна?***

**ПЫТАННЕ 2:** ***Падкажыце, калі ласка: у студзені 2017 года мне спаўняецца 55 гадоў. Згодна з новым заканадаўствам тэрмін дасягнення пенсійнага ўзросту ў мяне будзе ў ліпені 2017 года. Установа, у якой я працую, знаходзіцца ў стадыі рэарганізацыі. Мая пасада, хутчэй за ўсё, будзе скарочана. Калі мяне скароцяць, ці магчыма датэрміновае афармленне пенсіі?***

АДКАЗ: Такая магчымасць прадугледжана Законам Рэспублікі Беларусь «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь». Беспрацоўным, якія маюць права на дапамогу па беспрацоўі на працягу 52 каляндарных тыдняў (г.зн. жанчынам пры наяўнасці стажу працы не менш за 33 гады), па прапанове службы занятасці пры адсутнасці магчымасці для працаўладкавання можа быць прызначаная датэрміновая пенсія, але не больш чым за 1 год да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту.

* * *

***— Кушэнь Уладзімір Андрэевіч з Брагіна вас турбуе. Мне 59 гадоў. Я маю другую групу інваліднасці па агульным захворванні. Скажыце, калі ласка, праз колькі часу пасля ўстанаўлення дыягназу і пастановы МРЭК мне павінны прызначыць пенсію? Ці ёсць тут нейкі рэгламент?***

— Пенсія па інваліднасці прызначаецца з дня ўстанаўлення групы інваліднасці, калі зварот па яе адбыўся на працягу трох месяцаў пасля заканчэння агляду камісіяй. Інакш кажучы, вам трэба звярнуцца па пенсію не пазней чым праз тры месяцы пасля ўстанаўлення групы інваліднасці. Калі ж у вас маюцца нейкія пытанні па тэрмінах яе ўстанаўлення, то з імі неабходна звяртацца ў МРЭК альбо ў Міністэрства аховы здароўя.

* * *

***— Мяне завуць Грамкоўская Марыя Уладзіміраўна, я з Дзятлаўскага раёна. 2 студзеня гэтага года мне споўнілася 80 гадоў. Я прачытала ў газеце, што мне паложана дабаўка да пенсіі 400 тысяч рублёў. А мне далі 300 тысяч. Чаму так?***

— Марыя Уладзіміраўна, тлумачым вам: узроставая даплата ўстанаўліваецца з месяца, наступнага за месяцам дасягнення пэўнага ўзросту (75 або 80 гадоў). Да дасягнення 80-гадовага ўзросту вы атрымлівалі ўзроставую даплату да пенсіі як асоба, якая дасягнула 75 гадоў. Яе памер у лютым складаў 298 371 рубель. Калі вам споўнілася 80 гадоў, замест гэтай даплаты з лютага 2016 года вам сталі выплачваць даплату як асобе, якая дасягнула 80 гадоў. Памер гэтай даплаты ў лютым быў роўны 397 828 рублёў. Яшчэ раз звяртаю вашу ўвагу: яе вам цяпер выплачваюць замест ранейшай даплаты, а не дадаткова да яе. Так што вам даплацілі розніцу паміж гэтымі сумамі. Акрамя таго, раз вам споўнілася 80 гадоў, вам яшчэ з лютага стала выплачвацца і надбаўка па доглядзе. Яе памер сёння — 212 429 рублёў. Калі вы ў чымсьці сумняваецеся, можаце звярнуцца ва ўпраўленне сацыяльнай абароны, каб вам на падставе вашых пенсійных дакументаў усё грунтоўна растлумачылі.

* * *

***Высілко Марыя Паўлаўна з Мінска вас турбуе. Мяне хвалюе такі момант. Зараз ёсць пэўны ўзрост, і калі чалавек яго дасягае, працадаўца не мае права не падоўжыць з ім кантракт. А як будзе, калі трэба будзе выходзіць на пенсію пазней?***

— Так, ва Указе Прэзідэнта №180 прапісана, што з асобамі перадпенсійнага ўзросту працадаўца абавязаны падоўжыць кантракт як мінімум да дасягнення імі пенсійнага ўзросту. Гэта тачыцца жанчын, якім споўнілася 53 гады, і мужчын, якія дасягнулі 58-гадовага ўзросту. І калі мяняецца ўзрост выхаду на пенсію, то будзе адпаведна ссунуты і ўзрост, калі працадаўца абавязаны падоўжыць з работнікам кантракт.

* * *

***— Мая сястра 17 мая пайшла на пенсію ў 55 гадоў. Да гэтага яна даглядала маці і атрымлівала дапамогу па доглядзе. Маці 94 гады, яна ляжачая, мае патрэбу ў пастаяннай дапамозе. Ці будуць маёй сястры на пенсіі плаціць дапамогу па доглядзе? (Пытанне прыслана па электроннай пошце.)***

— Такая дапамога прадастаўляецца толькі тым грамадзянам, якія страцілі сродкі да існавання ў сувязі з неабходнасцю забеспячэння пастаяннага догляду асоб, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту, і інвалідаў першай групы. Асобы, якія самі атрымліваюць пенсію, права на дапамогу па доглядзе не маюць.

* * *

***Вам тэлефануе Кукрас Іван Яўгенавіч з Любанскага раёна. Я 26 гадоў прапрацаваў даярам. У ліпені мне будзе 55. І куды я ні звяртаюся, мне гавораць, што жанчынам ёсць магчымасць пайсці на льготную пенсію (г. зн. на 5 гадоў раней), а для мужчын такой льготы няма...***

— Іван Яўгенавіч, справа ў тым, што згодна з заканадаўствам, якое зараз дзейнічае, права на такі від пенсіі ў нас маюць толькі жанчыны.

***— Але ж я працаваў у тых жа ботах, з тым жа самым аміякам, тым больш што стажу ў мяне хапае...***

— Гэта ўсё зразумела, але права на гэты від пенсіі ў нас дадзена толькі жанчынам. Лічыцца, што толькі для жанчын гэтая праца з'яўляецца дастаткова цяжкай і шкоднай і аказвае неспрыяльны ўплыў на здароўе.

***— Я лічу, што калі гэты закон пісаўся, мужчын-даяраў проста не было.***

— Гэта не так, мужчыны-дояры былі і ў СССР, але права на льготную пенсію ім ніколі не прадастаўлялася, з улікам таго, што для мужчын такая праца з'яўляецца пасільнай. І цяпер таксама ў законе не прадугледжана адпаведнае палажэнне. Так што вам далі правільныя адказы на ваша пытанне.

* * *

***— Мужчыну, якому засталася 6 месяцаў да пенсіі, наймальнік звольніў за адзінкавае парушэнне працоўнай дысцыпліны. Дагэтуль чалавек спраўна працаваў, парушэнняў не было. Ці меў наймальнік права яго звольніць? І хто цяпер павінен збіраць дакументы на пенсію: сам чалавек, былы наймальнік або органы сацзабеспячэння? (Пытанне прыйшло па электроннай пошце.)***

— Прабачце, але пытанні працоўнага заканадаўства не адносяцца да заяўленай тэмы «прамой лініі». Па гэтым пытанні рэкамендуем звярнуцца на інфалінію Міністэрства працы і сацыяльнай абароны па тэл. 309 9 309, якая працуе штодня з 9-00 да 10-30.

Што тычыцца збору дакументаў, неабходных для прызначэння пенсіі, то непрацуючыя грамадзяне павінны збіраць іх самі. Пры неабходнасці органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аказваюць грамадзянам садзейнічанне ў атрыманні неабходных дакументаў.

* * *

***— Дубатоўка Галіна Феліксаўна тэлефануе, я жыву ў Мастоўскім раёне. Я са жніўня 1995-га па жнівень 2001 года працавала галоўным бухгалтарам сельскага Савета. Потым, з 2001 года, я была дзяржаўнай служачай. Хачу спытаць: гэтыя 5 гадоў, калі я працавала галоўным бухгалтарам, могуць быць залічаны ў стаж дзяржслужбы?***

— Каб адказаць на ваша пытанне, трэба вывучыць штатны расклад вашага сельсавета. Ваша пасада была ў апараце сельскага Савета?

***— Не, не была.***

— Тады гэты перыяд работы залічаным у стаж дзяржаўнай службы як праца на дзяржаўнай пасадзе ў дзяржаўным органе па артыкуле 43 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь» быць не можа.

Каб залічыць яго па артыкуле 44-м гэтага закона як папярэднюю працу на пасадзе кіраўніка альбо галоўнага спецыяліста дзяржаўнай арганізацыі, вы павінны пацвердзіць, што працавалі ў дзяржаўнай арганізацыі. Ці мела ваша арганізацыя ў той перыяд, калі вы працавалі галоўным бухгалтарам, статус юрыдычнай асобы?

***— Не, не мела.***

— У такім выпадку, на жаль, уключыць гэты перыяд у стаж дзяржаўнай службы нельга і па артыкуле 44.

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор аукционов:**
**государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.(0212) 42-61-62**

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка. |
| --- |
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221281201101000488, площадью 0,1476 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, аг. Вороны, ул. Солнечная, участок №2 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона реки, водоема (озеро Полонское), охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000В. **Начальная цена**: 27 181 390 бел. руб. **Размер задатка:** 2 718 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314020043 в ф-ле №200 Витебского облуправления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300972045, код платежа 4901, получатель платежа: Вороновский сельисполком. |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №221281205101000126, площадью 0,1389 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, д. Поляи, ул. Ленинская, 7Б для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Начальная цена**: 27 803 450 бел. руб. **Размер задатка:** 2 780 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314020043 в ф-ле №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300972045, код платежа 4901, получатель платежа: Вороновский сельисполком. |
| Лот №3. Земельный участок с кадастровым №221281202101000141, площадью 0,1484 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, д. Еремино, ул. Витебская, участок №1 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Начальная цена**: 12 624 670 бел. руб. **Размер задатка:** 1 262 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314020043 в ф-ле №200 Витебского облуправления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300972045, код платежа 4901, получатель платежа: Вороновский сельисполком. |
| Лот №4. Земельный участок с кадастровым №221288106601000060, площадью 0,1450 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Лятохи, ул. Луческая, 10Б для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона реки, водоема (река Лучеса), охранная зона электрических сетей напряжением до и свыше 1000В. **Начальная цена**: 22 516 200 бел. руб. **Размер задатка:** 2 251 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314110126 в ф-ле №200 Витебского облуправления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300962400, код платежа 04901, получатель платежа Октябрьский сельисполком. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 30.06.2016 в 15.00. по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 30.05.2016 с 8.30 по 29.06.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка. |
| --- |
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221288502601000075, площадью 0,1499 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Туловский с/с, д. Пуща, ул. 1-я Пущанская для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения на зем.участке отсутствуют. **Начальная цена:** 22 852 530 бел. руб. **Размер задатка:** 2 285 000 бел.руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314130148 ф-л №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300971263, код платежа 4901, получатель платежа: Туловский сельисполком. |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №221280610101000866, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, аг. Ольгово, ул. Лесная для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000В. **Начальная цена**: 78 102 300 бел. руб. **Размер задатка:** 7 811 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314010037 ф-л №200 Витебского облуправления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300594330, код платежа 4901. Получатель платежа: Бабиничский сельский исполком. |
| Лот №3. Земельный участок с кадастровым №221280610101000865, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, аг.Ольгово, ул. Полевая для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000В. **Начальная цена**: 71 002 100 бел. руб. **Размер задатка:** 7 100 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314010037 ф-л №200 Витебского облуправления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300594330, код платежа 4901. Получатель платежа: Бабиничский сельский исполком. |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 17.06.2016 в 15.00. по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 30.05.2016 с 8.30 по 16.06.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан). **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона; получить тех. документацию и разрешение на строительство жилого дома; приступить к занятию зем. участка в течение 1 года со дня утверждения проектной документации (в течение 1 года со дня проведения аукциона по зем. участку в д. Лятохи, ул. Луческая, 10Б); снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы из-под габаритов здания (из-под пятен застройки) и использовать для благоустройства прилегающей территории, осуществить строительство в сроки, определенные ПСД. Инженерные коммуникации и сооружения на зем.участках отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним, квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. **Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Леанід МАЛЬЦАЎ дэманструе перавагі аўтажыра.

**«Ноу-хау» датычацца і пунктаў пропуску, дзе будуць уведзены электронная чарга (у інтэрнэце можна будзе забраніраваць сабе час перасячэння мяжы, такая сістэма ўжо з 1 верасня запрацуе на пункце пропуску «Варшаўскі мост») і электронныя вароты, калі без удзелу пагранічнікаў самастойна сканyеш пашпарт, а таксама электронны пропуск на права наведвання памежнай паласы.**

# НАДЗЕЙНАЯ МЯЖА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Цяпер ва ўсім свеце ўвогуле, і асабліва ў Еўропе, пытанні пагранічнай бяспекі выходзяць на першае месца, — адзначыў **старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Леанід МАЛЬЦАЎ**. — Як паказаў час, дарэмна некаторыя дзяржавы не надавалі належнай увагі развіццю тых кірункаў, якія насамрэч з'яўляюцца стратэгічнымі. Гэта датычыцца абароны дзяржаўнай мяжы і эфектыўнай працы пагранічных службаў. У той жа Еўропе пад пагрозу пастаўлена нацыянальная бяспека. Наша сістэма развіваецца адаптавана да абстаноўкі, рэальных рызык і пагроз сучаснасці. Галоўнае — належным чынам абараняць нацыянальныя інтарэсы.

***— Леанід Сямёнавіч, наколькі сітуацыя з мігрантамі ў Еўропе ўскладніла ахову беларускай мяжы?***

— Ведаеце, сітуацыю ў Старым Свеце сама Еўропа шмат у чым і справакавала. Не без іх удзелу ўзніклі «гарачыя кропкі» на Блізкім Усходзе і ў Афрыцы. Я бачыў, што раней уяўляла сабой Лівія — квітнеючая краіна, дзе і сацыяльны пакет для мясцовых жыхароў быў належны. А цяпер адтуль людзі бягуць. І накіроўваюцца ў Еўропу, а не, напрыклад, у Саудаўскую Аравію ці ў Арабскія Эміраты. Задумваліся, чаму? А таму што ў Еўропе для мігрантаў створаны такія ўмовы, што можна не працаваць і бязбедна жыць. І ў пераважнай большасці ў Стары Свет перасяляюцца маладыя людзі. У нашай краіне ставяцца да мігрантаў з разуменнем (прыгадайце хаця б грамадзян Украіны, якія пераязджаюць у Беларусь), аднак трэба працаваць, а не паразітаваць. Сістэма выстраена такім чынам. Таму і такой хвалі ў прынцыпе не ўзнікае.


На сучасным квадрацыкле можна дабрацца ў самыя непраходныя месцы.

Таксама немалаважны фактар — мяжа насамрэч пад надзейнай аховай. Пра гэта вам кампэтэнтна заяўляю. Мы дакладна кантралюем усе кірункі — Літва, Латвія, Польшча, Украіна. Пра гэта ведаюць, таму і адносіны адпаведныя. Беларуская пагранічная служба — гэта сапраўды прафесіяналы, рэальная сіла, здольная супрацьстаяць пагрозам.

* * *

Украінская мяжа сёння, зразумела, адзін з найбольш неспакойных участкаў. Яе агульная працягласць складае больш як тысячу кіламетраў. Цяпер поўным ходам праводзіцца дэмаркацыя беларуска-ўкраінскай мяжы. За Пінскім пагранічным атрадам — ахова ўчастка працягласцю каля 300 кіламетраў, з якіх 23 км — па рэках і азёрах. Гэта тэрыторыя некалькіх раёнаў Брэстчыны, якія мяжуюць з раёнамі Валынскай і Ровенскай абласцей Украіны.

Адным з найбольш «кантрабандных» участкаў раней была тэрыторыя, дзе цяпер размяшчаецца пагранічная застава «Сварынь», куды і прыбылі ўдзельнікі прэс-тура. Гэта Драгічынскі раён, куток Беларусі, куды, прызнаемся, пры іншым раскладзе і не дабраліся б. Застава найсучаснейшая — па словах Леаніда Мальцава, такім чынам абуладкавана цяпер пятая частка адпаведных падраздзяленняў. Тут выкарыстоўваецца самая сучасная тэхніка і абсталяванне. У тым ліку беспілотнікі. Прычым прымяняюцца апараты двух відаў — самалётнага тыпу («Беркут-2») і квадракоптары («Шэршань»). З іх дапамогай удаецца дакладна адсочваць сітуацыю і бачыць карцінку ў рэжыме рэальнага часу. Пры неабходнасці — аператыўна дзейнічаць. Да таго ж прымяняюцца і аўтажыры. Гэтыя лятальныя апараты лёгкія (вага каля 250 кг), хуткія (разганяюцца да 170 км у гадзіну), надзейныя і мабільныя. Могуць сесці практычна ў любым месцы, а на запраўку заязджаюць, быццам аўтамабіль. Да таго ж эканомныя — час палёту падчас паветранай разведкі каштуе дзесяці паўсотні долараў (для параўнання: выдаткі для верталёта «МІ-8» складаюць адпаведна каля $2,5 тыс.).

Дзякуючы такой тэхніцы можна дакладна кантраляваць вялікія плошчы. Напрыклад, на заходнім кірунку дзяржаўнай мяжы на заставу прыпадаюць участкі працягласцю 12-15 кіламетраў, а ў той жа «Сварыні» — 40 км. Пры гэтым колькасць людзей на заставах аднолькавая. Зноў жа эканомія, аднак без урону эфектыўнасці. Таму карысная практыка будзе распаўсюджвацца. Дарэчы, у жніўні аўтажыры з'явяцца ў Мазырскім пагранічным атрадзе і Брэсцкай пагранічнай групе. У далейшым такой тэхнікай будзе аснашчаны прыбалтыйскі і польскі кірункі.

Падчас таго, як мы гасцявалі на заставе, спрацаваў сігналізацыйны комплекс. Цягам літаральна некалькіх хвілін у вызначаным месцы з'яўляюцца пагранічнікі. Трывога аказалася беспадстаўнай: магчыма, проста прамень лазара адрэагаваў на моцны вецер ці жывёла побач прабегла. Цікава, што шэраг застаў аснашчаны мабільнымі сігналізацыйнымі комплексамі. Невялікія датчыкі закопваюцца ў зямлю, маленькая незаўважная антэнка застаецца на паверхні і перадае сігнал на заставу. У найбліжэйшы час будзе прымяняцца такая тэхніка айчыннай вытворчасці. Пры тым беларускі сігналізацыйны комплекс «Павук» будзе адрозніваць парушальнікаў (жывёла, чалавек, іншыя прычыны), а таксама перадаваць фотаздымкі на заставу.


Прапаршчык Андрэй ПРЫБЫШ і радавы Аляксандр ГАРБУЗ адсочваюць сітуацыю на мяжы ў рэжыме рэальнага часу.

Увогуле абсталяванне і праграмнае забеспячэнне ў беларускіх пагранічных войсках пераважна айчыннай вытворчасці. І, дарэчы, паведаміў «Звяздзе» начальнік упраўлення інфармацыйных тэхналогій Дзяржпагранкамітэта Сяргей Пацаюк, яно надзвычай запатрабавана як у Еўропе, так і ў азіяцкіх краінах. Падраздзяленні Дзяржпагранкамітэта цяпер насамрэч высокатэхналагічныя. Адпаведна ўзрастаюць хуткасць рэагавання і эфектыўнасць. Найноўшыя тэхналогіі, якія дазволілі вывесці ў электронны фармат тую ж раней «папяровую» працу.


Малодшы сяржант Дзмітрый ОСІПАЎ і яго аўчарка Хардзі на кантрольна-следавой паласе.

«Ноу-хау» датычацца і пунктаў пропуску, дзе будуць уведзены электронная чарга (у інтэрнэце можна будзе забраніраваць сабе час перасячэння мяжы, такая сістэма ўжо з 1 верасня запрацуе на пункце пропуску «Варшаўскі мост») і электронныя вароты, калі без удзелу пагранічнікаў самастойна сканyеш пашпарт, а таксама электронны пропуск на права наведвання памежнай паласы.

— Не варта забываць пра транзітную прывабнасць Беларусі і эфектыўна выкарыстоўваць гэтую перавагу, — пераканааны Леанід Мальцаў. — Неабходна імкнуцца да таго, каб перасячэнне мяжы было максімальна камфортным. І ў той жа час нельга дапусціць парушэнняў, трэба своечасова іх выявіць. Гэта складаная задача, але вырашальная.

Асабліва ўлічваючы тое, што за справу бяруцца сапраўдныя прафесіяналы, якія надзейна нясуць сваю пастаянную варту па ахове дзяржаўнай мяжы Беларусі. Са святам, пагранічнікі!

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
*litvinov@zviazda.by*

*Мінск — пагранзастава «Сварынь» — Мінск.*

***Яшчэ больш фота — на партале zviazda.by***

■ Класныя навіны

# ЛЮБІМЫЯ ЎРОКІ — БЕЗ АДЗНАК І ХАТНІХ ЗАДАННЯЎ

**У наступным навучальным годзе пералік выпускных экзаменаў для адзінаццацікласнікаў (у першую чаргу, для выпускнікоў профільных класаў) можа змяніцца. Пра гэта расказала журналістам начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Святлана УКЛЕЙКА.**

Сёння ўсе выпускнікі на выхадзе з сярэдняй школы здаюць чатыры абавязковыя экзамены: па адной з дзяржаўных моў (беларускай ці рускай), матэматыцы, замежнай мове і гісторыі Беларусі. Такім чынам, матэматыку здаюць усе — і «фізікі», і «лірыкі»... Але з мінулага года распачаўся пераход да профільнага навучання на старшай ступені школы. І, напрыклад, будзе не зусім лагічным, калі выпускнікі не будуць здаваць экзамены па прадметах, якія два апошнія гады яны вывучалі на павышаным узроўні: тую ж біялогію, хімію ці фізіку...

— Але пакуль незразумела, што рабіць з колькасцю экзаменаў, улічваючы даволі сціслыя тэрміны выпускной экзаменацыйнай кампаніі, якой на пяткі наступае ЦТ, — канстатавала Святлана Уклейка. — Да таго паміж выпускнымі іспытамі абавязкова павінен быць прадугледжаны дзень для адпачынку, таму павялічыць іх колькасць немагчыма. Будзем думаць, але ў любым выпадку рашэнне будзе агучана да 1 верасня, каб выпускнікі 2017 года загадзя ведалі «правілы гульні».

## Мультыпрофіль з індывідуальным падыходам

Па словах Святланы Уклейкі, першы год працы ва ўмовах профільнага навучання паказаў, што рашэнне аб яго ўвядзенні было правільным. Цягам навучальнага года вывучаліся думкі і вучняў, і бацькоў, і педагогаў, і кіраўнікоў навучальных устаноў. Амаль 80% навучэнцаў і 70% бацькоў паведамілі, што яны задаволены ўмовамі арганізацыі профільнага навучання ва ўстанове адукацыі. Амаль 80 працэнтаў дзесяцікласнікаў лічаць, што яны правільна вызначыліся з профільнымі прадметамі. Станоўча была ацэненая і варыятыўнасць мадэляў рэалізацыі профільнага навучання. Усяго ўстановам адукацыі былі прапанаваны тры мадэлі.

**Будзе не зусім лагічным, калі выпускнікі не будуць здаваць экзамены па прадметах, якія два апошнія гады яны вывучалі на павышаным узроўні: тую ж біялогію, хімію ці фізіку...**

Першая мадэль — аб'яднанне ў адным класе навучэнцаў, якія вывучаюць на павышаным узроўні аднолькавыя вучэбныя прадметы. Яе выбралі 30 працэнтаў устаноў адукацыі. Яшчэ 30 працэнтаў спыніліся на другой мадэлі — аб'яднанні ў адным класе навучэнцаў, якія вывучаюць на павышаным узроўні розныя вучэбныя прадметы. Фактычна размова ідзе пра мультыпрофільнае навучанне, пры якім вучні вывучаюць розныя прадметы ў асобных групах: з адными аднагодкамі яны могуць вывучаць, напрыклад, матэматыку і англійскую мову ці матэматыку і хімію, з другімі — на базавым узроўні фізіку, а з трэцімі — на базавым узроўні гісторыю, біялогію і г.д. Пры гэтым кожны вучань мае індывідуальны расклад заняткаў. Адна з галоўных перавагмультыпрофільнага навучання заключаецца ў тым, што яно можа ўкараняцца як у буйных установах адукацыі, так і ў невялікіх, дзе няма некалькіх класаў у паралелі.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## Каго возьмуць у профільны клас?

А ўвогуле ў выпускніка базавай школы сёння ёсць некалькі варыянтаў далейшага жыццёвага самавызначэння ў залежнасці ад жаданняў і здольнасцяў да вучобы. Тыя з падлеткаў, хто захоча застацца ў школе, могуць выбраць або профільны, або агульнаадукацыйны клас.

Залічэнне вучняў у 10-я профільныя класы будзе праводзіцца на конкурснай аснове на падставе адзнак у пасведчанні аб агульнай базавай адукацыі. Пры гэтым па профільных прадметах адзнакі павінны быць не ніжэйшыя за 7 балаў, а сярэдні бал пасведчання — не ніжэйшы за 6 балаў. Пайсці вучыцца ў 10-ты профільны клас можна ў любую ўстанову адукацыі пры наяўнасці там свабодных месцаў.

Пераможцы трэцяга і заключнага этапаў рэспубліканскай алімпіяды па профільных вучэбных прадметах будуць залічвацца без уліку сярэдняга бала пасведчання аб агульнай базавай адукацыі і адзнак па профільных прадметах. Што тычыцца ліцэяў, то ў гэтых агульнаадукацыйных установах прыём у 10-я класы будзе праводзіцца таксама па конкурсе, але на аснове ўступных выпрабаванняў. Экзамены ў ліцэі пройдуць з 15 па 20 чэрвеня.

Колькасць выпускнікоў і 9-х класаў, і 11-х класаў у параўнанні з мінулым навучальным годам нязначна ўзрасла і складзе 90,7 тысячы (плюс тысяча чалавек). Але далей, па прагнозах, да 2019 года ўключна будзе адбывацца зніжэнне колькасці вучняў базавай школы. Павелічэнне колькасці выпускнікоў 9-га класа чакаецца толькі з 2020 года. Што тычыцца выпускнікоў 11-х класаў, то іх колькасць сёлета складзе 57,4 тысячы чалавек.

## Міжпрадметныя сувязі — гэта важна

Святлана Уклейка нагадала пра тое, што з 2015/2016 навучальнага года распачаўся пераход на адносную завершанасць адукацыі на II ступені школы.

Зараз праходзіць паэтапны пераход на абноўленыя навучальныя праграмы па прадметах «Руская мова», «Беларуская мова», «Руская літаратура» і «Беларуская літаратура». Яны прадугледжваюць паступовае ўвядзенне аднолькавай колькасці гадзін на гэтыя дысцыпліны ва ўсіх школах, гімназіях і ліцэях. У сувязі з гэтым з новага навучальнага года будзе ўстаноўлена роўная колькасць гадзін на вывучэнне гэтых прадметаў у другіх класах. Да таго ж цяпер праграмы па абедзвюх дзяржаўных мовах строяцца сінхронна, бо раней, напрыклад, словаўтварэнне вывучалі на ўроках рускай мовы ў пачатку шостага класа, а на ўроках беларускай мовы — напрыканцы пятага.

**Амаль 80% навучэнцаў і 70% бацькоў паведамілі, што яны задаволены ўмовамі арганізацыі профільнага навучання ва ўстанове адукацыі. Амаль 80 працэнтаў дзесяцікласнікаў лічаць, што яны правільна вызначыліся з профільнымі прадметамі.**

Увогуле ўсе вучэбныя праграмы пераглядаліся і аналізаваліся на прадмет захавання міжпрадметных сувязяў і іх практыкаарыентаванасці. Скажам, вучэбныя праграмы па фізіцы аналізаваліся спецыялістамі па матэматыцы і хіміі, па хіміі — адпаведна матэматыкамі і фізікамі і гэтак далей.

Вывучэнне фізікі будзе цяпер распачынацца на год пазней — з 7-га класа. Але агульная колькасць вучэбных гадзін, адведзеных на вывучэнне фізікі на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі, застаецца нязменнай, паколькі **ў 9-м класе будзе ўжо не два (як цяпер), а тры ўрокі фізікі на тыдзень.**

Таксама з новага навучальнага года распачнецца паэтапнае ўвядзенне прадмета «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» (АБЖ). У курс увойдуць такія тэмы, як бяспека харчавання, знаходжанне ў месцах адпачынку і масавага збору людзей, рызыкі паводзін і іншыя. У дзяцей будуць выхоўваць навыкі абароны і самаабароны, дапамогі і ўзаемадапамогі ў сітуацыях, небяспечных для іх фізічнага, псіхалагічнага здароўя і жыцця. АБЖ уводзіцца ў другіх і пятых класах у аб'ёме адной навучальнай гадзіны на тыдзень з унясеннем у расклад вучэбных заняткаў. Адзнакі ў балах па АБЖ выстаўляцца не будуць, а хатнія заданні не прадугледжаны.

У 3-х, 4-х, 6—9-х класах абавязковае вывучэнне АБЖ працягнецца на факультатыўных занятках. Пераход з факультатыўных заняткаў на навучальны прадмет будзе ажыццяўляцца паступова цягам трох гадоў. Такім чынам, змена статусу АБЖ не павялічыць нагрузку на вучняў.

Вывучаць прадмет «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)», які летась вярнуўся ў школу, вучні будуць таксама без адзнак і хатніх заданняў. Як адзначыла Святлана Уклейка, на працягу года праводзілася шмат сустрэч і семінараў, спецыялісты Акадэміі паслядыпломнай адукацыі і Нацыянальнага інстытута адукацыі выязджалі ў рэгіёны, дзе гутарылі з настаўнікамі. «Было прынята рашэнне аб унясенні некаторых змен у праграму, што і было зроблена. Мы вырашылі, што гэта не той прадмет, дзе патрабуюцца адзнакі», — падкрэсліла Святлана Уклейка.

Апошняе новаўвядзенне 2016/2017 навучальнага года — абноўленая праграма па прадмеце «Працоўнае навучанне». Цяпер у 6-м класе прадугледжаны 2 гадзіны на тыдзень на вывучэнне гэтага прадмета. Агульная колькасць гадзін не зменіцца, паколькі будзе зменшана колькасць гадзін у 8-м класе (з дзвюх да адной гадзіны). У змест вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне. Тэхнічная праца» ўведзены новы раздзел «Рамонтныя работы ў побыце».

## Мы на фоне іншых

«Што тычыцца працы над новымі падручнікамі, то гэта працэс пастаянны. Стварыць і выпусціць новыя падручнікі па ўсіх прадметах і для ўсіх класаў адначасова немагчыма», — патлумачыла Святлана Уклейка.

Будучыня, безумоўна, за электроннымі сродкамі навучання. Ужо створаны падручнік-навігатар па арганічнай хіміі для 10-га класа. Ён выкладзены ў адкрытым доступе на партале adu.by. Пасля таго як гэта было зроблена, у некаторых установах адукацыі і настаўнікі, і вучні зусім адмовіліся ад папяровай версіі падручніка. Да 1 верасня будзе гатовы і падручнік-навігатар па фізіцы для трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

У наступным навучальным годзе плануецца распрацаваць таксама падручнік-навігатар па хіміі для 11-га класа і падручнік па прадмеце «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» для 5-га класа.

**У змест вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне. Тэхнічная праца» ўведзены новы раздзел «Рамонтныя работы ў побыце».**

У 2018 годзе Беларусь упершыню возьме ўдзел у міжнародным даследаванні PISA, якое дасць нам магчымасць убачыць сябе на фоне дасягненняў сістэм адукацыі іншых краін. Адукацыйныя тэсты, якія прапануюцца PISA, правяраюць не столькі акадэмічныя дасягненні навучэнцаў (механічнае завучванне фактаў, законаў, формул, гістарычных падзей і г.д.), колькі іх уменне працаваць з інфармацыяй, прымяняючы свае веды з самых розных галін на практыцы, і рэальныя жыццёвыя кампетэнцыі. Іншымі словамі, гатоўнасць да жыцця паза школай. Святлана Уклейка расказала, што заданні з кампетэнтнасным падыходам ужо прапануюцца вучням падчас правядзення рэспубліканскага маніторынгу якасці адукацыі, каб падрыхтаваць школьнікаў да будучых выпрабаванняў. Кампетэнтнасны падыход укараняецца і ў вучэбныя планы. У бягучым навучальным годзе на новы змест адукацыі перайшлі першыя і пятыя класы. У наступным годзе гэта будуць другія і шостыя класы і гэтак далей...

Дарэчы, падчас апошняга маніторынгу правяраліся ў тым ліку фінансавая асвечанасць і разуменне пісьмовых тэкстаў беларускіх школьнікаў. Яго вынікі абяцаюць агучыць у сярэдзіне лета.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Солигорский райагросервис» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:**

- **здание АБК** (инв. № 644/С-896) общ. пл. **636,7 кв.м;**
- **цех сборки с/х машин** (инв. № 644/ С-37989) общ. пл. **798 кв.м;**
- **здание проходной** (инв. № 644/ С-52678) общ. пл. **33,2 кв.м;**
- **здание весовой** (инв. № 644/С -52677) общ. пл. **41,8 кв.м;**
- **трансформаторная станция с воздушной и кабельной линиями** (инв. № 644/С-52750);
- **канализационная станция и канализационные сети** (инв. № 644/С-52754);
- **противопожарная насосная станция с пожарным резервуаром для воды** (инв. № 644/С-52752);
- **площадка для хранения с/х машин** (инв. № 644/С-52753);
- **производственная площадка** (инв. № 644/С-52757);
- **дороги** (инв. № 644/С-52758);
- **водопровод** (инв. № 644/С-52775);
- **забор железобетонный** (инв. № 644/С-52774);
- **оборудование:** котел отопительный, бойлер, кран балка (3).

**Имущество расположено на зем. участке площадью 3,5418 га по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, 43, Любанское шоссе.**

Недвижимое имущество обременено договорами аренды (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона).

Начальная цена с НДС (20%) – **11 428 585 200 (1 142 858 р. 52 коп.)** бел. руб. **Задаток 5% от начальной цены (542 857 800 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 09.10.2015 г. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **20.06.2016** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.06.2016** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

# ЗАНЯТАК ДЛЯ ШКАЛЯРА

### У Магілёве дзецям падчас канікулаў прапануюць не толькі адпачыць, але і падзарабіць

**Магіляўчанка Наталля Бажанава на гарадскі бацькоўскі сход у магілёўскую гімназію №1 трапіла выпадкова. Наведаць яго параіла класная кіраўніца яе дачкі з гімназіі №3. Маўляў, там падрабязна раскажуць, чым і як заняць у вольны час дзяцей, куды адправіць адпачыць і нават, дзе ёсць магчымасць падзарабіць. І Наталля пайшла. Напярэдадні канікулы, трэба думаць, куды прыладзіць дзяцей. У жанчыны іх, дарэчы, трое і ўсе — школьнікі. Яна нават не чакала, што атрымае столькі карыснай інфармацыі. Прычым з першых жа вуснаў. Бо на сходзе прысутнічалі не толькі эксперты па лініі адукацыі, але і прадстаўнікі службы занятасці, санстанцыі, наркадыспансера, МНС, ДАІ.**



Тактыльную кнігу дзеці рабілі ў падарунак.

## Сумаваць не давядзецца

Юных магіляўчан чакаюць 6 загарадных лагераў — «Зара» ад Магілёўхлебпрама, «Любуж» ад Магілёўскай міжрайбазы, «Сосны» ад Магілёўхімвалакна, «Чайка» ад Лаўсанбуда, «Дубравенка» ад Магілёўскага аддзялення Беларускай чыгункі, «Ластаўка» ад Магілёўскага мясакамбіната. Кошт пуцёўкі ад 3,5 мільёна, бо гэта месцы адпачынку з кругласутачным знаходжаннем. Ёсць лагеры больш танныя — дзённага знаходжання. Там бацькоўская даплата складае для дзяцей ад 6 да 10 гадоў — 130 тысяч рублёў, ад 11 да 13 — 223 тысячы, ад 14 да 17 гадоў — каля 296 тысяч рублёў. Але гэта далёка не ўсё, што горад можа прапанаваць сваім юным жыхарам. Шмат цікавага на лета запланавалі ўстановы спорту, турызму і адукацыі. Каб бацькам лягчэй было арыентавацца ў моры інфармацыі, іх запрасілі падзяліцца на невялікія групы і прайсціся па сямі аўдыторыях, дзе спецыялісты кожны па сваёй тэме праінструктавалі наконт супрацьпажарнай і дарожнай бяспекі, наркотыкаў і дэпрэсіўных станаў, спорту і турызму, культурных мерапрыемстваў і працоўнай занятасці. Пасля гэтых прэзентацый бацькі нават у чэргі выстройваліся па буклеты і візіткі з карыснымі тэлефонамі і адрасамі. Яшчэ на працягу тыдня ў горадзе будуць праходзіць агульнагарадскія бацькоўскія сходы, дзе ў ролі кансультантаў выступяць у тым ліку і яны. Выбар для адпачынку і занятасці непаўналетніх ёсць, але, як звяртаюць увагу арганізатары мерапрыемства, гэта не значыць, што бацькі павінны самаўхіліцца. Галоўную адказнасць за бяспеку, паводзіны і жыццё сваіх сыноў і дачок нясуць у першую чаргу яны. І павінны заставацца для іх добрым прыкладам.

## Працоўная кніжка для непаўналетняга

Больш за ўсё было пытанняў да спецыялістаў па працаўладкаванні. Яно і зразумела: дзецям заўсёды цікава зарабіць свае першыя грошы, а бацькам убачыць, што іх сын або дачка атрымліваюць азы самастойнага працоўнага вопыту. Да таго ж існуе дзяржаўная праграма, якая прадугледжвае фінансаванне часовай занятасці моладзі з пазабюджэтнага фонду Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

— На гэты год у нас выдзелена 1 мільярд 390 мільёнаў рублёў, каб мы працаўладкавалі 700 чалавек, — паведаміла **намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага гарвыканкама Марыя ШАПНЕЎСКАЯ.** — Але колькасць прапаноў можа быць і большай. Працаўладкаванне моладзі ідзе па двух кірунках — за кошт фінансавання, якое выдзелена дзяржавай, і за кошт заявак арганізацый, якія звяртаюцца да нас непасрэдна і прапаноўваюць розныя вакансіі.

У спісе 41 арганізацыя, дзе будуць рады падлеткам. Сюды ўваходзяць і ўстановы адукацыі, і тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання, і ўстановы адукацыі з дадатковай адказнасцю, Дом дзіцяці... Зарабляць грошы дазваляецца ўжо з 14 гадоў, але павінна быць на гэта згода не толькі дзіцяці, але і бацькоў. Калі яны не супраць, трэба паклапаціцца пра медыцынскую даведку, зрабіць пашпарт і ўзяць даведку з установы адукацыі, каб было бачна, што суіскальнік пакуль што навучэнец. Да ведама, па заканадаўстве падлеткі з 14 да 16 гадоў працуюць не болей за 4 гадзіны 36 хвілін, з 16 да 18 гадоў — 7 гадзін.

Атрымаць свой першы працоўны вопыт можна ў лагерах працы і адпачынку. Такой магчымасцю змогуць скарыстацца 310 дзяцей ва ўзросце ад 14 да 17 гадоў. Бацькоўская даплата ў гэтым выпадку складзе 215 800 рублёў. З дапамогай гэтых маладых людзей будуць прыведзены ў парадак класы, добраўпарадкавана тэрыторыя. «Справа добрая. Тое, што падлетак зробіць сваімі рукамі, ён ужо не будзе ламаць. І іншаму параіць не рабіць гэтага», — лічыць **намеснік старшыні Магілёўскага гарвыканкама Ала ГАЛУШКА.**

Цяжэй знайсці працу 14-гадовым. У асноўным іх рукі запатрабаваны па месцы вучобы або ў цэнтрах творчасці. Як адзін з варыянтаў — стварэнне ручных вырабаў у розных тэхніках: мазаіка, маляванне акрылавымі фарбамі, шклярус, карціны са скуры. Карысць двайная: авалодваеш рамяством ды яшчэ і грошы за гэта атрымліваеш. Невялікія, але ж зробленыя. Іншая справа, што вышываць, або маляваць — гэта, хутчэй, дзявочы занятак. Хлопчыкі менш уседлівыя. Ім больш пасуюць мужчынскія работы. Напрыклад, стэнд для школы зрабіць, або мэблю падрамантаваць. Тыя, каму споўнілася 16 гадоў, змогуць выпрабаваць сябе на сельгасработах па зборы парэчкі ці вішні. Па гэтай частцы трэба звяртацца непасрэдна ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

Заробкі, натуральна, розныя. Пры разліку ўлічваецца ўсё — як падлетак працаваў, колькі часу, дзён. І абавязкова заводзіцца працоўная кніжка. «Летась сярэдні заробак за 2 тыдні складаў 700 тысяч рублёў, — кажа Марыя Уладзіміраўна. — Больш за ўсё можна зарабіць на ягадах. У сярэднім маладыя людзі зараблялі 120 тысяч рублёў за дзень, а некаторыя аб'ядноўваліся ў брыгады, рабілі больш і атрымлівалі па 300 тысяч».

Падказаць варыянты з працай могуць таксама ў цэнтрах творчасці дзяцей і моладзі. Па лініі БРСМ магчымасць зарабіць даюць часцей за ўсё студэнцкія атрады. Фарміруюцца яны на базе прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, каледжаў і вышэйшых навучальных устаноў менавіта з навучэнцаў ці студэнтаў. Атрады дзеляцца на сэрвісныя, педагагічныя, будаўнічыя і гэтак далей, якія працуюць як у горадзе, так і па-за яго межамі. Напрыклад, магілёўскія студэнты ўжо трэці год прымаюць удзел у будаўніцтве Беларускай АЭС. «Каб трапіць на АЭС, трэба быць членам нашай арганізацыі, мець добрыя рэкамендацыі з ВНУ, бо гэта вельмі адказная і ганаровая праца. Ад Магілёва на будоўлю едзе ўсяго 40 чалавек. Усе яны пройдуць спецыялізаваную падрыхтоўку па тэхніцы бяспекі і ахове працы. Там, вядома, не лёгка, але ж і заробак годны. Летась за 2 месяцы маладыя людзі па 15 мільёнаў зарабілі», — расказала **першы сакратар Магілёўскага гаркама БРСМ Анастасія МАЦЮЛІНА.**

А вось для школьнікаў БРСМ можа прапанаваць хіба што разавую работу. Напрыклад, у горад прыязджае цырк і ёсць патрэба ў дапамозе па распаўсюджванні флаераў, улётак і гэтак далей. Часам па такую ж дапамогу звяртаюцца індывідуальныя прадпрымальнікі або нейкія арганізацыі. Прэтэндэнты выбіраюцца з ліку тых, хто пакінуў свае каардынаты. Таму, калі жадаеце падзарабіць, трэба паклапаціцца загадзя.

## Душэўная дапамога

Дзеці ёсць дзеці, з боку, магчыма, яны і здаюцца самаўпэўненымі, але ім усё яшчэ не хапае ўвагі, любові, спачування, яны лягчэй паддаюцца чужому ўздзеянню. Але небяспечныя думкі рэдка прыходзяць у галаву тых, у каго час распісаны па хвілінах. Гурткі, акцыі, хатнія абавязкі, другасная занятасць — усё гэта добра адцягвае ўвагу ад негатыўных праяў. Вунь заняткі ў творчых калектывах гімназіі №1 адкрылі дарогу на зорны алімп некаторым яе навучэнцам. Сярод іх Насця Дмітрачкова — удзельніца праекта «Голас».

Зразумела, усе дзеці розныя і адзінага рэцэпту, як пазбегнуць складанасцяў, няма. Таму не лішнім будзе мець на ўвазе і ў кішэні тэлефоны тых, хто можа падказаць выйсце з цяжкага становішча — школьных псіхолагаў, спецыялістаў медыцынскіх устаноў, наркадыспансера. Пры цэнтрах творчасці дзяцей і моладзі «Агат», «Крынічка», «Эверэст» працуюць псіхалагічна-педагагічныя службы, якія дапамагаюць разабрацца ў заблытаных справах.

Протаіерэй Андрэй Купцоў параіў знайсці час прыйсці разам з дзецьмі ў храм. «Не трэба дзецям казаць пра Бога. Скажыце больш пра сваіх дзяцей Богу», — прапанаваў ён. У храмах ёсць магчымасць пагутарыць са святаром, паўдзельнічаць у паломніцтвах, запісацца ў гурток, уступіць у праваслаўны ваенна-патрыятычны клуб «Перасвет». У настаяцеля храма Святых Царскіх Пакутнікаў протаіерэя Сяргея Белавуса, які ў Магілёўскай епархіі адказны за працу з моладдзю, можна даведацца, як трапіць у праваслаўны лагер ці, дзе папрацаваць валанцёрам. Гэта, праўда, не аплачваецца, бо робіцца ў Славу Божую. Калі ты дапамагаеш іншым, ты ўжо не адзінокі. Гімназія №1, дзе адбыўся сход, даўно сябруе са шклоўскай школай-інтэрнатам для дзяцей з парушэннямі зроку. Чацвёртакласнікі Іван і Мілана прадэманстравалі вялікую тактыльную кнігу, якую тутэйшыя навучэнцы зрабілі для сваіх сяброў. Калі знаходзіш час на такія справы, асабістыя перажыванні адыходзяць на другі план. Нездарма кажуць: калі табе дрэнна, успомні пра тых, каму яшчэ горш.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

## У тэму

### Студэнты і навучэнцы

У складзе студэнцкіх атрадаў Магілёўскай вобласці будзе часова працаўладкавана каля 10 тысяч чалавек. Гарадской маладзёжнай будоўляй аб'яўлены мост цераз раку Днепр у Магілёве, абласной — добраўпарадкаванне гістарычнай часткі Мсціслава ў межах вуліц Першамайскай і Урыцкага. Па міжнароднай пуцёўцы ў Анапу паедуць 2 студэнцкія атрады (сэрвісны і педагагічны) агульнай колькасцю 20 чалавек — Магілёўскі абласны камітэт БРСМ заключыў дагавор з філіялам лячэбна-аздараўленчага комплексу «Зорачка-Поўдзень». Першыя дзесяць чалавек ужо адправіліся на Чорнае мора.

### Школьнікі

Па дагаворах з упраўленнямі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гаррайвыканкамаў будуць працаваць 3,5 тысячы падлеткаў Магілёўшчыны; у складзе працоўных атрадаў — 7 тысяч старшакласнікаў, у вучнёўскіх вытворчых і сельскагаспадарчых брыгадах — каля 15 тысяч; індывідуальнай працоўнай дзейнасцю будзе займацца 3 тысячы чалавек; валанцёрскай працай — звыш 6 тысяч.

### Лагеры

Круглаcутачнае аздараўленне дзяцей і падлеткаў Магілёўскай вобласці будзе ажыццяўляцца на базе 46 стацыянарных лагераў і арандаваных баз. На тэрыторыі рэгіёна ў летні перыяд будуць працаваць больш за 500 дзённых лагераў, 110 профільных круглаcутачных, 9-дзённых і 100 лагераў працы і адпачынку. Плануецца аздаравіць 2820 дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, і 566 дзяцей-інвалідаў у круглаcутачных і дзённых лагерах.

---

## Канікулы!

# ЛЕТА НА КАРЫСЦЬ

**Больш як 6 тысяч аздараўленчых лагераў усіх тыпаў прымуць дзяцей на летніх канікулах у бягучым годзе. Сёлета жаданне аздаравіцца выказалі 349,4 тысячы чалавек (143,4 тысячы — у круглаcутачных летніках і 206 тысяч — у дзённых). Гэта самы высокі паказчык за два апошнія гады. Пра гэта паведаміў журналістам намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК.**

Летась добра зарэкамендавала сябе акцыя «Лета на карысць», таму яна працягнецца. Ва ўсіх рэгіёнах будуць працаваць профільныя лагеры самай рознай накіраванасці: экалагічныя, біялагічныя, тэхнічныя, гісторыка-археалагічныя, сацыяльна-педагагічныя, матэматычныя, грамадска-гуманітарныя, лінгвістычныя, лагеры для актывістаў грамадскіх арганізацый, для высокаматываваных і адораных дзяцей, мастацкія, харэаграфічныя, ваенна-патрыятычныя, абаронна-спартыўныя, прававыя, педагагічныя і г.д. Традыцыйна папулярнасцю ў дзяцей і падлеткаў карыстаюцца турыстычныя палатачныя круглаcутачныя лагеры. Такі від аздараўлення запатрабаваны ў непаўналетніх, у тым ліку, і з прычыны невысокага кошту пуцёўкі: бацькоўская даплата ў сярэднім складзе ад 300 да 600 тысяч рублёў.

Навінкай гэтага лета стануць прафарыентацыйныя аздараўленчыя летнікі для дзяцей і падлеткаў. «Напрыклад, у Гомельскай вобласці будуць адкрыты прафарыентацыйныя лагеры на базе ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў рамках праекта «Прафесійныя канікулы», — расказаў Віктар Якжык. — Яго каардынатарам выступаюць упраўленне адукацыі Гомельскага аблвыканкама, рэгіянальны цэнтр тэсціравання і прафесійнай арыентацыі навучэнскай моладзі і Гомельскі абласны палац творчасці дзяцей і моладзі. Асноўны прынцып праграмы выхавання ў такім лагеры — правядзенне тэматычных дзён з вывучэннем розных прафесій».

У чэрвені Гомельскай памежнай групай сумесна з упраўленнем адукацыі будзе праведзены адкрыты турнір па памежнай эстафеце сярод атрадаў устаноў адукацыі «Юны сябар пагранічніка». Акрамя таго, у чэрвені стартуюць чатыры абласныя акцыі па арганізацыі карыснай занятасці дзяцей: «Героі сярод нас» (знаёмства дзяцей з біяграфіяй і дзейнасцю вядомых людзей рэгіёна), «Лета ў аб'ектыве турыстаў: цуды прыроды», «Крылы лета» (сумесна з грамадскім аб'яднаннем «Ахова птушак Бацькаўшчыны») і «Школьныя канікулы разам з тэхнікай». Каардынаваць удзел школьнікаў і педагогаў у акцыях будуць абласныя ўстановы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

У ліпені на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту сумесна з іншымі зацікаўленымі пройдуць 2 змены абласнога праекта «Курсант-Ты!» для 50 падлеткаў, якія стаяць на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх з раёнаў вобласці. Аналагічныя праекты праводзяцца ў рамках ваенна-патрыятычных лагераў у Мазыры, Светлагорску, Рэчыцы, Гомелі.

Віктак Якжык канстатаваў павелічэнне з кожным годам колькасці ахопленых аздараўленнем дзяцей-інвалідаў. Летась гэты паказчык склаў 4 700 чалавек.

А 27 мая ўжо афіцыйна стартаваў аздараўленчы сезон. На першую змену ў Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня» адправіліся 1230 дзяцей. «Гэта максімальная колькасць, якую мы можам прыняць, — патлумачыла яго **дырэктар Надзея АНУФРЫЕВА.**

Трапіць летам у «Зубраня» марыць вельмі многія, таму пуцёўкі разбіраюцца яшчэ зімой. Вось ужо не першы год у «Зубраняці» апрабуецца мадэль «Лагер у лагеры». Пад профільныя змены для падлеткаў ад 12 гадоў і старэйшых задзейнічаюць палатачныя летнікі. «Гэта не азначае, што дзеці спяць у спальніках на зямлі. У палатках з драўлянымі насціламі ўстаноўлены ложкі, ёсць санітарныя блокі. Плюс дзеці карыстаюцца ўсёй інфраструктурай нашага цэнтра», — удакладніла Надзея Ануфрыева.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# МІГРАЦЫЯ ПАД МІКРАСКОПАМ

**Апошнім часам разнастайныя праблемы, звязаныя з міграцыяй, актыўна абмяркоўваюцца на міжнародных канферэнцыях і ў сусветных сродках масавай інфармацыі. І гэта зразумела: перасяленне людзей уплывае на ўсе галіны грамадскага жыцця — бяспеку, культуру, эканоміку і нават палітыку. Менавіта таму міграцыя і пытанні, з ёй звязаныя, увайшлі ў Парадак дня ў галіне ўстойлівага развіцця да 2030 года, які летась у верасні ўхваліла Генеральная Асамблея ААН. А як з гэтым абстаяць справы ў нашай краіне?**



— Беларусь непасрэдна міграцыйны крызіс у Еўрасаюзе не закрануў, — гаворыць **старшыня прадстаўніцтва Міжнароднай арганізацыі па міграцыі ў Рэспубліцы Беларусь Зейнал ГАДЖЫЕЎ.** — Але праз тое, што мы непасрэдна мяжуем з гэтай супольнасцю і з'яўляемся транзітнай краінай, водгукі гэтага крызісу далятаюць і да нас. За апошнія гады Беларусь сутыкнулася сама меней з трыма тэндэнцыямі, якія істотна ўплываюць на міграцыйную сітуацыю ў краіне.

Прычыны, якія прымушаюць людзей здымацца з роднага месца і шукаць шчасця ў іншых гарадах ці нават дзяржавах, розныя. Хтосьці шукае лепшай долі, а нехта ўцякае ад вайны. Але гэта так званыя «адвечныя» прычыны міграцыі. Цяпер на яе істотна ўплывае імклівае развіццё інфармацыйных, транспартных і камунікацыйных тэхналогій. Рухавіком на яе з'яўляецца недахоп працоўнай сілы ў адных краінах і залішняя прапанова ў іншай, разнастайныя дэмаграфічныя фактары. Як вынік, у свеце немагчыма адшукаць краіну, якая не адчула б на сабе ўплыў міграцыі — як пазітыўны, так і негатыўны.

Усё болей узрастае значнасць працоўнай міграцыі. Па звестках Міністэрства ўнутраных спраў, Беларусь — гэта краіна як паходжання, так і прызначэння такіх перасяленцаў. У топ-6 краін, адкуль да нас едуць працаўладкоўвацца, уваходзяць Кітай, Узбекістан, Турцыя і Літва. Цікава, што летась да нас з гэтай мэтай прыехалі больш за дзве тысячы грамадзян Расіі. А вось пальму першынства тут стала ўтрымлівае Украіна. Усяго ў 2015 годзе да нас адтуль пераехалі крыху больш за 14 тысяч чалавек — фактычна насельніцтва невялікага раённага цэнтра. Гэта і ёсць другая асаблівасць міграцыйных працэсаў у Беларусі: за год да пачатку вядомых падзей на паўднёвым усходзе Украіны да нас прыбыла адтуль удвая менш людзей. Акрамя таго, значна вырасла нерэгулярная транзітная міграцыя праз нашу тэрыторыю.

Вырастаюць лічбы і эмігрантаў — калі ў 2014 годзе за межы Беларусі на працу выехаў 5.441 чалавек, то летась іх стала болей амаль на 900. Абсалютная большасць людзей з Беларусі кіруецца ў Расію: адбіваецца геаграфічная блізкасць і валоданне мовай. На другім месцы з гіганцкім адрывам у 14 разоў знаходзяцца Злучаныя Штаты Амерыкі.

З-за транзітнага становішча для нашай краіны характэрная нелегальная міграцыя. Толькі летась нашы праваахоўнікі спынілі 21 такую арганізаваную групу. Праз нашу тэрыторыю незаконна прабіраліся грамадзяне Сірыі, В'етнама, Іарданіі, Лівана, Егіпта, Ірака і нават Шры-Ланкі.

— Тым не менш у 2014 і 2015 гадах палітыка ў галіне міграцыі дазволіла кантраляваць міграцыйныя плыні і паставіць добры заслон незаконнай міграцыі, — лічыць **намеснік міністра ўнутраных спраў Беларусі Мікалай МЕЛЬЧАНКА.** — Узровень злачыннасці мігрантаў не перавышае 1,4%. Яна не ўплывае на агульную крыміналагенную абстаноўку. Два апошнія гады з Сірыі ідзе прыём дазіраваны. І мы ствараем пэўныя ўмовы для адаптацыі іх у нашай краіне. Таксама прыязджаюць да нас уцекачы і з іншых краін, ахопленых узброенымі канфліктамі, — з Емена, Ірака і Афганістана.

Міграцыя цяпер, па сутнасці, гэта прадмет вострых палітычных дыскусій на пляцоўках любога ўзроўню: нацыянальных, рэгіянальных і глабальных. Але ўсё часцей пра яе разважаюць пераважна ў негатыўным сэнсе. А гуманітарны складнік адыходзіць на другі план. Зрэшты, як і велізарны пазітыўны патэнцыял, які нясе ў сабе міграцыя. І яго трэба рознымі шляхамі выкарыстоўваць. Датычна Беларусі варта згадаць працоўных мігрантаў. Часта яны запаўняюць тыя вакансіі, якія мясцовыя жыхары не разглядаюць у якасці крыніцы атрымання даходу па розных прычынах. Яны дапамагаюць дзяржаве, плацячы падаткі, і ствараюць дабрабыт для сваёй сям'і. Вось так і атрымліваецца патэнцыял як для краіны паходжання мігрантаў, так і для краіны іх прыёму.

Сістэма прадастаўлення прытулку, якая дзейнічае ў Беларусі, грунтуецца на міжнародна прызнанай канцэпцыі. Заканадаўчая база, якая распрацавана і прынята ў Беларусі, прызнана міжнароднымі спецыялістамі найлепшай сярод краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Працэдура прадастаўлення статусу бежанца ў Беларусі дзейнічае ад 1997 года. Ад таго часу з хадайніцтвамі аб абароне звярнуліся больш за 6 тысяч чалавек з шасці дзясяткаў краін свету. Аднак чакаецца, што на сесіі парламента, якая праходзіць зараз, будзе прынята новая рэдакцыя закона аб вымушанай міграцыі. Распрацавана яна для таго, каб некаторыя яго тэзісы прывесці ў адпаведнасць з ратыфікаванай Беларуссю Канвенцыяй 1951 года аб статусе ўцекачоў. Акрамя таго, гэтыя захад скіраваны на прафілактыку злоўжыванняў працэдурай атрымання прыстанішча.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**



# ПАРАДАК НА СТАДЫЁНЕ АБМЯРКОЎВАЕМ РАЗАМ

## Міністэрства ўнутраных спраў выступіла з прапановай грамадскага абмеркавання паводзінаў спартыўных фанатаў на стадыёнах

— Канфліктныя сітуацыі паміж супрацоўнікамі міліцыі і заўзятарамі выклікаюць шырокі розгалас, — кажа **Канстанцін ШАЛЬКЕВІЧ, начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў.** — Міністэрствам распрацаваны шэраг ініцыятыў, прынясце якіх дазволіць удасканаліць сістэму мер бяспекі на стадыёнах, а таксама мінімізаваць негатыўныя наступствы ўзаемадносін спартыўных балельшчыкаў і прадстаўнікоў праваахоўных органаў.

Тым часам ужо распрацаваны праект адпаведнага закона. Дакумент прадугледжвае новы від пакарання — «адміністрацыйная забарона наведвання фізкультурна-спартыўна-масавых мерапрыемстваў, спартыўных спаборніцтваў». Тэрмін пакарання — ад трох месяцаў да трох гадоў за парушэнне ўстаноўленых абмежаванняў пры правядзенні мерапрыемстваў.

Акрамя таго, закон «Аб фізічнай культуры і спорце» ад 4 студзеня 2014 года прапануецца дапоўніць тэрмінамі «балельшчык», «валанцёр» і «сцюард». Апошнія разам з супрацоўнікамі міліцыі надзяляюцца паўнамоцтвамі правяраць у грамадзян асабістыя дакументы, а таксама праводзіць дагляд грамадзян, іх рэчаў, прадметаў, транспартных сродкаў, у тым ліку з дапамогай тэхнічных і спецыяльных сродкаў.



На думку праваахоўнікаў, прыняцце адміністрацыйнай забароны і ўвядзенне новых саставаў адміністрацыйных правапарушэнняў дазволяць агарадзіць наведвальнікаў спартыўных мерапрыемстваў ад патэнцыйнай небяспекі.

— Абмеркаванню папярэднічаў аналіз мерапрыемстваў, скіраваных на захаванне бяспекі на стадыёнах, у замежных краінах: Вялікабрытаніі, Германіі, Францыі... — кажа **Дзмітрый КУР'ЯН, начальнік упраўлення аховы правапарадку Галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МУС Рэспублікі Беларусь.** — Акцэнт спачатку робім на футболе. Але калі ўсё будзе ўспрынята добра і зацверджана на заканадаўчым узроўні, змены будуць тычыцца і іншых відаў спорту. Мы чакаем водгуку грамадства, каб разам з зацікаўленымі маглі выпрацаваць канцэпцыю забеспячэння аховы правапарадку з улікам міжнароднага вопыту. Гэтыя пытанні закранаюць шырокія слаі насельніцтва. Усё ж такі ў нас вялікая колькасць людзей наведвае спартыўныя мерапрыемствы. Гэта найперш тычыцца хакея і футбола. І праблема, якую мы ўзнялі, актуальная для многіх.

Даслаць свае прапановы і рэкамендацыі можна па электроннай пошце *guoppmvd@mail.ru* альбо скіраваць у пісьмовым выглядзе на адрас: Галоўнае ўпраўленне аховы правапарадку і прафілактыкі, вул. Гарадскі вал, 4, 220030, г. Мінск. Вы таксама можаце паўдзельнічаць у галасаванні «Парадак на стадыёнах — абмяркоўваем законапраект разам» на сайце МУС.

***P.S. Прапановы і рэкамендацыі не з'яўляюцца зваротамі грамадзян і пад закон «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» не падпадаюць. Падрыхтоўка адказаў на прапановы не прадугледжваецца.***

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

## ■ Навіны 102

### НОВАЕ ПРЫЗНАЧЭННЕ

**Загадам міністра ўнутраных спраў Ігара Шуневіча на пасаду начальніка ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі МУС прызначаны Дзмітрый Карзюк.**

Дзмітрый Карзюк у органах унутраных спраў з 1993 года. Пасля службы ва Узброеных Сілах прыняты на службу інспектарам дарожна-патрульнай службы 3-га матарызаванага ўзвода асобнага батальёна ДПС УУС Мінгарвыканкама. Пасля службы камандзірам узвода, узначальваў асобную роту ДПС. З 2008 года ўзначальваў ДАІ Мінска.

**Якаў ЖУРБІН**

## ■ Ну і ну!

### З СЯКЕРАЙ НА БАЦЬКУ...

**Супрацоўнікі сталічнага АМАПа ў мікраранёне Уручча падчас нясення службы затрымалі беспрацоўнага, раней неаднойчы судзімага мужчыну, які сякерай нанёс траўму свайму бацьку.**

Каля гадзіны ночы вартавыя правапарадку атрымалі ад аператыўнага дзяжурнага паведамленне, што па вуліцы 50 гадоў Перамогі сын пагражае бацьку. На месцы да іх звярнуўся 63-гадовы грамадзянін, які заявіў, што яго 39-гадовы сын, пагражаючы фізічнай расправай, нанёс яму сякерай траўму шыі. Пацярпеламу аператыўна аказалі першую дапамогу, затым выклікалі брыгаду «хуткай». Нападаўшы затрыманы для разбору.

### НЕ НА ТОЕ ПАСТАВІЎ

**У Мінску праваахоўнікі затрымалі 50-гадовага мужчыну, які, знаходзячыся ў адным з казіно, пашкодзіў у гульнявой зале камп'ютарны манітор коштам больш за 15 мільёнаў рублёў.**

— У міліцыю звярнуліся прадстаўнікі адміністрацыі ўстановы, якія і паведамілі пра такі ўчынак аднаго з наведнікаў, — расказала **прэс-афіцэр Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна АБОЗНАЯ.** — Як высветлілася, затрыманы 50-гадовы мінчанін мае гульнявую залежнасць. Афіцыйна нідзе не працуе, аднак з'яўляецца частым госцем падобных устаноў горада. Свой учынак мужчына патлумачыў тым, што прайграў у рулетку буйную суму грошай, таму разлаваўся і вырашыў выліць раздражненне... на манітор камп'ютара. За хуліганства грамадзяніну пагражае пазбаўленне волі тэрмінам да трох гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# ЯК ПАСТАВІЦЬ ЛЕЦІШЧА ПАД ЗАМОК?




**Чым бліжэй лета, тым больш дачнікаў спяшаюцца ў свае загарадныя сядзібы. Але жаданне добра адпачыць, папрацаваць на гародчыку для некаторых ператвараецца ў нечаканую непрыемнасць. Прыходзіцца займацца не тым, чым хацеў, а разбірацца з наступствамі візітаў... рабаўнікоў. Адносна нядаўна ў рэдакцыю газеты звярнуўся чытач, які паведаміў, што ў вёсцы Кальчыцы, пад Слуцкам, злодзеі прайшліся адразу па трох дамах. Аб падобным выпадку год таму нам паведамілі і з Мядзельскага раёна. Ва ўсіх здарэннях фігуравалі дамы, якія належаць дачнікам, альбо тым, хто не пражывае ў іх пастаянна. Здавалася б, праблема далёка не новая, нават старая, але яе ў любым выпадку трэба неяк вырашаць. Хто і чаму крадзе з лецішчаў? Як можна засцерагчыся ад такіх няпрошаных гасцей? На гэтыя пытанні паспрабаваў знайсці адказы карэспандэнт «Звязды».**



...Каб патрапіць у вёску Кальчыцы, трэба не даязджаючы да Слуцка павярнуць на Гольчычы і яшчэ кіламетраў дзесяць ехаць прасёлкавай дарогай. Мясціны прыгожыя. І я цалкам разумею тых, хто гатовы патраціць грошы і набыць тут дом. Тым больш, як кажа мой спадарожнік, **Аляксандр ДОЛБІК, намеснік начальніка аддзела па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні Слуцкага аддзела Дэпартамента аховы МУС**, многія вёскі маленькія, і людзей у іх жыве таксама няшмат. Кальчыцы якраз такая. Хто ведае, магчыма, не маланаселенасць таксама прыцягнула злодзеяў. Як пасля расказалі ў Слуцкім раённым аддзеле ўнутраных спраў, падобная бяда закранула не толькі Кальчыцы, але і некалькі другіх вёсак. Падазраваныя, між іншым, ужо затрыманы.

**На 26 мая ў краіне зарэгістравана 14,5 тысячы крадзяжоў. З іх 1231 крадзеж — з дачных домікаў.**

— Падобныя злачынствы носяць сезонны характар, — кажа **Аляксандр ГОЛІКАЎ, намеснік начальніка аддзела — начальнік міліцыі грамадскай бяспекі Слуцкага РАУС**. — Людзі жывуць у іх непрацяглы час. Пасля ўборкі ўраджаю з'язджаюць у гарады, закрываючы дамы на зіму. І толькі ўвесну, пасля 5-6 месяцаў, зноў вяртаюцца і бачаць, што іх абрабавалі. Да нас звяртаюцца. Мы ў поўным аб'ёме праводзім праверку, прымаем усе меры.

Хто здзяйсняе падобныя злачынствы? Як лічыць Аляксандр Голікаў, гэта могуць быць і алкаголікі, і жабракі, і наркаманы, якія спадзяюцца не толькі падсілкавацца закаткамі, але і перапрадаць чужое майно, назбіраць на выпіўку ці на чарговую дозу. І тычыцца гэта не толькі вёсак, дзе многія набываюць сабе загарадныя дамы, але і садовых таварыстваў, куды таксама лазяць.

Каб такога не адбылося, спадар Аляксандр раіць не ствараць для гэтага спрыяльных перадумоў.

— Усе матэрыяльныя каштоўнасці, якія важныя для гаспадароў, неабходна забіраць з сабой альбо пакінуць суседзям, што пастаянна там пражываюць.Тыя, хто пакідае каштоўныя рэчы на дачы, мяркуюць, што іх бяда не закране. Як правіла, менавіта саманадзейныя людзі пакутуюць ад злачынных замахаў.

Прафілактыка — рэч дзейсная, калі не практыцы выконваюцца пажаданні. Але і яна не заўжды можа засцерагчы ад непрыемных візітаў. Ёсць яшчэ адзін спосаб абараніць ад небяспекі жытло — устанавіць ахоўную сігналізацыю.

— У Слуцку дамінуюць крадзяжы асабістай маёмасці. Кватэрных няшмат, — кажа Аляксандр Долбік. — А тыя кватэры, якія абсталяваны сігналізацыяй, злодзеі проста абыходзяць бокам. Бачаць, што каля дзвярэй гарыць чырвоны святлодыёд, і сыходзяць, праблем сабе не шукаюць.

***— А ці здаюць пад ахову свае дамы ў раёне?***

— Так. У дзесяцікіламетровай зоне Слуцка, гэта значыць на тэрыторыі, куды аператыўна можа выехаць наш нарад, мы можам цалкам абсталяваць дом ахоўнай сігналізацыяй. Калі дом пад аховай, аднак знаходзіцца па-за межамі гэтай зоны, мы паведамляем па тэлефоне аб дзейнічанні апаратуры гаспадарам ці даверанымасобам, пазначаным у дакументах, але не выязджаем. І ў нас ёсць такія дамы. Напрыклад, у вёсцы Гацук. Жыхар Мінска звярнуўся з такой просьбай і мы без апаратыўнага рэагавання ахоўваем ягоны дом. Звярталіся да нас і прадстаўнікі садовых таварыстваў. Але яны хацелі, каб нарад абавязкова выязджаў на спрацоўванне. Аднак гэта немэтазгодна. Тым больш, калі ўлічыць, што усе яны знаходзяцца далёка ад раённага цэнтра.

***— Давайце ўявім, што я маю дом у Кальчыцах. Якія крокі трэба зрабіць, каб абсталяваць дом сігналізацыяй?***

— Найперш трэба напісаць заяву на абсталяванне дома сігналізацыяй. Пасля гэтага мы даследуем усе памяшканні, складаем каштарысную дакументацыю. Калі чалавек згодны, ён падпісвае дамову на мантажныя работы. Потым складаецца акт аб выкананні мантажных работ. На аплату мантажу, дарэчы, даецца растэрміноўка на шэсць месяцаў.

***— І ў якую суму абыдзецца ўстаноўка сігналізацыі?***

— Усё залежыць ад памераў дома. Каштуе ўсё нятанна — каля 8-10 мільёнаў, але дзеля гэтага і даецца растэрміноўка. Акрамя таго, кожны месяц неабходна плаціць 70 тысяч за паслугі аховы.

...Як каму засцерагаць сваю маёмасць, справа кожнага. Але паміж загарадным домам і сціплай хаткай каля гарода розніца істотная. І калі там ёсць, што ахоўваць, можа і сапраўды лепш здаць дом пад сігналізацыю, каб не было пасля неспадзяванак.

**Якаў ЖУРБІН.**

*Слуцкі раён.*



## ■ Дні і ночы

# «Я ВЫКОНВАЎ СВАЮ ПРАЦУ»



**Да гэтага мая жыхар Мінска Уладзіслаў БАЗОЎСКІ спакойна нёс службу ў Цэнтральным аддзеле Дэпартамента аховы сталіцы і нават не думаў, што яго імя неўзабаве з'явіцца ў цэнтральных газетах і на інфармацыйных парталах краіны.**

У адзін з будных дзён, амаль апоўначы, Уладзіслаў падчас сутачнага дзяжурства паехаў на праверку да вартавога паста «Заслаўскае вадасховішча». Усё мусіла прайсці гладка, але адбылося нечаканае. Калі Базоўскі выйшаў з машыны, да яго падбег расхваляваны мужчына і сказаў, што ў ваду з парапета скокнуў чалавек. Пра тое, што было далей, расказвае сам Уладзіслаў:

— Я прабег метраў сто па мосце і ўбачыў у вадзе, прыблізна ў трох метрах ад берага, чалавека. Доўга не думаў і адразу кінуўся яго ратаваць. Гэта была жанчына. Калі выцягнуў яе з вады і прывёў у прытомнасць, паспрабаваў выклікаць «хуткую дапамогу». Аднак тэлефон у кішэні прамок і ўжо не працаваў. Тады спытаў, ці зможа яна сама рухацца. Жанчына адказала станоўча, і мы пакрысе пайшлі да вартавога паста. Ужо там пачалі яе адаграваць і выклікалі медыкаў.

***— Калі не памыляюся, жанчына на той момант знаходзілася ў вышку.***

— Так. Толькі пра тое, што яна збегла з бальніцы, мы даведаліся ўжо пазней, калі аб гэтым нам паведаміў участковы інспектар. Ведаю, што пасля яна некалькі дзён ляжала ў рэанімацыі, а цяпер знаходзіцца на рэабілітацыі. На днях яе павінны выпісаць.

***— Такіх неардынарных выпадкаў у вашай міліцэйскай біяграфіі раней не было?***

— Усякага хапала, але падобнае са мной за шэсць гадоў службы ў Дэпартаменце аховы здарылася ўпершыню. Усё ж такі, акрамя патрулявання, мы шмат увагі надаём ахове аб'ектаў усіх формаў уласнасці грамадзян, устаноў і арганізацый. Калі спрацоўвае «трывожная кнопка», мы адразу адпраўляемся на выклік. Ездзем таксама і на іншыя паведамленні грамадзян. Мае галоўныя задачы — агляд асабістага складу, забеспячэнне баявой гатоўнасці ўзвода. У той дзень на Мінскім моры прыйшлося займацца зусім іншым.

***— На наступны дзень пасля выратавання пра вас шмат пісалі ў інтэрнэце. Ці адчулі тады, што здзейснілі значны ўчынак?***

— Для мяне гэта была праца, абавязак, які мусіў бы выканаць любы чалавек. Паўтаруся, я доўга не думаў і адразу скокнуў у ваду. Праўда, праз пэўны час я пачаў аналізаваць сітуацыю, прыйшоў да таго, што ўсё магло завяршыцца іначай. Было цёмна, ішоў дождж. З таго бетоннага парапета можна было няўдала скокнуць... Але добра, што скончылася так, як скончылася.

***— Чуў, што нядаўна вы атрымалі падзяку — за тое, што знайшлі хлопчыка, які згубіўся.***

— Гэта адбылося літаральна на гэтых выхадных. Я якраз дзяжурыў, і да мяне звярнулася жанчына, сказала, што 30-40 хвілін таму згубіла хлопчыка. Маўляў, выйшла з крамы, на некалькі хвілін адцягнула ўвагу на старэйшага сына, азірнулася, а малога ўжо няма. Мы адразу ўдакладнілі даныя, паведамілі іх у раённы аддзел унутраных спраў. Для дапамогі ў пошуках у парк Перамогі адправілі тры экіпажы. Я ўдакладніў у жанчыны, дзе яна жыве. Аказалася, што недалёка ад парку, часта з сынам любяць гуляць у садку. Мы паехалі туды і каля гэтага садка знайшлі дзіця. У хлопчыка прыроджаная хвароба. Ён бы нікому пра сябе сам не расказаў.

***— Дарэчы, Уладзіслаў, як вы трапілі ў міліцыю?***

— У дэпартаменце служу з сакавіка 2009 года. Прайшоў праз вучэбны цэнтр, служыў звычайным міліцыянерам. А пасля таго, як адвучыўся ў Магілёўскім вышэйшым каледжы МУС, атрымаў афіцэрскае званне, узначаліў узвод. Чаму захацеў стаць міліцыянерам? У мяне бацька быў супрацоўнікам праваахоўных органаў. Гледзячы на яго, заўжды хацеў насіць пагоны. Цяпер тата на пенсіі, а да яе працаваў старшым навуковым супрацоўнікам у Акадэміі МУС.

***— Чым захапляецеся ў вольны ад працы час?***

— Люблю вудзіць рыбу. Але тыя мясціны, дзе прыйшлося ратаваць жанчыну, я не ведаў. Рыбачыць люблю ездзіць падалей ад Мінска.

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

## ■ Акцыя

# ЗАПРАСІЛІ НА СВЯТА І ДАПАМАГЛІ ДЗІЦЯЦІ

### У Магілёве міліцыя арганізавала для моладзі фестываль «Разам»



Такую незвычайную форму зносін з маладымі прыдумала УУС Магілёўскага аблвыканкама. Праграма распрацоўвалася амаль паўгода і была шчодрая на мерапрыемствы. «Толькі калі мы разам, у адзінстве, мы можам дасягнуць поспехаў, пабудаваць прыгожае жыццё», — адзначыў на адкрыцці фестывалю **палкоўнік міліцыі Аляксандр СЯРГЕЕЎ, намеснік начальніка УУС.**

Амаль цэлы дзень плошча Славы ў Магілёве пела,танцавала, здзіўляла, натхняла. Тут можна было памацаць рукамі баявую тэхніку і экіпіроўку супрацоўнікаў міліцыі, паназіраць за спартыўнымі спаборніцтвамі элітнага падраздзялення гэтага ведамства, паўдзельнічаць у майстар-класах і прадэманстраваць свае спартыўныя поспехі. Дарэчы, пераможцы спартыўных і творчых конкурсаў стараліся не проста так, лепшыя атрымалі дыпломы і падарункі. Фестываль падтрымалі вулічныя тэатры і байкеры. Сваё майстэрства паказалі аматары вулічнага варкаўта і сілавога экстрыму. У парку імя Горкага «Фотасушка» дэманстравала найбольш цікавыя моманты з міліцэйскага жыцця. Кожная хвіліна на свяце не прайшла дарэмна. Эмоцыі білі праз край. А вечарам на сцэне «запальвалі» рок-музыканты і эстрадныя выканаўцы, здзіўляў публіку вядомы беларускі ілюзіяніст Віктар Шышко і фаершчыкі з клуба «Подых агню». Усе сродкі ад гэтага дабрачыннага канцэрта «Музыка дорыць жыццё» пойдуць на лячэнне хворага хлопчыка з Краснапольля, адзначылі ў прэс-службе УУС Магілёўскага аблвыканкама.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота прадастаўлена УУС Магілёўскага аблвыканкама.**

## Извещение о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания жилых домов

# НЕМАНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**29 июня 2016 года по адресу: аг. Могильно, ул. Комсомольская, 57, зал заседаний в 15.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот №1 | Неманский сельсполком | д. Броды-1, ул. Центральная, 1В | 0,1489 | 625682900601000037 | 15 000 000 | 5 400 000 |
| Лот №2 | Неманский сельсполком | д. Ракошичи, ул. Луговая, 2А | 0,1500 | 625682108701000160 | 15 000 000 | 12 114 265 |
| Лот №3 | Неманский сельсполком | д. Головни, ул. Центральная, 4 | 0,1500 | 625682101101000019 | 10 000 000 | 12 627 859 |

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Имеется возможность подключения к электроснабжению.

*Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет №3641062500039 Неманского сельского исполнительного комитета в ЦБУ №625 филиала №500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 600110100, код платежа – 04901.*

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: аг. Могильно, ул. Комсомольская, 57, кабинет управляющего делами с 8.00 до 17.00 по рабочим дням **по 23 июня 2016 года** включительно.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка;

• копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

• представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Заключительная регистрация – с 9.30 до 14.45 в день проведения аукциона.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробную информацию об аукционах, условиях участия можно узнать по телефонам: (801718) 43337, 43317.

# ЛОГОЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**сообщает о проведении 29 июня 2016 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура | Начальная цена, руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб. | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Силичи, ул. Курортная, д. 5, 623284605401000309 | 0,1039 | водоснабжение, газоснабжение | 27 969 200 | 14 576 100 + реклама | 2 797 000 |
| 2 | д. Понизовье, ул. Дорожная, д. 9, 623284604601000145 | 0,1262 | | 21 215 300 | 14 880 800 + реклама | 2 121 600 |

Земельный участок в д. Силичи, ул. Курортная, д. 5 имеет ограничения в использовании площадью 0,1039 га в связи с расположением в водоохранной зоне пруда, земельный участок в д. Понизовье, ул. Дорожная, д. 9 имеет ограничения в использовании площадью 0,1262 га в связи с расположением в водоохранной зоне реки Гайна.

*Задаток в размере 10% от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с 3600619101109 в ЦБУ № 611 филиала № 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, УНН 600181577, код 04901.*

Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 29 июня 2016 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6. **Последний день приема заявлений – 23 июня 2016 года до 17.00.**

Контактные телефоны: (801774) 55056, 28473.

## РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 27 июня 2016 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже автотранспортного средства, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Гомельторгмаш» на праве собственности

| № лота | Наименование, краткая характеристика объекта | Начальная цена, бел. руб. (в т.ч. НДС 20%) | Задаток, бел. руб. (в т.ч.НДС 20%) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль MERCEDES-BENZ 1841 LS ACTROS,** регистрационный знак AI 2322-3, год выпуска 2011, цвет белый перламутр. Номер кузова (рамы): WDB9340321L619107. Тип: грузовой седельный тягач. Вид топлива – ДТ. Объем двигателя – 11946 см куб. Автомобиль обременен залогом в обеспечение исполнения обязательств по кредитному договору с ОАО «Белинвестбанк». Разрешение залогодержателя на продажу имеется | **1 396 800 000** | **69 840 000** |

Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 24 июня 2016 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **27 июня 2016 г**.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; индивидуальный предприниматель – паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором аукциона; представитель индивидуального предпринимателя – паспорт и доверенность; представитель юридического лица (резидент РБ) – паспорт (руководитель – копию приказа, протокола о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидент РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с 3012230570008 в ЗАО «Альфа-Банк», код 153001270. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 28 мая 2016 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (единственным участником, выразившим согласие купить объект), будет засчитан в счет окончательной стоимости объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (единственным участником, выразившим согласие купить объект), Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (единственный участник, выразивший согласие купить объект) обязан**: в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере два процента от цены продажи лота, сформированной в установленном порядке; в течение 10-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (единственным участником, выразившим согласие купить Объект) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за Объект, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты проведения аукциона.

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. ☎ 8 (0232) 70-46-47; 74-99-76 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by**
**Продавец: ОАО «Гомельторгмаш», г. Гомель, ул. Владимирова, 14. ☎ 8 (0232) 42-20-50; 8 (029) 904-95-02 •**

## Учреждение «Гомельская ЦСДЮШОР профсоюзов «Сож» объявляет о проведении открытого аукциона

# ПО ОТЧУЖДЕНИЮ ЗДАНИЯ ЦЕНТРАЛЬНОЙ ГРЕБНОЙ БАЗЫ,

**площадью 1489,3 кв.м, 1978 года постройки, инвентарный номер 350/С-156880, расположенной на земельном участке площадью 0,2394 га с кадастровым номером 340100000007000144 по адресу: г. Гомель, ул. Перевалочная, 68**

Начальная стоимость составляет 182 869 (сто восемьдесят две тысячи восемьсот шестьдесят девять) долларов США без учета НДС.

Валюта торгов – доллар США, валюта платежа – белорусский рубль. Оплата производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.

Дополнительные сведения: земельный участок: правообладатель (право постоянного пользования) – юридическое лицо, резидент Республики Беларусь учреждение «Гомельская центральная специализированная детско-юношеская школа олимпийского резерва профсоюзов «Сож».

Для участия в аукционе участник предоставляет следующие документы:

- заявление на участие в аукционе ;
- копии учредительных документов, свидетельства о государственной регистрации;
- документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим участника банком (при наличии);
- копия платежного документа о внесении задатка (задаток 30 000 000 белорусских рублей), задаток перечисляется до 01.06.2016 года:

*учреждение «Гомельская ЦСДЮШОР профсоюзов Сож»*
*246050, г. Гомель, ул. Советская, д. 29,*
*р/с 3015640330004 в ОАО «Паритетбанк» г. Минск*
*МФО 153001782 УНП 490423356;*

- юридические лица – нерезиденты Республики Беларусь – помимо вышеперечисленных документов предоставляют легализированные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения, переведенных в установленном порядке на белорусский (русский) язык;
- представителям юридических лиц – документ, удостоверяющих личность, а также документы, подтверждающие их полномочия на участие в аукционе и на подписание документов;
- физическое лицо (его представитель, участвующий в аукционе) – документы, удостоверяющие личность, доверенность (в случае представления интересов другого лица);
- иные документы по усмотрению участника.

К участию в аукционе не допускаются лица, не представившие вышеперечисленные документы.

Порядок проведения открытого аукциона, оформление участия в торгах, определение лица, выигравшего торги, осуществляется в соответствии с Положением о порядке проведения открытого аукциона, утвержденного Постановлением Президиума Совета ФПБ от 28.01.2016 года.

**Дата проведения аукциона – 07.06.2016 года.**
**01.06.2016 года – регистрация участников открытого аукциона и прием документов прекращается.**
**Аукцион состоится по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 29, каб. 103 в 12.00.**
**Тел./факс 8 (0232) 71-01-15, тел. 8 (0232) 71-75-18.**

# Утвержден порядок приема в адъюнктуру Академии МВД на 2016 год

Количество мест определено контрольными цифрами приема, установленными Государственным комитетом по науке и технологиям, и составляет:

| Специальность (конкурс проводится в рамках специальности) | Дневная форма получения I ступени послевузовского образования | Заочная форма получения I ступени послевузовского образования |
|---|---|---|
| *Отрасль науки: 12.00.00 – юридические науки* | | |
| 12.00.01 – теория и история права и государства; история учений о праве и государстве | 2 | – |
| 12.00.02 – конституционное право; конституционный процесс; муниципальное право | 1 | – |
| 12.00.03 – гражданское право; предпринимательское право; семейное право; международное частное право | 1 | – |
| 12.00.08 – уголовное право и криминология; уголовно-исполнительное право | 1 | 3 |
| 12.00.09 – уголовный процесс | 1 | 1 |
| 12.00.12 – криминалистика; судебно-экспертная деятельность; оперативно-розыскная деятельность | 8 | 5 |
| 12.00.14 – административное право, административный процесс | 1 | – |

Вступительное испытание по специальностям дневной и заочной форм получения образования – экзамен по специальной дисциплине в объеме учебной программы I ступени высшего образования.

Срок обучения в адъюнктуре в дневной форме получения образования – 3 года, заочной – 4 года, соискательства – 5 лет, в форме соискательства в целях сдачи кандидатских экзаменов и зачетов по общеобразовательным дисциплинам – 2 года.

Право на поступление в адъюнктуру Академии МВД предоставляется сотрудникам органов внутренних дел, не достигшим на момент зачисления 36 лет (дневная форма обучения), имеющим диплом о высшем образовании, склонность к научным исследованиям, опыт практической работы не менее трех лет в должности среднего и старшего начальствующего состава, положительно зарекомендовавшим себя по службе, сдавшим кандидатские экзамены и зачет по общеобразовательным дисциплинам до поступления в адъюнктуру. Отбор кандидатов на поступление в адъюнктуру возлагается на соответствующие профилирующие кафедры Академии МВД.

С порядком приема можно ознакомиться на сайте Академии МВД: **academy.mia.by** (раздел «Послевузовское образование»).
Справка по телефонам: **(8 017) 289-21-43, 289-21-40.**
Адрес: **220005, г. Минск, пр-т Машерова, 6.**

УНП 100926541

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА В БОБРУЙСКОМ РАЙОНЕ

| Номер лота по порядку | Местоположение земельного участка | Начальная цена (руб.) | Размер задатка (руб.) | Расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения | Условие проведения аукциона | Характеристика земельного участка | Кадастровый номер | Инженерная и транспортная инфраструктура | Дата проведения аукциона | Последний день приема заявлений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Бобруйский район, Сычковский сельсиполком д. Щатково, пер. 3-й Масловского, 6 | 13 490 556 | 1 349 056 | 14 523 394 (расходы возмещает победитель аукциона) | Наличие не менее двух участников | Площадь 0,1362 га | №720884012601000230 | - | 30.06.2016 г. | 24.06.2016 г. до 17.00 |
| 2. | Бобруйский район, Сычковский сельсиполком д. Щатково, пер. 3-й Масловского, 4 | 13 995 708 | 1 399 571 | 14 523 394 (расходы возмещает победитель аукциона) | Наличие не менее двух участников | Площадь 0,1413 га | №720884012601000229 | - | 11.07.2016 г. | 05.07.2016 г. до 17.00 |

**ПРИМЕЧАНИЕ:**

Аукцион состоится в 15.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, 2-й этаж, малый зал заседаний. Заявления принимаются по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, каб. 61 в рабочие дни с 08.00 до 17.00 с 1-ого дня после публикации извещения в СМИ. Информация о земельных участках по контактному телефону в г. Бобруйске: 72-05-40, 71-74-30.

Для участия в аукционе гражданин Республики Беларусь (лично или через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок обязан предоставить следующие документы в комиссию по проведению аукционов:

- заявление на участие в аукционе (с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка);
- заверенную копию платежного поручения о внесении задатка (10% от начальной цены) на расчетный счет Сычковского сельсиполкома №3600712110013 в АСБ «Беларусбанк», филиал 703, код 760, УНН 700045734, код платежа 04901;
- представителем гражданина Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;
- при подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Порядок проведения аукциона:

1. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет задаток.

2. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет проданным предмет аукциона словом «продано», а участника аукциона – победителем в отношении соответствующего предмета аукциона.

3. При отсутствии лиц из участников аукциона, готовых выкупить предмет аукциона по названной цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера.

4. Предмет аукциона снимается с аукциона по решению комиссии или организации до начала проведения аукциона в случае отсутствия участников аукциона либо если на объект аукциона претендует только один гражданин.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

■ Як гэта было

# АПОШНЯЯ АБАРОНЧАЯ АПЕРАЦЫЯ

**Гэты артыкул прысвечаны некаторым старонкам гісторыі Магілёўскай абарончай аперацыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Яна называецца апошняй, таму што гэта была першая і адзіная такога роду ваенная дзея ў Беларусі ў 1941 годзе. Абарончая дактрына атрымала жыццё якраз тады, калі перастала існаваць старая савецкая канцэпцыя аб вядзенні баёў толькі на чужой тэрыторыі. Новая стратэгія прадугледжвала стварэнне лініі фронту па Заходняй Дзвіне, Дняпры, Сожы, праз Віцебск, Полацк, Оршу, Магілёў, Мазыр. Магілёву адводзілася роля галоўнага абарончага плацдарма. Найважнейшай задачай новай пабудовы фронту з'яўлялася фарміраванне глыбокаэшаланіраванай абароны Масквы.**


Фота БЕЛТА.
На Буйніцкім полі кожны год збіраюцца ветэраны і ўдзячныя нашчадкі.

ПЛАН стратэгіі прадставілі І. Сталіну 26 чэрвеня 1941 года начальнік Генеральнага штаба Чырвонай Арміі Г. Жукаў, нарком абароны СССР С. Цімашэнка, намеснік Жукава — М. Ватуцін. Сталін дактрыну зацвердзіў без адзінай заўвагі.

Магілёў — горад з багатай гісторыяй. Адзін з яго палкоў прымаў удзел у 1814 года ў штурме Парыжа, у выніку якога французскі імператар Напалеон адрокся ад прастола. У Магілёве ў час Першай сусветнай вайны знаходзілася Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага, якую ўзначальваў Мікалай II (1868—1918).

Папа Рымскі Іаан Павел II казаў, што яго гістарычная радзіма, Польшча, напярэдадні Другой сусветнай вайны жыла і дыхала паэзіяй. А Беларусь у тыя дні займалася пераносам сталіцы БССР з Мінска ў Магілёў. Гэта рашэнне ў 1939 годзе падтрымаў Урад СССР спецыяльнай пастановай. Гістарычная з'ява прадугледжвала: стварэнне ў Магілёве плошчы Перамогі (у гонар перамогі савецкай улады над царскай Стаўкай Вярхоўнага галоўнакамандуючага), пабудову ў горадзе на Дняпры Дома ЦК КПБ. (У Мінску ў 1954 годзе Круглая плошча стала называцца плошчай Перамогі.)

Праектнае абагачэнне Магілёва як новай сталіцы рабілі вядомыя ў БССР і СССР архітэктары А. Воінаў, У. Вараксін і Н. Трахтэнберг. Свае думкі яны выклалі ў даволі аб'ёмістай тлумачальнай запісцы і ў прыгожым каляровым эскізе таго, што павінна было ўяўляць сабою плошчу Перамогі ў яе закончаным выглядзе.

У тлумачальнай запісцы, у прыватнасці, гаворыцца: «Ствараемая ў горадзе на Дняпры плошча Перамогі мае тэрыторыю каля двух гектараў зямлі. Яна размесціцца на перасячэнні галоўных гарадскіх магістраляў: Першамайскай і Ленінскай вуліц і вала «Чырвоная Зорка». Дзякуючы значнай розніцы вертыкальных адзнак з Плошчы адкрываюцца шырокія перспектывы на гарадскі Цэнтральны парк культуры і адпачынку, які праектуецца на беразе Дняпра, на зарэчны раён Лупалава і іншыя раёны Магілёва, якія аддзяляюцца ад Плошчы абрывамі, утвараемымі ракой Дубровенкай. Плошча Перамогі будзе мець трапецападобную форму».

Дом ЦК КПБ планаваўся да размяшчэння ў цэнтры горада.

У З'ЯДНАННЕ БССР з Заходняй Беларуссю, Вялікая Айчынная вайна парушылі ўсе планы... Ад 1939 года ў Магілёве, як напамін аб тых днях, недалёка ад вуліцы Язерскай, назаўсёды застаўся прыгожы будынак пад назваю «Дом урада». У ім сапраўды размяшчаецца кіраўніцтва, але не БССР, а вобласці. Будынак мае знешняе падабенства з мінскім Домам урада.

«Партызанскі рух у Магілёўскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза» — тэма кандыдацкай дысертацыі суіскальніка А. Бяляева, абароненая ў 1949 годзе ў Томскім педагагічным інстытуце. З яе і пачалося вывучэнне Магілёўскай абароны ў выглядзе спецыяльнага дысертацыйнага раздзела «Баі з нямецкімі захопнікамі на подступах да Магілёва».

Магілёў — першы беларускі горад, у якім больш-менш арганізавана прайшла эвакуацыя. Праўда, былі і ў ёй нейкія «белыя плямы», аб чым сведчыць пісьмо сакратара ЦК КП(б)Б І. Ганенкі з Магілёва сакратару ЦК КП(б)Б Р. Эйдзінаву ад 14 ліпеня 1941 года. У ім, у прыватнасці, гаворыцца: «Рыгор Барысавіч, прывітанне! Карыстаючыся аказіяй, рашыў напісаць табе аб рабоце і абстаноўцы. Эвакуацыя горада закончылася паспяхова, болей за тое, вывезлі многа, чаго нават і не трэба было вывозіць, гэта значыць, патрэбную частку харчоў. Пакуль горад не галадае, але праз тыдзень... пачнуцца цяжкасці. Усяго вывезена (гл. дадатак)».


Абарона Магілёва. Ліпень 1941 года.

Цытуемы дакумент адшуканы ў архіўнай справе, якая складаецца з двух тамоў, прысланых з Масквы ў Мінск у маі 1945 года. Дадатак, аб якім гаворыцца, застаўся ў адным з маскоўскіх архіваў. Аб чым ён — невядома і сёння.

Горад на Дняпры абаранялі часці 61-га стралковага корпуса Заходняга фронту, камандзір генерал-маёр Ф.А. Бакунін (1898—1984). У іх складзе змагалася, праяўляючы мужнасць і гераізм, 172-я стралковая дывізія, камандзір генерал-маёр М.Ц. Раманаў (1891—1941). Касцяк дывізіі складалі прыпіснікі з абласцей — Маскоўскай і Тульскай, з Беларускай ССР.

Мне двойчы давялося працаваць у архівах Германіі — у 1989 і 1995 гадах. У некаторых з іх мяне абслугоўвалі ўдзельнікі мінулай вайны. Яны вельмі ўважліва ставіліся да маіх запытаў і давалі высакаякасныя тлумачэнні. У архіве ў Фрайбургу (ФРГ), дзе захоўваюцца матэрыялы аб трагедыі ў Хатыні, убачыў вялікі мастацкі партрэт віноўніка хатынскай трагедыі Дырлевангера. На маё пытанне, чаму ён тут, пачуў: немцы бачаць у гэтым чалавеку толькі ваеннага дзеяча.

У некаторых дакументах гаворыцца аб трох нямецкіх атаках на Магілёў — 9, 12 і 20 ліпеня 1941 года. Але калі «анонс» дапоўніць дадатковым матэрыялам, то колькасць нямецкіх атак скароціцца да двух раўндаў. Першы — атака Магілёва танкамі Гудэрыяна, якая ставіла мэтаю праскочыць мост цераз Дняпро і ляцець далей маланкай на Смаленск і Маскву. Зрабіць гэта не ўдалося. Гудэрыянаўскія танкі мусілі адступіць ад Магілёва і шукаць пераправу ў Шклове, Рагачове, Жлобіне... Такой была першая атака. А потым пачалася другая — штурм горада сухапутнымі войскамі 4-й Арміі, далучанай да танкавай групоўкі Гудэрыяна.

ВОСЬ карціна баявых дзеянняў 7-га нямецкага армейскага корпуса па матэрыялах яго хронікі: *«20.07. Атака на Магілёў не дала жаданых вынікаў з-за моцнага агню рускай артылерыі. Захоп дняпроўскага моста адклалі на больш позні тэрмін. 21.07. Зноў нашы часці спынены рускай артылерыяй. 22.07. Руская авіяцыя дэсантавала ў Магілёў сваёй пяхоце боепрыпасы і харч. 23.07. У бой за Магілёў дадаткова кінуты 78, 15, 71, 23-я дывізіі. На мосце цераз Дняпро загінуў маёр Ханінг, камандзір пяхотнага батальёна 23-й дывізіі. 24.07. Жорсткія баі на вуліцах горада працягваюцца. Карпуснoе камандаванне прыняло рашэнне часова адвесці воінскія падраздзяленні з ускраіны горада, а супраціўленне рускіх падавіць бомбавымі ўдарамі пікіруючых бамбардзіроўшчыкаў. 26.07. Рускія спрабавалі вырвацца з палаючага горада. Рэзюмэ: авалодванне ўмацаваным плацдармам адбылося дзякуючы сямідзённай бітве армейскага корпуса супраць доўгачасовага, добра абсталяванага палявога ўмацавання, якое абаранялася фанатычным непрыяцелем. Рускія стаялі да апошняга. Яны былі неадольныя як з тылу, так і з флангаў. І таму кожную стралковую ячэйку, кожны дом даводзілася браць з боем. Аператыўны аддзел карпуснога камандавання. 15.08.41 г.»*

Дзясяткі, сотні ўдзельнікаў Магілёўскай абарончай аперацыі запомніліся гераічнымі ўчынкамі. У лік такіх абаронцаў роднай зямлі ўвайшлі курсанты Магілёўскай палкавой школы Пятроў і Блізнюк, якія, па сведчанні сваіх таварышаў, кінуліся з гранатамі ў руках пад фашысцкія танкі, падбілі іх і загінулі самі. Камандзір 388-га стралковага палка палкоўнік Сямён Фёдаравіч Куцепаў стаў правобразам галоўнага героя рамана К. Сіманава «Жывыя і мёртвыя» — Сярпіліна.

Магілёў — адзіны горад у тым сэнсе, што ў ім упершыню немцам прыйшлося весці жорсткія вулічныя баі з савецкімі войскамі і народным апалчэннем колькасцю звыш 12 тысяч чалавек.

Штурм Магілёва працягваўся амаль месяц: з 3-га па 26 ліпеня 1941 г. Сцяг са свастыкай быў узняты над горадам 26.07.1941 года. Але камандзір 7-га армейскага нямецкага корпуса палкоўнік Крэбс з асцярожнасцю сказаў аб гэтым акце як аб пераможным моманце.

У ліпені 1974 года ў ЦК КПБ прыйшло пісьмо ад групы ўдзельнікаў Магілёўскай абарончай аперацыі. Аўтары звароту прасілі палітычнае і дзяржаўнае кіраўніцтва краіны разгледзець пытанні: 1. Аб напісанні кнігі і стварэнні кінафільма «У вогненным коле»; 2. Аб выпуску юбілейнага памятнага медаля «За абарону Магілёва»; 3. Аб хадайніцтве перад Урадам СССР аб прысваенні Магілёву ганаровага звання «Горад-герой» за ўклад у зрыў планаў гітлераўскага «бліцкрыгу».

Пісьмо, на жаль, неабходнага разгляду не атрымала і было спісана ў архіў.

І яшчэ аб адной драме. У лістападзе 1929 года ў Магілёў з Мінска перавезлі помнік беларускай старажытнай духоўнасці — Крыж Еўфрасінні Полацкай (далей ад мяжы з капіталістычным светам). Сляды шэдэўра губляюцца ў Магілёве падчас Вялікай Айчыннай вайны. Калі віноўнікі страты — веруючыя людзі, то ёсць надзея, што помнік беларускай старажытнай культуры хоць калі-небудзь ды вернецца на радзіму.

Вось як гучыць ацэнка Магілёўскай абарончай аперацыі з вуснаў галоўнага арганізатара Маскоўскай абароны Г.К. Жукава: нягледзячы на шэраг памылак, а часам і недастатковую супраціўляльнасць, стратэгічная абарона была арганізавана і пачала паступова даваць доўгачаканыя вынікі.

Сціплая ацэнка, але — з вышыні высокай і адказнай пасады тагачаснага начальніка Генеральнага штаба Чырвонай Арміі...

**Яўген БАРАНОЎСКІ**


## Извещение об открытом аукционе по продаже права заключения договора аренды земельного участка для строительства жилых домов по проспекту Янки Купалы в городе Гродно 28 июня 2016 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (с учетом деноминации), руб. | Сумма задатка (с учетом деноминации), руб. | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации (с учетом деноминации), руб. | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Право аренды земельного участка сроком на 99 лет | проспект Янки Купалы | 1,2695 | 440100000001009172 | 12 542 866 580 (1 254 286,66) | 1 254 286 000 (125 428,6) | 36 918 999 (3 691,9) | Строительство группы многоквартирных жилых домов |

Победитель аукциона обязан:

- в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 1 года;

- приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года – гражданину;

- осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

- возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 № 49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

**Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».**

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 152101752, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

**Аукцион состоится 28 июня 2016 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**.

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 57, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 30 мая по 23 июня 2016 года**. Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 72-05-46**. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

# «СТВАРАЛЬНЫ ДУХ ПЕРШАЙ ПАЛАТКІ ЖЫВЕ І СЁННЯ»

**Па добрай традыцыі журналісты «Звязды» раз на год сустракаюцца з кіраўніком адміністрацыі Наваполацка, каб з першых вуснаў пачуць пра навіны буйнога індустрыяльнага цэнтра на Заходняй Дзвіне, даведацца аб тэндэнцыях эканамічнага і сацыяльнага развіцця.**



На гэты раз сустрэча праходзіла ў фармаце прэс-канферэнцыі **Дзмітрыя Уладзіміравіча ДЗЯМІДАВА.** У ёй прынялі ўдзел таксама прадстаўнікі мясцовых СМІ, у чым ёсць свае перавагі. Бо гарадская прэса чуйна трымае руку на пульсе рэгіёна, і тое, пра што не здагадаецца запытаць сталічны журналіст, не будзе абыдзена ўвагай яго мясцовага калегі. Першым чынам усіх дружна цікавілі вынікі работы за мінулы год і першы квартал 2016-га. (Адразу зазначым, што прывядзём усяго некалькі найбольш характэрных лічбаў.) Летась прамысловы комплекс горада выпусціў прадукцыі ў фактычных цэнах з улікам перапрацаванай давальніцкай сыравіны на 61 трыльён рублёў. Адгружана інавацыйнай прадукцыі на 26 трыльёнаў рублёў. Запасы гатовай прадукцыі на складах на 1 студзеня — 6 працэнтаў ад сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці.

Асвоены новыя рынкі збыту, на экспарт адпраўлена разнастайнай прадукцыі больш чым на 660 мільёнаў долараў, у эканоміку горада прыцягнута каля 5 трыльёнаў рублёў інвестыцый у асноўны капітал. Забяспечаны рост тэмпаў будаўніча-мантажных работ. Асноўныя сферы эканомікі працавалі рэнтабельна. І, бадай, апошняя лічба, якая адлюстроўвае эканамічную сітуацыю ў Наваполацку, — сярэднямесячная зарплата за 2015 год склала 8 мільёнаў 138 тысяч рублёў.

Так што цалкам заслужана Наваполацк па выніках 2015 года занесены на абласную Дошку гонару.

Дастаткова ўстойліва працавала эканоміка горада і ў першым квартале. Тэмп росту экспартных паставак (без уліку нафты і нафтапрадуктаў і пакаштаўнікаў рэспубліканскіх арганізацый) — 128 працэнтаў да ўзроўню мінулага года. Адчувальна павышаецца экспарт паслуг — 122%.

Дзмітрый Дзямідаў падкрэсліў: бадай, найлепшы паказчык, якога мы дасягнулі, — на працягу апошніх чатырох гадоў нараджальнасць у Наваполацку стабільна перавышае 1000 чалавек за год. Паказчык нараджальнасці перавысіў паказчык смяротнасці, і гэта робіць гонар гораду і яго насельніцтву.

Старшыня гарвыканкама не замоўчваў праблем. У прыватнасці, некалькі знізіўся рознічны тавараварот. Затое крыху «падрос» тавараварот у грамадскім харчаванні. Ці ёсць тут нейкая ўстойлівая ўзаемасувязь, пакажа час.

Гаворачы пра развіццё прамысловага комплексу і вызначальную ролю ў вытворчым жыцці горада ААТ «Нафтан», Д. Дзямідаў расказаў пра ход выканання праграмы мадэрнізацыі вытворчых магутнасцяў на гіганце айчыннай нафтахіміі. Толькі за апошні час у ходзе яе выканання асвоена больш за мільярд долараў ЗША, сёлета плануецца ўвод у эксплуатацыю дзвюх новых установак — па вытворчасці вадароду і першаснай перапрацоўцы нафты АТ-8. А на наступны год (з пераходам на 2018-ты) — увод асноўнай па ўсёй праграме мадэрнізацыі ўстаноўкі — замаруджанага каксавання.

Гэта важныя праекты і для горада, бо іх рэалізацыя прывядзе да стварэння новых працоўных месцаў, паляпшэння паказчыкаў перапрацоўкі нафты, павялічыць выхад светлых нафтапрадуктаў да ўзроўню 90 працэнтаў. Наогул мадэрнізацыя нафтахімічнага комплексу, які з'яўляецца стрыжнем эканомікі горада, задумана як працэс пастаянны, бесперапынны, паэтапны.

Што датычыцца узаемаадносін гарадскіх улад з прыватным сектарам эканомікі (адно з пытанняў ад «Звязды»), то, як падкрэсліў Дзямідаў, «мы не падзяляем дзяржаўны і прыватны сектары эканомікі. Прыватны бізнес размяшчае свой капітал там, дзе адчувае сябе ўпэўнена, гэта аксіёма. Свае ўзаемаадносіны будуем так, каб стварыць атмасферу даверу, наладзіць ім максімальныя ўмовы для дзейнасці. Тым, хто гатовы сумленна і адкрыта працаваць, прадастаўляюцца ўмовы для функцыянавання. У тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам. Яшчэ і таму, што падаткі, якія плацяць прадпрыемствы малога і сярэдняга бізнесу, застаюцца ў горадзе. Доля гэтых плацельшчыкаў складае каля 25 працэнтаў гарадскога бюджэту, а гэта важкі ўнёсак.

У першым квартале зарэгістравана 14 новых прадпрыемстваў прыватнага сектара эканомікі, яны пачалі сваю дзейнасць».

Што вельмі важна — працягвае развівацца сацыяльная сфера. Адказваючы яшчэ на адно пытанне карэспандэнта «Звязды», Дзмітрый Дзямідаў паведаміў:

— Найбольш значны падзеяй 2015 года ў гэтым сэнсе быў увод у эксплуатацыю першай чаргі знакавага аб'екта «Дзіцячы сад — пачатковая школа» ў новым мікраёне, што дазволіла знясць вастрыню даволі адчувальнай праблемы забяспечанасці насельніцтва месцамі ў садках. Другім этапам стане пуск другой часткі аб'екта — школы, і тут горад разлічвае на падтрымку абласнога бюджэту. Сацыяльная сфера «прырасла» таксама палацам воднага спорту, хутка распачнуцца работы па рамонце басейна. Працягваецца рэканструкцыя гарадской бальніцы з пераабсталяваннем часткі плошчаў пад ангеаграфічную аперацыйную, а ў перспектыве — устаноўка найноўшага дыягнастычнага абсталявання, у прыватнасці камп'ютарнага тамографа.

Ён не ўтойваў сваёй заклапочанасці дэфіцытам гарадскога бюджэту. У выніку пад пагрозай апыняліся шэраг гарадскіх праграм. «Мы хацелі б больш узвесці жылля, хутчэй завяршыць будаўніцтва школы, палігона бытавых адходаў і гэтак далей. Планы давodзіцца карэкціраваць. Але тым не менш усе свае абавязацельствы па сацыяльных пытаннях выконваем».

Першачарговая задача ў сённяшняй эканамічнай сітуацыі — стварэнне новых працоўных месцаў. За мінулы год іх дадалося каля 690, і лічба гэта немалая. Тым не менш сітуацыя няпростая. Значная колькасць тых, хто прыходзіць на асабісты прыём, просяць дапамогі ў працаўладкаванні. Перспектывы ў гэтым сэнсе горад звязвае, у прыватнасці, з далейшым развіццём лёгкай прамысловасці ў рэгіёне, пашырэннем гандлёвай сеткі і адкрыццём новых прадпрыемстваў. У рабочых планах — стварэнне 555 дадатковых рабочых месцаў. За першы квартал адкрыта 83.

Дзмітрый Дзямідаў адказаў і на пытанне аб працаўладкаванні моладзі. «Забяспечыць маладога чалавека першым працоўным месцам — гэта святы наш абавязак, — падкрэсліў ён. — Аналіз мінулага года паказвае, што з задачай спраўляемся. Тыя, хто навучаўся за кошт бюджэту, практычна ўсе забяспечаны першым рабочым месцам».



Журналісты пацікавіліся сітуацыяй, у якой зараз знаходзіцца мясцовы будаўнічы трэст № 16. А яна, як і наогул у будаўнічай галіне, досыць няпростая, бо характарызуецца скарачэннем будаўніча-мантажных работ у краіне, адсутнасцю дастатковых аб'ёмаў заказаў у рэгіёне і адсюль — пэўным дэфіцытам фінансавання. Кіраўнік мясцовай вертыкалі бачыць выйсце ў настойлівым пошуку новых аб'ёмаў будаўнічых работ. Сёлета трэст вядзе будаўніцтва ў горадзе на чатырох жылых дамах, што для паўтаратысячнага калектыву яўна недастаткова. Але кіраўніцтва трэста актыўна ўдзельнічае ў тэндарах, якія аб'яўляюцца ў краіне, у выніку заключаны дагаворы на суму звыш за мільярд рублёў.

Гаворка на сустрэчы была шматпланавай, ішла таксама аб рэфармаванні гарадской сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, аб прымяненні так званых пілотных формаў фінансавання сістэмы адукацыі (галіна, як вядома, вельмі затратная, на яе выдзяляецца звыш 30 працэнтаў гарадскога бюджэту, і патрэбна, каб сродкі працавалі максімальна эфектыўна).

Летась Савет Міністраў зацвердзіў генеральны план развіцця Наваполацка. Абапіраючыся на гэты дакумент, Д. Дзямідаў падзяліўся сваім бачаннем блізкіх перспектыў горада. Ён будзе больш буйным па тэрыторыі, уключыць у свае межы Баравуху-1 і некалькі іншых населеных пунктаў, пачне перасяляцца на правы бераг Заходняй Дзвіны, каб у далейшым развівацца менавіта ў гэтым кірунку. Працягнецца мадэрнізацыя нафтахімічнага комплексу, з'явяцца новыя вытворчасці — без дадатковай нагрузкі на экалогію. Атрымае развіццё гарадскі электрычны транспарт — трамвай.

Гэта будзе новы імклівы віток у развіцці горада, чыя гісторыя пачыналася з той самай першай палаткі, стваральны дух якой жыве і сёння.

# «Чысціня Наваполацка — ДЛЯ НАС СВЯТОЕ»

## Суразмоўца карэспандэнта «Звязды» — дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Наваполацкая спецаўтабаза» Юрый ШЫПКІН





Работніцы Марыя БАГДАНОВІЧ і Аксана СІНІЦКАЯ — адны з тых, хто даглядае шматлікія клумбы на вуліцах горада.

**— Не бачыліся з вамі роўна год, Юрый Аляксандравіч. Што за гэты час з'явілася новага?**

— Самае галоўнае — мы захавалі калектыў. Ніхто не згубіўся, ніводзін чалавек не застаўся без работы. Людзі своечасова атрымліваюць зарплату і кормяць свае сем'і. Гэта для мяне як кіраўніка самае важнае.

Як выжываем у новых для сябе ўмовах? Актыўна шукаем работу, і не толькі непасрэдна звязаную з нашымі функцыямі, але і ў іншых арганізацыях. У нас для гэтага магчымасцяў дастаткова — і тэхнікі, і ўмелых рук.

Узяць хоць бы такі прыклад: наша разметачная машына — ледзьве не адна на два буйныя гарады. Канешне, перш за ўсё патрэбна прывесці ў парадак свой горад, але па дагаворах дапамагаем і суседзям. У нас пастаянна просяць той жа вялікі прамысловы пыласос. Выпісвалі яму «камандзіроўку» нават у Верхнядзвінск, калі горад рыхтаваўся адзначыць майскія святы. Адным словам, дапамагаем калегам-камунальнікам, за невялікія грошы.

Сёлета будзе шмат высадкі кветак. Купілі расаду, каб высадзіць на плошчы, на самы пачатак, бо сваіх ранніх кветак няма. А так для горада ў нас вырашчана багата сваёй расады. Хопіць на ўсе клумбы, на ўсе кветнікі і для іх упэўненага падтрымання на працягу сезона, скажам так.

Тое, што вёсцы дастаецца танна, — азеляненне, гораду каштуе вялікай працы. У нас для гэтага ёсць парнікі, працуюць два майстры — спецыялісты па азеляненні, плюс у вытворча-тэхнічным аддзеле ёсць інжынер, яна закончыла сельскагаспадарчую акадэмію па ландшафтным будаўніцтве і цалкам курыруе азеляненне. Чалавеку даручана, і яна ахвотна гэтым займаецца, бо па сваёй натуры працаўніца.

Як і ўсе ў калектыве. Вось чаму ў нас няма ніводнай свабоднай машыны, нават старэнькай, яны ўсе занятыя. Знаходзім для іх работу. Дарэчы сказаць, імкнёмся па магчымасці абнаўляць парк сваіх машын.

Азеляненне — сапраўды працаёмкая работа, не так проста высадзіць сотні тысяч адзінак расады. Яна маленькая, у формачках, і за ёю трэба глядзець ды глядзець. Нагрузка на жанчын, а іх працуе каля 18 чалавек, вялікая. Стараюцца, і гэтым сваім участкам я вельмі задаволены.

Не адстаюць хлопцы з брыгады, якая абкошвае тэрыторыі, абразае дрэвы, фарміруе кроны, і яны таксама глядзяць за парадкам ва ўсім горадзе.

Нармальна працуе невялікі калектыў нашага асфальтавага завода, тэхніка там свая — асфальтаўкладчыкі, каткі, перавозчыкі. Вырабляем і ўкладваем асфальт самі. Стараемся нікому не перазаказваць, не браць у арэнду машыны і механізмы, а зарабляць грошы сваёй тэхнікай.

Скажам, наша ЦЭЦ вядзе раскопкі па горадзе, і «залатваем» за імі месцы раскопак толькі мы. «Аднаўляе» твар горада брыгада па рамонце дарожнага пакрыцця і ўкладцы асфальту.

Ёсць участак санітарнай уборкі, дзе няма «абязлічкі» — у кожнага свой «надзел», за кожным замацаваны і прыпынечны пункт грамадскага транспарту. Аб'ёмы таксама значныя, і выручае механізацыя. Без машын і механізмаў зімой снег не ўбярэш. Тым больш што пераважаюць тут жанчыны. Летась купілі два камбінаваныя машынныя агрэгаты. Летам на іх ставім палівальныя ўстаноўкі, а зімой — пескаструменныя раскідвальнікі з плугам. Без механізацыі зараз нікуды.



Рабочы Аляксей ШВЕД.

Дзякуй кіраўніцтву горада і фінаддзелу, яны дапамагаюць нам вырашаць пытанні тэхнічнай узброенасці. Так, гэтыя дзве машыны мы ўзялі ў лізінг. Але да таго яны дапамаглі нам купіць і падмятальна-ўборачную машыну «Магістраль», і два МАЗы з прычэпамі.

Мы ў сваю чаргу стараемся горад не падводзіць. Добраўпарадкаванне, уборка тэрыторый — усё гэта святое для нас. Магчыма, недзе на іншай рабоце можна і схалтурыць, і ніхто не зверне ўвагі. А ў нас усё навідавоку.

Юрый Аляксандравіч цікавіцца нашай думкай наконт таго, ці чыстым здаўся нам, новым людзям, Наваполацк. Супакойваем яго: горад і чысты, дагледжаны, і прыгожы. Безумоўна, чысты. Дырэктар просіць мець на ўвазе: гэта ж якая праца ўкладзена! І мы з ім згаджаемся. Бо бываем у Наваполацку даволі часта і пераканаліся, што чыстыя вуліцы — гэта яго візітная картка.

— Як вы ведаеце, мы адказваем і за асвятленне горада, — працягвае дырэктар. Пытаемся ў яго:

**— Тэндэнцыя дастатковай асветленасці вуліц не канфліктуе з заклікамі да эканоміі?**

— У нас гэтыя працэсы аўтаматызаваныя, на ўсіх вуліцах стаяць спецыяльныя шафы кіравання. І калі наступаюць прыцемкі, аўтаматыка ўключае лямпачкі. А ў начны час змяншаецца падача электраэнергіі. Такім чынам дасягаецца эканомія.

На новых участках стараемся ставіць энергазберагальныя свяцільнікі.

Спецыялісты ў нас моцныя, таму смела бралі заказ і манціравалі трансфарматарную падстанцыю ў новым мікраёне па дамове з мантажным трэстам, нашай работай яны засталіся задаволеныя, зараз вядзём перамовы на будучае.

Выконваем па замове электрафізічныя вымярэнні — амаль ва ўсім горадзе. У Полацку выканалі мантаж асвятлення для прываказальнай плошчы. Не адмаўляемся ні ад якой самай малой магчымасці. Возьмеш малое — знойдзеш вялікае, такі прынцып. Гэтую магчымасць я як кіраўнік павінен выкарыстаць у інтарэсах сваіх людзей. Будзеш ганяцца за адным толькі вялікім — згубіш і малое.

**— На чым робіце акцэнт у рабоце, Юрый Аляксандравіч? Самае для вас важнае — гэта што?**

— Самае важнае — чалавек з усімі яго клопатамі. Ці то дворнік, ці то інжынер — у сваёй сям'і гаспадар, паважаны чалавек. Там яго любяць і цэняць. Гэтак жа павінны яго паважаць і цаніць і за працу. Канешне, калі заслугоўвае. А каб заслугоўваў, мы павінны прадаставіць яму ўсе ўмовы.

Так што з сваіх работнікаў імкнёмся бачыць перш за ўсё людзей, асобу. І ўпэўнены, гэта адзіна правільны падыход.

УНП 391487274

# ПРЫСАДКІ — ПАНАЦЭЯ ДЛЯ РУХАВІКА

**Карэспандэнт «Звязды» гутарыць з генеральным дырэктарам СТАА «ЛЛК-НАФТАН» Міхаілам БАБУШКІНЫМ**

**— Сумеснаму прадпрыемству — дзесяць гадоў. Добрая нагода ўспомніць, як нараджаўся калектыў.**

— Пачыналася ўсё ў 2006 годзе ў даволі складаных умовах. Вытворчасць прысадак на «Нафтане» на той момант прыходзіла ў заняпад, бо з распадам Савецкага Саюза парушыліся эканамічныя сувязі паміж былымі саюзнымі рэспублікамі, навуковымі інстытутамі і вытворцамі. На рынак хлынулі замежныя прадукты, у асноўным англійскіх і амерыканскіх кампаній. Тым не менш вытворчасць прысадак на «Нафтане» была захавана, высокапрадукцыйнае абсталяванне і кваліфікаваныя кадры таксама.



Аператарная цэха. За вытворчымі працэсамі сочыць аператар Сяргей ГЛІНСКІ.

Фактычна ў гэты ж час знакаміты «Лукойл» выдзеліў масленую вытворчасць у асобную структуру «ЛЛК Інтэрнэшнл», і яна пачала шукаць шляхі павышэння эфектыўнасці бізнесу. Адной з такіх магчымасцяў і бачылася стварэнне сумеснага прадпрыемства разам з «Нафтанам». Бо не сакрэт, што калі вытворца масел мае і адладжаную вытворчасць прысадак, гэта дае канкурэнтныя перавагі на рынку. Такім чынам, пасля правядзення разнабаковых кансультацый адбылася сустрэча Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі з прэзідэнтам «Лукойла» Вагітам Алікперавым, у ходзе якой і прынялі рашэнне аб стварэнні сумеснага прадпрыемства. Быў падпісаны адпаведны ўказ кіраўніком дзяржавы, і ў 2006 годзе наша прадпрыемства пачало функцыянаваць.

Пачалі з укаранення новых тэхналогій і абнаўлення асартыменту. Спрацавалі аператыўна, і ўсё атрымалася — з першых жа месяцаў існавання на паток паставілі новую канкурэнтаздольную прадукцыю. Спачатку больш простыя і масавыя яе віды, на якія існаваў попыт на рынку: маслы так званай ДАСТаўскай групы. Заробленыя грошы дазволілі нам развівацца і рухацца ад простага да больш складанага. Тага, чым займаемся зараз.

Сёння ёсць шэраг вытворчасцяў, як наша, у Расіі, але калі параўноўваць з намі, то мы ў адным кулаку сабралі ўсё і на сённяшні дзень выйшлі на такія аб'ёмы, на якія канкурэнты ў Расійскай Федэрацыі могуць толькі марыць.

Апошні час трымаем планку ў 20 тысяч тон прысадак за год. Гэта вялікая колькасць для рэгіёна. Такі іх аб'ём не патрэбен сёння ні Беларусі, ні Расіі, ні разам узятым краінам Мытнага саюза. Таму актыўна працуем на знешнія рынкі. І прыярытэтнай задачай з'яўляецца павелічэнне долі продажу на знешніх рынках, каб зарабляць валюту для краіны і ўласнага развіцця. У нас рэгулярна на экспарт ідзе 95 працэнтаў прадукцыі, з яе больш за палову — у краіны далёкага замежжа. Дзякуючы актыўнай маркетынгавай палітыцы, пастаяннаму ўдзелу ў разнастайных канферэнцыях (адна з іх толькі што завяршылася ў Іране) сёння нас усё больш ведаюць у свеце. Колькасць краін, у якія пастаўляем прадукцыю, перавысіла 20.

**— Патлумачым для чытача, што такое прысадкі.**

— Складаныя хімічныя злучэнні, якія надаюць змазачным маслам, ды і паліву, тыя эксплуатацыйныя ўласцівасці, дзякуючы якім сёння масла выконвае ў рухавіках унутранага згарання свае функцыі. Удакладнім: прысадкі нясуць антыакісляльныя функцыі, мыйныя функцыі, выконваюць супрацьзносавыя і антыкаразійныя задачы. Гэта галоўны абаронца рухавіка, яго паверхні, яны працягваюць тэрмін жыцця масел, што актуальна. Пакет прысадак уплывае і на прыродаахоўную бяспечнасць рухавіка ў цэлым, бо вырашаецца задача зніжэння выкідаў.



Прэзідэнт ААТ «Лукойл» Вагіт АЛІКПЕРАЎ уручае Ганаровую грамату Міхаілу БАБУШКІНУ за ўклад у развіццё славутай кампаніі.

**— Раскажыце, калі ласка, пра навінкі свая вытворчасці.**

— Галіновая навука ў свой час папрацавала настолькі старанна, што новыя тыпы прысадак не з'яўляюцца, нейкай патрэбы ў іх няма. Сёння ідзе стварэнне ў асноўным новых мадыфікацый альбо вырашаецца задача надання змазачным маслам і матэрыялам нейкіх спецыяльных уласцівасцяў у адпаведнасці з патрабаваннямі, скажам, прыродаахоўнага заканадаўства. Напрыклад, пастаянна мадыфікуюцца пакеты прысадак, якія прызначаюцца для маторных масел аўтамабільнай тэхнікі. І сёння з'явілася новая мода: спажывец хоча бачыць светлае, празрыстае масла. Раней на колер ніхто не звяртаў увагі. У выніку новых нейкіх уласцівасцяў дабаўлена фактычна не было, але пытанне колеру вырашылі.

Сучасныя рухавікі пачынаюць працаваць у іншых, чым раней, больш жорсткіх умовах, у больш высокім хуткасным рэжыме. Таму змяніліся патрабаванні і да змазачных матэрыялаў. Сур'ёзная ўвага ўдзяляецца высокатэмпературным антыакісляльным уласцівасцям.

**— Міхаіл Алегавіч, ці ёсць свае, уласныя рэцэптуры прысадак, тэхналогіі іх атрымання?**

— Усе тэхналогіі і рэцэптуры нашы, уласныя. Яшчэ і таму, што і адно, і другое ахоўваюцца ў свеце дастаткова сур'ёзна, нідзе не падгледзіш. Пошук з самага пачатку вялі самастойна, абапіраючыся найперш на навуковы патэнцыял, які на той час захаваўся. Гэта інстытут «МАСМА» ў Кіеве, а таксама Усерасійскі навукова-даследчы інстытут УНДІНП у Маскве і Расійскі дзяржаўны інстытут нафты і газу імя Губкіна.

Яшчэ адной крыніцай ідэй з'яўляецца ўласная навукова-даследчая лабараторыя. Задачы распрацоўкі тэхналогій, іх карэкціроўкі, ацэнкі альтэрнатыўных крыніц сыравіны ўскладзены на яе.

Лабараторыя мае абсталяванне для сінтэзу і ацэнкі ўсяго, што робіцца па карэкціроўцы тэхналогій. Такое абсталяванне не мае аналагаў у Расійскай Федэрацыі. Скажам, японскі прыбор «Гарачая труба», які ацэньвае высокатэмпературныя ўласцівасці судновых масел пры 350 градусах.

З кожнай партыі прысадкі рыхтуем узор масла, ён праходзіць тэсціраванне на высокадакладных сучасных прыборах, і толькі пасля гэтага партыя адгружаецца спажыўцу. Кантроль зноў жа вядзецца такімі метадамі, якіх больш ні ў кого няма.

Абавязковая ўмова — сертыфікацыя прадукцыі на адпаведнасць масел з прысадкамі сусветным стандартам. Акрамя таго, мы атрымліваем допускі і адабрэнне на прымяненне нашай прадукцыі ад асноўных вытворцаў тэхнікі ў Расійскай Федэрацыі — а гэта «КамАЗ», «АўтаВАЗ», Яраслаўскі завод рухавікоў. Сертыфікавана па ўсіх сучасных сістэмах ацэнкі якасці і само наша прадпрыемства.

Што тычыцца экспартных праектаў, то судновыя маслы з прымяненнем нашых прысадак атрымліваюць з дапамогай «Лукойла» адабрэнне асноўных сусветных вытворцаў судновых рухавікоў. Сёння ў рабоце сумесныя з «Лукойлам» праекты па стварэнні новых рэцэптур масел і іх выпрабаваннях у еўрапейскіх і амерыканскіх выпрабавальных цэнтрах.

Як вы зразумелі, мы працуем у цеснай супольнасці з кампаніяй «Лукойл», якая мае сваю навуковую базу, і з нашым фундаментам з расійскага боку — «ЛЛК Інтэрнэшнл». Прыкладам можа з'яўляцца тая ж праграма для суднаў, якая сёння вельмі актыўна развіваецца. Судновыя маслы «Лукойла» рэалізуюцца ў партах па ўсім свеце, і мы ганарымся, што ў гэтых маслах выкарыстоўваюцца прысадкі сумеснага прадпрыемства. У гэтым выпадку генеральным распрацоўшчыкам тэхналогіі судновай прысадкі выступіў «Лукойл», мы аказвалі ўсялякае садзейнічанне.

Па аўтамабільным напрамку, па цеплавозных маслах выкарыстоўваем тэхналогіі і рэцэптуры цалкам нашага прадпрыемства.

УНП 390401182

# Няма Луўра, але ёсць Сафійскі сабор





**Навіна для вандроўнага люду: у горадзе над Заходняй Дзвіной у пачатку года адбылося аб'яднанне дзвюх гасцініц — «Беларусь» і «Нафтан» у адзіны гасцінічны комплекс «Наваполацк». Аб падрабязнасцях распытваем яго дырэктара Наталлю ПАЛЯКОВУ.**

**— Якая ставілася мэта, калі аб'ядноўвалі дзве гасцініцы?**

— Думаю, што прычыны насілі перш за ўсё эканамічны характар. У выніку атрымалі цалкам упраўляемы калектыў пры нераздзьмутых штатах. І з'явілася магчымасць для чыста гаспадарчага манеўру. Просты прыклад: зараз пачаўся сезон адключэння гарачай вады. У «Нафтане» яе сёння няма, а ў «Беларусі» ёсць. І мы імкнёмся ўсіх гасцей горада максімальна сяліць у «Беларусі». Калі б гэта па-ранейшаму былі дзве асобныя гасцініцы, дамаўляцца было б складана, бо заўсёды ідзе "перацягванне каната".

І потым, у розных кліентаў розныя запатрабаванні. Адным пажадана пасяліцца ў цэнтры горада, бліжэй да гарвыканкама, каб аператыўна вырашаць рабочыя пытанні. Іншым падабаецца, калі больш зеляніны і цішыні. Нашы адміністратары, калі прымаюць заяўкі, карэктна цікавяцца такімі абставінамі.

Так што аб'яднанне праведзена, можна сказаць, перш за ўсё ў інтарэсах кліентаў, чые патрэбы мы можам цяпер задаволіць максімальна.

А калі гаварыць пра эканоміку, то адна наша будаўнічая брыгада абслугоўвае дзве гасцініцы. Патрэбы ў частай бялізне забяспечвае агульны пральны комплекс. На такіх простых прыкладах ужо сёння відаць, што эканоміка будзе ў выйгрышы.

**— І ўсё ж галоўная задача — прадастаўленне гасцінічных паслуг высокага класа.**

— Такія паслугі ў гарадах-суседзях можа аказаць толькі наш комплекс. У рэгіёне прайшлі сертыфікацыю толькі мы. «Беларусь» мае дзве зоркі, «Нафтан» — тры. (Жартуем, што ў выніку гасцінічны комплекс — пяцізоркавы.) А гэта — пэўная адказнасць. Мы павінны аказваць паслугі дастаткова высокай якасці. Ёсць стандарты — і па абслугоўванні, і па прыборцы, па дадатковых паслугах, і іх патрэбна вытрымліваць.



**— Ці можа сучасны гасцінічны комплекс павялічыць прыцягальнасць рэгіёна ў вачах тых жа турыстаў, дзелавых людзей?**

— Безумоўна, можа. Калі мець на ўвазе гасцінічны бізнес, то вялікае значэнне мае месца знаходжання гасцініцы. У нас няма Луўра, Эрмітажа, але ёсць Сафійскі сабор. Ёсць святая наша гісторыя, якая пачалася на полацкай зямлі, пайшла ад Полацкага княства. І мы павінны пра гэта гаварыць, расказваць сваім кліентам, перш за ўсё турыстам, папулярызаваць сваю багатую зямлю.

Наваполацк найперш буйны прамысловы цэнтр, а яшчэ адзін са спартыўных цэнтраў Беларусі і Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, бо тут праводзіцца вельмі шмат спартыўных мерапрыемстваў. Нашы пастаянныя госці — хакейныя каманды і футбольныя клубы з блізкага і далёкага замежжа. А таксама воднalыжнікі. Штогод праходзіць папулярны конкурс дзіцячай песні. І калі горад праводзіць такія маштабныя мерапрыемствы, мы мусім працаваць значна больш, бо нам ёсць што паказаць.

Можам прадаставіць паслугі і для паломнікаў, якія наведваюць нашы мясціны. Шмат праводзіцца форумаў, выставак. Можна сказаць, з нашым непасрэдным удзелам.

**— А хто ў апошні час бывае часцей у вас у гасцях?**

— Тыя ж спартсмены. А з турыстаў — расіяне, палякі, чэхі. Пастаянна, можна сказаць, у нас жывуць спецыялісты з Іспаніі і Партугаліі, якія прыехалі на нашы прамысловыя прадпрыемствы па справах бізнесу. Людзі знаходзяцца ў нас працяглы перыяд, што накладвае на персанал гасцініцы пэўныя абавязкі, бо госці павінны адчуваць сябе як дома.

**— А для замежных вашых кліентаў стварaюцца нейкія асаблівыя ўмовы, ці як для ўсіх?**

— Я адказала б так: для ўсіх сваіх гасцей ствараем умовы, як для замежных. Каб усім было камфортна і цана не абцяжарвала. Дзесяць-пятнаццаць долараў у суткі за асобны нумар — гэта не назавеш дарагавізнай. А ўсе нумары камфортныя, і кожны выбірае большы ці меншы.

Мы гатовы да таго, што госці папросяць у нас і паслугі гіда. Прынялі ў штат агента па турызме, які будзе супрацоўнічаць з турыстычнымі арганізацыямі, займацца ўязным турызмам.

У нас усе адміністратары свабодна размаўляюць на англійскай і нямецкай мовах. Вядзецца навучанне кадраў. Распрацавана палажэнне па якасці нашых паслуг, імкнёмся, каб гэты дакумент выконваўся.

Накіроўваем пісьмы ў гарады-пабрацімы Наваполацка, у якіх паведамляем, што гатовы забяспечыць пражыванне і экскурсійныя турамі па горадзе, а калі будзе зацікаўленасць, то і па рэгіёне.

Комплекс у нас малады, дзейнічае ўсяго чатыры месяцы, але планы існуюць цікавыя. Як па асноўнай дзейнасці, пашырэнні паслуг, так і па дадатковых відах дзейнасці, па ўязным турызме. Пачынаючы ад рамонту адзення, для чаго адкрываем міні-майстэрню, і да пракату веласіпедаў і парасонаў. Людзі знаходзяцца ўдалечыні ад дома, і наш клопат пра іх будзе дарэчы.

У хуткім часе з'явіцца свой Wi-Fi, пашыраем сетку тэлевізійных каналаў, якія свабодна прымаюцца з нумароў.

**— Калі ласка, Наталля Рыгораўна, спыніцеся больш падрабязна на дадатковых паслугах.**

— Гэта і захоўванне багажу, каштоўных рэчаў у сейфе, паслугі факса, дастаўка прадуктаў і лекаў, мінеральнай вады, газет, выклік таксі, мыццё і прасаванне асабістай бялізны, падагрэў ежы ў мікрахвалевай печы і шмат чаго іншага.

Неўзабаве адкрыем більярдную залу ў холе першага паверха, узводзім дзве альтанкі на вуліцы, бо двор вельмі зялёны і прыемна спусціцца з нумара, каб падыхаць.

**— У вас на тэрыторыі можна сустрэць людзей у спяцоўках будаўнікоў.**

— Ідзе капітальны рамонт рэстарана, адкрыццё запланавалі да Дня горада. І вядуцца работы па бягучым рамонце — з заменай сістэмы ацяплення, рамонтам даху і фасада, заменай часткі вокнаў. І гасцініца стане яшчэ больш прывабнай. Усё гэта робіцца вельмі акуратна, каб не ствараць нязручнасці жыльцам.

Дарэчы, хачу сказаць шчыры дзякуй кіраўніцтву ААТ «Нафтан» за тое, што выдзелілі сродкі для прывядзення гасцініцы ў належны выгляд і ўмацавання яе матэрыяльна-тэхнічнай базы.

І, бадай, апошняе. У сярэдзіне мая гасцініца «Нафтан» уключана ў сістэму міжнароднага браніравання booking.com і там зараз пра нас ёсць уся карысная інфармацыя. А гэта заўсёды дадае кліентаў. Завяршаем работу над больш дасканалым сайтам.

Так што, запрашаем у госці ў Наваполацк. Забяспечым і жыллём, і паслугамі.

**Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

УНП 391487312

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 20 (320)

■ Падзея месяца

## Работы Валянціна ГУБАРАВА выстаўлены на гарадской плошчы Мінска

# ПРАФЕСІЙНАЕ МАСТАЦТВА НА ВУЛІЦЫ



Вулянцін ГУБАРАЎ.
Позні класіцызм правінцыяльнага быцця.
Палатно, алей. 2015.

**Штогадовую выстаўку «Мастак і горад», якая экспануецца на плошчы Якуба Коласа ў сталіцы, наведвае больш як два мільёны гледачоў. Папулярная форма дапамагае прафесійнаму мастацтву выйсці на гарадскую адкрытую прастору, стаць больш даступным, вядомым і зразумелым масаваму гледачу. 26 мая выстаўка адкрылася чарговы — пяты — раз і прадставіла рэпрадукцыі трыццаці карцін Валянціна Губарава, вядомага далёка за межамі нашай краіны.**

Яго работы можна ўбачыць у музеі Zimmerly Art Museum у ЗША, Schaer und Wildbolz у Швейцарыі, Kunststuck у Германіі, у галерэі Les Tournesols у Францыі, знайсці ў прыватных калекцыях Германіі, Англіі, Іспаніі, Японіі, Ізраіля, Германіі, Расіі, ЗША... Нават знаёмыя з іншых краін з захапленнем пісалі мне пра «майго суайчынніка» Валянціна Губарава.

Яго стыль характарызуюць як наіўнае мастацтва, на яго карцінах чалавек постсавецкай прасторы бачыць знаёмы матэрыяльны свет і разумее блізкую філасофію. Гэтыя сэнсы прыходзяцца даспадобы гледачам па ўсім свеце. Можа, французы не маюць дачынення да нашых невялікіх правінцыйных гарадоў, але незнаёмы ў рэальнасці антураж не перашкаджае ўспрымаць гэты жывапіс як жывапіс сэнсаў. Напэўна, таму ў французскай галерэі Les Tournesols карціны Валянціна Губарава знаходзяцца ўжо больш як дваццаць гадоў.

**«Я хацеў быць падобным на наіўнага мастака, якога вучонасць яшчэ не сапсавала. Што цяжка, бо азначае непасрэднае ўспрыманне свету».**

Выстаўка «Мастак і горад» пазнаёміць два мільёны чалавек (упершыню альбо бліжэй) з яркімі карцінамі, можна сказаць, сусветна вядомага беларуса. Апроч плошчы Якуба Коласа выстаўка карцін Губарава да 18 чэрвеня працуе ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў.

Праект «Мастак і горад» за мінулыя гады ўжо паказаў Марка Шагала, Казіміра Малевіча, беларускага сюррэаліста Мікалая Селешчука, асобную выстаўку нашых авангардыстаў. Арганізатары адзначылі, што нават актаў вандалізму ў дачыненні да экспанатаў ужо не назіраецца. Можна лічыць, культурнае выхаванне працуе.

Сам Валянцін Губараў разважае:

— Мне гэта ўсё больш і больш падабаецца. Спачатку я паставіўся да ідэі іранічна, але разумею: мастацтва выходзіць з музеяў насустрач народу. Я адчуваю важнасць гэтага праекта і ўжо бачу: мой удзел у выстаўцы трапіць у лік таго, чым я ганаруся, чаго не так шмат. Можа быць, прадстаўленнем маёй творчасці на міжнароднай выстаўцы «Экспа» ў Шанхаі — за маёй спінай усё ж такі было мастацтва Беларусі. Я ганаруся тым, што мае работы былі выстаўлены на аўкцыёне «Крысціс» у Лондане і адна з карцін нават трапіла на вокладку каталога. Ганаруся тым, што за дваццаць гадоў прывучыў французаў пазнаваць і цікавіцца нашай краінай. Яна была для іх экзотыкай, а зараз яны больш чытаюць і даведваюцца пра яе. Мне здаецца, я нават магу лічыцца пазаштатным супрацоўнікам Міністэрства замежных спраў. У гэтым выпадку я ганаруся тым, што мае работы выбралі для пятага — юбілейнага — праекта «Мастак і горад».

***— Калі ваш стыль ахарактарызавалі як наіўнае мастацтва, вы ўсміхнуліся. Вы з такой фармуліроўкай не згодны?***

— Я б удакладніў: прафесійны наіў. Таму што наіўнага — а я захапляюся чыстым мастацтвам — нельга дамагчыся. Акадэмічная адукацыя вісіць быццам кайданы, якары, а сапраўдны наіўны мастак ад гэтага вызвалены. Хоць чыстага мастацтва ў гэтым сэнсе няма, таму што ўсе хочуць — і хацелі ў XVII, XVIII, XIX стагоддзях — пісаць творы, падобныя на вучонае мастацтва. А я хацеў быць падобным на наіўнага мастака, якога вучонасць яшчэ не сапсавала. Што таксама цяжка, бо гэта азначае непасрэднае ўспрыманне свету. Мой жывапіс называюць наіўным, хоць любы іншы скажа: відаць, што ты, стары, вучыўся.

***— А да параўнання з Брэйгелем як вы ставіцеся?***

— Памятаю, у Францыі выйшаў артыкул пад назвай «Беларускі Брэйгель». Напэўна, я гэта сказаў нашым журналістам і выраз «пайшоў». Брэйгель — цудоўны мастак, усё ж такі мяне не назвалі кім-небудзь невядомым (усміхаецца. — **Аўт.**). Няхай. Канешне, можна знайсці штосьці агульнае — дальнія планы, напрыклад. Быў бы я мастаком сапраўдным — пісаў бы свае карціны ў шызай смузе. А я рысую, як наіўны аўтар — нейкія дробязі, насычанне людзьмі, жывёламі, калі браць Брэйгеля.

***— Вашы персанажы — пэўныя архетыпы альбо канкрэтныя людзі?***

— Не, не канкрэтныя. Я проста разбіраюся ў людзях. Калі гляджу «Давай ажэнімся», адразу магу сказаць, ці падыходзяць героі адзін аднаму, ці будуць яны жыць разам. Бачу добрых людзей, дзякуй богу, яны мяне акружаюць. Калі з некім сустракаюся, я ўжо проста люблю гэтага чалавека і хочацца зрабіць для яго нешта добрае. Раз — сфатаграфую, устаўлю здымак у рамачку і пры наступнай сустрэчы прэзентую.

***— Матэрыяльны свет вашых карцін можа зразумець чалавек толькі постсавецкай прасторы. Як ён успрымаецца за мяжой?***

— Шмат чаго не разумеюць, але што рабіць — мы таксама не ўспрымаем нешта з іншых культур. Галоўнае — гледача дастае добрая, станоўчая энергетыка.

Выстаўка «Мастак і горад» на плошчы Якуба Коласа працягваецца да 10 верасня.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Закуліссе

# ОПЕРНЫ ЗДЫМАЕ МАСКІ

## Дзень адчыненых дзвярэй прайшоў у Вялікім



Рэквізіт і касцюмы — у вольным доступе.

**Аргенцінскі Буэнас-Айрэс ці астравок Прочыда на поўдні Італіі нагадваў Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь на днях — з-за маляўнічасці, наслення гукаў і фарбаў, наплыву гасцей. Што адбываецца? Дзень адчыненых дзвярэй, прымеркаваны да дня нараджэння тэатра, 25 мая прайшоў у Вялікім ужо другі раз. 83 гады — узрост немаленькі. А юнацкага запалу яшчэ хоць адбаўляй.**

Колькі пражэктараў асвятляюць спектаклі? Чаму тканіна для стварэння заслоны вымяраецца ў... кіламетрах? Хто кіруе рухам дэкарацый? Музыкай з балета «Лебядзінае возера» ўрачыста стартаваў час адказаў на ўсе пытанні.

Для дзяцей гэты дзень стаў такім жа моцным па адчуваннях, як, напэўна, быў бы, калі трапіць у Залюстроўе Кэрала. Калі яшчэ ёсць магчымасць спакойна зазірнуць за кулісы, сузіраючы невераґодны рэквізіт і дэкарацыі, паслухаць урокі вакалу і пастаяць за станком, як балерына? 21 экскурсавод (на сем больш, чым мінулы раз) расказвалі пра гісторыю, таямніцы, цікавыя дробязі тэатральных будняў.

Пяць гадзін і тры тысячы дзвярэй. Схаваныя на самым версе і ў нетрах творчыя цэхі. Можна пабываць у аркестравай яме і ўзляцець амаль да столі. А там — гіганцкая люстра вагой амаль паўтары тоны! Летась праз усе куткі опернага прайшлі ледзь не дзве тысячы чалавек, гэтым разам — больш за тры. Генеральны дырэктар Вялікага тэатра Уладзімір Грыдзюшка сказаў, што дзверы не зачыняюцца нават перад тымі, хто не паспеў запісацца ў групу. Такі прынцып.

Людзі прыехалі з усёй Беларусі. Кіраўнік опернага праанансаваў самыя прыкметныя мерапрыемствы, што пройдуць у найбліжэйшы час. Трэці міжнародны фестываль «Балетнае лета ў Вялікім» пройдзе з 11 па 18 чэрвеня, адкрыўшыся прэм'ерай Палада Бюльбюль-аглы «Каханне і смерць» па нацыянальным азербайджанскім эпасе ў пастаноўцы харэографа Вольгі Костэль. Балет пройдзе і другі раз у завяршэнне сезона.



Антоніа Вівальдзі ў выкананні трыа салістаў — скрыпка, флейта і кантрабас.



Што адбываецца ў грымёрцы?

А ўжо з 24 па 26 чэрвеня прагрымяць «Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў» у Нясвіжы.

Адным з самых цікавых пунктаў у праграме дня адчыненых дзвярэй сталі творчыя сустрэчы з галоўнымі людзьмі тэатра ў камернай зале імя Александроўскай, якія доўжыліся аж да самага вечара. Галоўны рэжысёр Міхаіл Панджавідзэ, дырыжор Віктар Пласкіна, кіраўнік балетнай трупы Юрый Траян, мастацкі кіраўнік калектыву «Беларуская капэла» Віктар Скарабагатаў, галоўны хормайстар Ніна Ламановіч — гэты спіс сам па сабе выклікае захапленне. Такая практыка, дарэчы, праходзіць упершыню. Іншых зорак, напрыклад вядучых салістаў, таксама можна было сустрэць падчас выпадковага шпацыру па калідорах альбо ў грымёрцы, на сцэне.

Пазнаваўча было паназіраць, як працуюць тыя, хто стварае вобраз артыстаў, грымёры, а таксама бутафоры. Звычайныя працоўныя дні, твары, якія крыху стаміліся, але ў вачах іскрынкі — у творчай абстаноўцы не засумуеш. Заходзім на Малую сцэну, а там — самая сапраўдная рэпетыцыя... «Вітаўта». Спачатку пастаноўку праганяюць па частках, потым тут жа — цалкам. Рэпетыцыйная зала таксама не пустуе — балерыны адпрацоўваюць свае па з «Сямі прыгажунь».

У харавым класе атрымлівалі асалоду ад Антонія Вівальдзі ў выкананні трыа са скрыпкі, флейты і кантрабаса. А вось салістку Вялікага Таццяну Траццяк было не пазнаць — на некалькі хвілін Лэдзі Макбет, Сюзанна і Аіда ператварыліся ў сціплую, але настойлівую і, бачна, вельмі прафесійную жанчыну-педагога. У яе трэнінг уваходзіла механіка здабывання гукаў — вельмі працаёмкі працэс, які цесна завязаны на ўнутраным стане выканаўцы і ўменні літаральна «жангліраваць» дыхальнымі працэсамі.

> **«Зорак оперы, вядучых салістаў, таксама можна было сустрэць — падчас выпадковага шпацыру па калідорах альбо ў грымёрцы, на сцэне».**

У фае выконвалі песні. Гэта маленькія і юныя артысты з Дзіцячага музычнага тэатра-студыі, якая ўваходзіць у склад опернага, а яго ўдзельнікі і вучацца, і ўдзельнічаюць у пастаноўках. Віктарыны,казачныя інтэрактыўныя спектаклі... Можна было сфатаграфавацца нават каля сакуры, з веерам або ў шапцы Манамаха, на троне ці каля вынаснога грымёрнага цэха. А таксама... паназіраць за стварэннем карцін. Зона з мастакамі (студэнты каледжа імя А.К. Глебава) выглядала адной з тых, дзе творчая атмасфера была насычана да такой ступені, што, увайшоўшы ў зону з мальбертам, хацелася кінуць усё і маляваць чароўную незнаёмку, якая пазіравала непадалёк. Загадаць жаданне, скарыстаўшыся дабрынёй Васілісы Прыгожай? Паўдзельнічаць у майстар-класе па вырабе балетак або оперным спеве? Убачыць рэдкія архіўныя дакументы і афішы? Ды без праблем!

Нагадаем, што Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь быў створаны ў 1933 годзе. Сёння ў яго рэпертуары — 71 спектакль і каля 1000 работнікаў. Урачыстасці скончыліся ўвечары, але яшчэ адну «партыю» гледачоў чакала пышная опера «Кармэн». Сімвалічна, бо менавіта ёй Вялікі адкрыў свой першы сезон ужо амаль стагоддзе таму... Падаецца, што дні адчыненых дзвярэй у оперным, хоць і праходзяць толькі другі год, ператварацца ў яшчэ адну добрую тэатральную традыцыю.

**Марыя ВОЙЦІК**

■ Вернісаж

# БАЛЕТНАЯ СІМФОНІЯ — НА ПАЛАТНЕ

## Упершыню ў Мінску праходзіць выстаўка Алены Вантрыён-Макарэвіч

**Крохкасць ужываецца з фатальнасцю, задумліва захутаныя ў чырвоныя тканіны і сінявую смугу фігуры рухаюцца ў лаканічнай прасторы, дзе ў цэнтры ўвагі толькі твары, вочы — такімі паўстаюць танцоры балета на адзінаццаці карцінах Алены Вантрыён-Макарэвіч. У загадкавым, Тулуз-Латрэкаўскім афармленні. Беларуская мастачка, якая жыве ў Францыі, не забываецца пра свае карані. Менавіта яна, сумесна з Пасольствам Беларусі ў Францыі, з'яўляецца арганізатарам выставак нашых мастакоў у межах «Восеньскага салона» на Елісейскіх палях, а таксама экспазіцый брэсцкіх і віцебскіх творцаў у шэрагу французскіх салонаў.**



«Ганна і Джэк».

Упершыню ў Мінску, у Вялікім тэатры Беларусі адкрылася персанальная выстаўка Вантрыён-Макарэвіч, прысвечаная 150-годдзю з дня нараджэння Льва Бакста, выбітнага мастака і сцэнографа, таксама выхадца з нашай краіны. Што іх звязвае? Імправізаваны цягнік з Мінска і Гродна ў Парыж, ахвота да пастаянных зменаў і працы над сабой. А яшчэ — шчырае захапленне феменальнай рускай балерынай Ганнай Паўлавай, танцуючым «лебедзем», «жамчужынай» XX стагоддзя.

Справа ў тым, што менавіта Бакст быў сцэнографам балетных спектакляў Сяргея Дзягілева, пачынальніка групы «Свет мастацтва» і арганізатара «Рускіх сезонаў» у Парыжы. У яго і танцавала Паўлава. А Алена Вантрыён-Макарэвіч здолела захапіцца, прачуць і перанесці на палотны вобразы прыгажуні, што праславілася на сцэне ў часы belle epoque (пекнай эпохі), аўтамабільнага буму і кабарэ, зараджэння кінамастацтва і стылю мадэрн.

Алей і палатно, а карціны выглядаюць нібы шэдэўры фатаграфічнай думкі, настолькі жыва і натуральна. Хай гэта рамантычныя «Арлекін з Каламбінай», легкадумная «Страказа», грацыёзная «Белая лебедзь» ці задуменная «Тамара».

Алена Вантрыён-Макарэвіч скончыла Школу дызайну ў Мінску, вучылася на краўца, працавала ў атэлье і малявала. Пэўны час сур'ёзна займалася стварэннем адзення. Паралельна вывучала эканоміку. Але жывапіс пераважыў... Вышэйшая нацыянальная школа прыгожых мастацтваў у Парыжы стала наступным пунктам прызначэння. Смелы крок. Шэсць гадоў таму Вантрыён-Макарэвіч выйшла замуж за французскага адваката і з'ехала. Каб трапіць у галерэйна-выставачную бруякі Парыжа, трэба было каласальна шмат працаваць. Цяпер у яе 10-15 выставак на год, як калектыўных, так і персанальных. Алена Вантрыён-Макарэвіч супрацоўнічае з Пасольствам Беларусі ў Францыі, якое, па яе словах, актыўна спрыяе знаёмству еўрапейцаў з нашай культурай. Парыжане нават вянкі купальскія кідаюць у Сену. А хутка зноў адбудзецца «Восеньскі салон», які пройдзе як у Гран Пале, так і ў мінскім Палацы мастацтва. У горад, што натхніў не аднаго творцу, адправяцца шэсць нашых мастакоў ...

Карціны самой Алены Вантрыён-Макарэвіч выстаўляліся ў калектыўных экспазіцыях вядучых сусветных салонаў. Напрыклад, «Восеньскім салоне» на Елісейскіх палях, Art Capital у Гран Пале, Everarts, «Галерэі нумар I» ў Парыжы. Мастачка валодае першымі прызамі «Зялёнага салона» ў Эрбле, а таксама Асацыяцыі прыгожых мастацтваў.

Экспазіцыю работ Алены Ватрыён-Макарэвіч можна наведаць да 17 чэрвеня.

**Марыя ВОЙЦІК**



«Тамара».

■ Акцыі

# КВЕТКІ ДЛЯ ПАЭТА


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## У сталіцы ўшанавалі памяць Максіма Багдановіча

**Штогод, 25 мая, мы з сумам і жалем успамінаем Максіма, шкадуем, што ён, такі таленавіты паэт, празаік, літаратурны крытык і перакладчык, пражыў усяго 25 гадоў, пакінуўшы нам у спадчыну сваю адзіную кнігу паэзіі «Вянок».**

Вось і колькі дзён таму каля помніка Багдановічу, што знаходзіцца ў сталіцы ў скверы каля Вялікага тэатра, ускладаючы кветкі да ног Максіма, беларускія пісьменнікі, грамадскія дзеячы са скрухай згадвалі паэта. З дынамікаў гучалі песні на яго вершы ў выкананні легендарных «Песняроў», ішоў дождж... Нібыта неба плакала і сумавала па Багдановічу разам з намі.

Не было гучных слоў і прамоў. Ды і яны зусім недарэчныя ў гэты сумны дзень.

Ужо пазней, у Літаратурным музеі Максіма Багдановіча, удзельнікі імпрэзы скажуць, што Максім стаў для іх прыкладам служэння Радзіме, слову, беларускай мове. Што навучыў бачыць прыгажосць у будзённым, навучыў хоць час ад часу ўздымаць вочы ў неба і глядзець на зоры.

Сваячка Максіма Багдановіча Вольга Дашкоўская расказвае:

— Я двойчы была на Максімавай магіле ў Ялце. Калі першы раз збіралася наведаць яго, то вельмі хваляваласся, баялася не знайсці пахаванне паэта на таміх вялікіх могілках. Але потым пераканалася, што страх быў дарэмным: беларусы так часта там бываюць, што кожны мясцовы жыхар ведае, як знайсці месца апошняга спачыну вялікага паэта. Добра, што памяць пра Максіма жыве.

Пра гэта гаварыў таксама скульптар, аўтар першай экспазіцыі Літаратурнага музея Багдановіча Эдуард Агуновіч. Прагучаў і рамананс «Зорка Венера» на словы Максіма ў выкананні Алесі Сівохінай і ўсіх прысутных. Але ў гэты дзень радкі знакамітай песні набылі новы сэнс. Раманс стаў сімвалам памяці пра вялікага паэта, чыё жыццё было надзвычай кароткім, але чый талент і сёння, як яркая зорка, асвятляе небасхіл беларускай літаратуры.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Ініцыятыва

# СУЧАСНЫЯ ДЗЕЦІ ЧЫТАЮЦЬ!

## Пра гэта сведчаць вынікі сеціўнага праекта «Чытацкая культура і культура чытання»

**За час правядзення анлайн-віктарыны па творах, прапанаваных школьнікам для прачытання, удзел у праекце прынялі больш як 3 тысячы вучняў з розных куткоў Беларусі. І толькі каля двух дзясяткаў з іх — тыя, хто першы даслаў правільныя адказы на прапанаваныя пытанні, — змаглі сустрэцца з аўтарамі кніг і арганізатарамі праекта — прадстаўнікамі Нацыянальнага інстытута адукацыі.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Падарункі школьнікам — пераможцам сеціўнага праекта ўручылі самі аўтары прапанаваных для прачытання кніг, ў іх ліку — Алесь Бадак і Яўгенія Пастарнак.

Як сцвярджаюць самі арганізатары, калі аб'яўлялі старт праекта, зусім не чакалі такой увагі, такога шырокага абмеркавання віктарыны ў сацыяльных сетках. Але галоўны вынік акцыі — не толькі перамога, дыплом і сустрэча з пісьменнікамі. Галоўная мэта віктарыны — развіццё чытацкай культуры, павышэнне цікавасці да кнігі і пераканане ў тым, што пісьменніцкае слова і сёння запатрабаванае школьнікамі. Думаецца, гэтыя задачы былі цалкам выкананыя.

> **«Кожны тэкст, пасля таго, як ён напісаны, пачынае жыць уласным жыццём. Бо кожны чытач, нават самы маленькі, мае права на яго ўласную інтэрпрэтацыю».**

**Дырэктар Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдат філалагічных навук Сяргей ВАЖНІК**, падсумоўваючы ход і вынікі віктарыны, падкрэсліў:

— Як некалі заўважыў вядомы семіётык Ралан Барт, кожны тэкст, пасля таго, як ён напісаны, пачынае жыць уласным жыццём. Бо кожны чытач, нават самы маленькі, мае права на яго ўласную інтэрпрэтацыю. Мне падаецца, нашым пісьменнікам было не менш цікава ўдзельнічаць у гэтым праекце, бо ён даў магчымасць паглядзець, як іх кнігі адгукаюцца ў свядомасці сучасных школьнікаў.

У час глабальнай інфарматызацыі ёсць меркаванне, што дзеці мала чытаюць, што больш часу праводзяць з камп'ютарам і гаджэтамі, увесь час трымаюць у руках мабільны тэлефон ці планшэт. Але праект «Чытацкая культура і культура чытання» пераканаў: дзеці не проста шмат чытаюць, але глыбока ўдумваюцца ў змест прачытанага. Перад удзельнікамі акцыі часам стаяла надзвычай складаная задача: ім трэба было не толькі прачытаць кнігі, але і адказаць на прапанаваныя пытанні. Дарэчы, пытанні для віктарыны пісалі... самі аўтары твораў. Яны патрабавалі не адназначнага адказу пра колер сукенкі галоўнай гераіні ці колькасць смелых учынкаў героя, але падштурхоўвалі да разважанняў, даследаванняў і нават гутарак з бацькамі.

Так, вучням 4-х класаў было прапанавана прачытаць кнігу Раісы Баравіковай «Казкі астранаўта: касмічныя падарожжы беларусаў» ці казку Алеся Карлюкевіча «Вавёрка піша сачыненне»; вучні 5-6-х класаў знаёміліся з «Незвычайным падарожжам у Краіну Ведзьмаў» Алеся Бадака ці «Калядамі ў хроснай» Алены Масла; навучэнцы 7-9-х класаў мусілі асэнсаваць надзвычай папулярную кнігу

> **Пісьменнікам было цікава ўдзельнічаць у гэтым праекце, бо ён даў магчымасць паглядзець, як кнігі адгукаюцца ў свядомасці сучасных школьнікаў.**

Андрэя Жвалеўскага і Яўгеніі Пастарнак «Час заўсёды добры» ці твор Яўгена Хвалея «Прынцэса тусоўкі», а 10-11-класнікі маглі выбраць адзін з двух раманаў Людмілы Рублеўскай — «Сэрца мармуровага анёла» ці «Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега».

Адметна, што сустрэча з аўтарамі ў Мінску (а для школьнікаў з розных гарадоў і вёсак Беларусі — гэта сапраўды значная падзея) — прайшла ў досыць вольным фармаце. Вучні атрымалі дыпломы і кніжныя падарункі ад любімых творцаў, змаглі задаць пытанні і пагутарыць з аўтарамі папулярных кніг. Думаецца, гэтыя школьнікі абавязкова стануць шчырымі прыхільнікамі кніг і чытання, а новыя падобныя праекты, якія, упэўнена, яшчэ будуць рэалізоўвацца Нацыянальным інстытутам адукацыі ды іншымі ўстановамі, зробяць кола аматараў беларускай літаратуры надзвычай шырокім.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

■ Асоба

# ВЕРНЫ АБРАНАМУ ШЛЯХУ

## Васіль Жураўлёў прысвяціў працы ў Акадэміі навук амаль 60 гадоў

**Імя Васіля Пракопавіча Жураўлёва сёння шырока вядомае ў гуманітарных колах не толькі Беларусі, але і далёка за яе межамі. Ён доктар філалагічных навук, аўтар больш як 200 навуковых прац, у тым ліку 12 манаграфій (аўтарскіх і калектыўных). Днямі вядомы даследчык літаратуры адсвяткаваў 85-годдзе.**

Васіль Жураўлёў нарадзіўся ў 1931 годзе на Мсціслаўшчыне ў сялянскай сям'і. Нялёгкім было дзяцінства. Рана памёр бацька. Маці адна выхоўвала дваіх дзяцей.

Пасля заканчэння школы В.П. Жураўлёў паступіў у Мінскі педагагічны інстытут, працягам вучобы стала паступленне ў аспірантуру. У 1957 годзе Васіль Пракопавіч назаўсёды звязаў лёс з Інстытутам літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук. У гэтым жа годзе пабачылі свет і першыя навуковыя публікацыі маладога вучонага. Гэта былі рэцэнзіі на новыя кнігі, а таксама артыкулы, прысвечаныя праблемам гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры.



Самую вялікую зацікаўленасць В.П. Жураўлёў заўсёды праяўляў да творчасці пачынальніка нацыянальнай эпічнай традыцыі ў беларускай літаратуры — Якуба Коласа. У кнізе «Якуб Колас і паэтыка беларускага рамана» традыцыя, заснаваная Коласам, паказана адным з найважнейшых крытэрыяў ацэнкі мастацкіх якасцяў літаратурнага твора. А ў манаграфіі даследчыка «Структура твора», выдадзенай ў 1978 годзе, па-новаму была асэнсавана складаная і на той час недастаткова распрацаваная праблема вывучэння мастацкага твора праз сістэму яго паэтыкі.

Значным укладам у беларускую літаратурную навуку з'яўляюцца таксама аўтарскія манаграфіі В.П. Жураўлёва: «На шляху духоўнага самасцвярджэння», «У пошуку духоўных ідэалаў», «Актуальнасць традыцый: Якуб Колас у пісьменніцкім асяродку», «Класіка і літаратурная сучаснасць: духоўны патэнцыял чалавека», «Непадкупны суд памяці: творчасць Анатоля Кудраўца».

Гісторыка-літаратурныя даследаванні В.П. Жураўлёва не засталіся дасягненнем толькі акадэмічнай навукі. Раздзелы яго аўтарства змешчаны ў шэрагу падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для ВНУ, «Гісторыі беларускай літаратуры» ў 4 тамах, 5 кнігах (1997—2000 гг.), «Гісторыі беларускай літаратуры» ў 2-х тамах (на рускай мове) і іншых.

У час працы ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук (якому, дарэчы, прысвяціў 58 гадоў свайго навуковага, творчага, педагагічнага і чалавечага жыцця) Васіль Пракопавіч праводзіў значную педагагічную работу. Шмат сіл і энергіі ён аддаваў выхаванню літаратуразнаўчай моладзі. Вялікую ўвагу ўдзяляў падрыхтоўцы навуковых кадраў праз аспірантуру, суіскальніцтва і дактарантуру. Ён быў намеснікам старшыні спецыялізаванага Савета па абароне доктарскіх дысертацый пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі, часта выступаў экспертам і афіцыйным апанентам кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. За гады працы ім падрыхтавана 6 кандыдатаў і 2 дактары філалагічных навук.

Сваімі навуковымі публікацыямі, выступленнямі ў сродках масавай інфармацыі Васіль Жураўлёў працягвае актыўна ўдзельнічаць у навуковым аналізе літаратурнага працэсу, уносіць адпаведны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры. Адданую працу вучонага і значны ўклад у даследаванне праблем тэорыі і гісторыі беларускай літаратуры высока ацаніла дзяржава. У 2002 годзе В.П. Жураўлёў была прысуджана Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры за кнігу «У пошуку духоўных ідэалаў».

Вучні і калегі Васіля Пракопавіча шчыра віншуюць яго з юбілейнай вясной. Жадаюць здзяйснення ўсіх задум і планаў і моцнага здароўя яшчэ на доўгія гады.

**Алена МАНКЕВІЧ**

# Ілья КУРГАН:
# «У КОЖНЫМ ВЫПАДКОВЫМ СУПАДЗЕННІ — БОГ»

**На гэтым тыдні, у чацвер, Ілья Курган адзначыў свой 90-гадовы юбілей. Вы маглі гэтага чалавека ніколі не бачыць, не ведаць імя ці прозвішча, але голас... Курган з 1949 года і па працягу наступных дзесяцігоддзяў (крыху не хапіла да паўстагоддзя) быў візітоўкай беларускага радыё. Гэта пад прачытаныя ім паведамленні прачыналася Беларуская ССР, ён агучваў вершы беларускіх паэтаў так, што тыя здзіўляліся, што так цудоўна напісалі...**
**У свае 90 Ілья Курган не страціў пачуцця гумару. У дзень нараджэння тэлефаную, віншую, зычу доўгіх гадоў жыцця. «Не дай Бог!» — смяецца ён. А нас, журналістаў, якія прыйшлі да яго на інтэрв'ю, называе іншапланецянамі, якія размаўляюць на дзіўнай, але вельмі прыгожай мове.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Я толькі ў 87 гадоў, зусім нядаўна, пайшоў на пенсію. Цяпер законы рыхтуюцца, што на тры гады павысяць пенсійны ўзрост — аж да 63! А я да 87 працаваў і нічога. У мяне ніхто не пытаўся, і нікому нічога не казаў. Дык вось некалькі гадоў таму, калі яшчэ працаваў, аднойчы еду на заняткі на тралейбусе ў Акадэмію мастацтваў, першы набор якой памятаю дагэтуль, і недалёка ад мяне стаялі два хлопцы. Гляджу на іх, слухаю і думаю: ці здалося мне? Гавораць на нейкай незразумелай для ўсіх мове. Звярнуўся да іх, кажу: «На дзіўнай мове кажаце!» Яны смяюцца, бо размова паміж імі была на чысцюткай беларускай... Памятаю, аднойчы кажу студэнту: «Глянь, у Джавані Вэрга ёсць такое апавяданне...» А ён: «Джовання! Как красиво звучит!» Я яму — здароў, браце! Па-беларуску ж — каханне, натхненне *(цягне падвоеныя зычныя)*. Як співаюць зычныя! Расказваў студэнтам, як Адам Міцкевіч у Парыжы казаў пра прыгажосць беларускай мовы. А тыя так шчыра здзіўляліся...

***— Ілья Львовіч, ніяк не магу ўцяміць, як пасля ўсіх жахаў, якія вам давялося пабачыць на вайне, удалося захаваць і ажыццявіць сваю мару — паступіць у тэатральны інстытут?***

— Не памятаю, калі дакладна было (адчуванне, што ажно ў XIX стагоддзі), але ў школе мяне называлі «наш патэфон». Прыходзіла настаўніца па літаратуры, расказвала, што будзем чытаць, выклікала мяне да дошкі, давала разгорнутую кнігу, і я чытаў. І гэта невыпадковая з'ява. Усё яно адтуль *(падымае галаву да неба)*. Кожнаму Бог дае па-рознаму. Мне — так. І калі паступаюць у Акадэмію мастацтваў, не ўсе студэнты разумеюць, што важна мець менавіта ад прыроды дадзеныя здольнасці. Калі іх няма, колькі ні працуй, сэнсу не будзе. Не будзе той інтуіцыі, таго нюху, якія выратоўць пры неабходнасці. Памятаю, аднойчы за некалькі хвілін да пачатку эфіру рэдактар прынесла тэкст, завераны подпісамі амаль дзясятка рэдактараў і цэнзара. Эфір пачаўся. І раптам я бачу, што на старонцы чорным па белым надрукавана: «Сталін — прычына бяздольнасці нашых салдат». А трэба, зразумела, «баяздольнасці». Усяго адна літара прапушчана, а колькі галоў магло паляцець. Рэдактар пасля мяне абдымала: «Выратаваў маіх дзяцей!»

**«Я яе праводзіў дадому... А пасля і пажаніліся. У яе зусім не было прытулку. Таму яна перайшла да мяне.. пад той самы стол! Затое як запомнілася. Рамантычна было...»**

***— Памятаеце, як пачалася вайна?***

— Я сядзеў на ганку нашага дома і глядзеў, як пралятаюць над галавой нямецкія бамбардзіроўшчыкі. Пасля наша сям'я, як і тысячы іншых, ішла пешшу па Маскоўскай шашы. Немцы лялі над намі на самалётах і проста расстрэльвалі ўсіх, хто ішоў. Толькі ўявіць, такое рабілі жыхары краіны Гётэ і Бетховена!.. Калі быў паабапал дарогі лес, то мы хаваліся ў ім. А калі поле, тады маці кідалася целам на малодшага брацка, каб абараніць яго ад куляў. У той дзень, калі пачалася вайна, у мяне быў квіток на дзённы спектакль. МХАТ прыехаў да нас на гастролі. І тых артыстаў — непамерна таленавітых, вялікіх — нават не пасадзілі на транспарт. Яны ішлі з намі, зусім недалёка, рукой падаць. Потым, праўда, іх падабралі...

Калі ўжо вяртаўся з Ташкента дадому ў Мінск (а грошай на дарогу, вядома ж, не было), маці набыла паўднёвай садавіны цэлую каробку. Кажа: «Прадасі — даедзеш». Кажу, што не ўмею я так... А што рабіць? Пашчасціла, прадаў. І дабраўся да Мінска. Іду... Памятаю, увесь квартал, што цяпер за Домам афіцэраў, пераўтвараўся ў выставку трафейнай зброі. Добра памятаю, там танк стаяў велічэзны. Першую ноч вяртання правёў на вакзале, бо не было куды падзецца. І другую ноч таксама. Хадзіў днямі па горадзе: можа, хто сустрэнецца са знаёмых? Спаў у нямецкім танку, на лаўцы ў скверы каля Купалаўскага тэатра... Што казаць, лепей пакажу, — гаворыць у мой бок Ілья Львовіч. — Чытайце, даражэнькая.

***— Тут, на руінах вуліцы Карла Маркса, Ілья Курган у 1945 годзе пасля шматгадовай разлукі наноў сустрэўся з татам. Справа — будынак сучаснага Нацыянальнага гістарычнага музея.***

— Уяўляеце, ён толькі вярнуўся з Германіі, уладкаваўся на працу — і ідзе мне насустрач, вось па гэтай вуліцы, дзе зараз мы з вамі, па Карла Маркса. Гэта цуд! У мяне пытаюцца: «Ты верыш у Бога?» Я сапраўды паважаю рэлігію, але адказваю: «Часам». Бо Ён — менавіта ў такіх супадзеннях. Быў у мяне такі выпадак. У Ташкенце, на паравозарамонтным заводзе, куды нас паслалі ад тэхнікума працаваць, ледзь не адбылася трагедыя. Праца была катаржнай, да таго ж стаяў такі грукат, што людзі глухлі. Але самым цяжкім была начная змена, на якую нас, зялёных пачаткоўцаў, адразу ж адправілі. Мяне, знясіленага голадам, увесь час хіліла ў сон. Аднойчы настолькі невыносна захацелася спаць, што я забраўся ў паравозны кацёл, прымасціўся ў ім паміж трубамі і заснуў. Пры гэтым дадумаўся ўзяць з сабой кувалду, каб майстар, убачыўшы яе звонку, не вырашыў, што я лайдачу. І менавіта яна выратавала мяне ад гібелі! Прачнуўся я ад таго, што стала не проста душна, а пякуча горача, ажно адзенне гарэла, толькі працоўная роба ратавала. Аказалася, што рабочыя вырашылі ўзяцца за рамонт катла, у якім я заснуў: пачалі рэзаць аўтагенам краты, у якія былі ўстаўлены трубы. Натуральна, тыя разагрэліся. Мае крыкі ніхто не чуў. Тады я схапіў кувалду і пачаў з усяе сілы біць ёю. Звонку зразумелі, што ўнутры ёсць хтосьці жывы. Дробязь — узяў з сабой кувалду, а выратавала! Як тут не паверыць у Бога?

***— А як паступалі ў інстытут? Ведаю, што пасля заканчэння вы выступалі ў вандроўным тэатры. Як думаеце, сённяшняя моладзь на такое здольна?***

— Ужо ў пераможным 1945-м я вырашыў паступаць на акцёрскі факультэт тэатральнага інстытута. Хадзіў і пытаўся ў мінакоў, дзе мне яго адшукаць. У політэхнічным інстытуце быў пакойчык, і ў ім — тэатральны інстытут. Няма нават дзе прысесці, дзе палажыць паперу, каб подпіс паставіць. Пасля нас перавялі ў оперны тэатр. Можна было хоць кожны дзень бясплатна оперу глядзець. Я і глядзеў...

**«Калі быў паабапал дарогі лес, то мы хаваліся ў ім. А калі поле, тады маці кідалася целам на малодшага брацка, каб абараніць яго ад куляў».**

У той час у горадзе сустрэлася мне дзяўчына, якую я ведаў па школе. Яна з маці жыла ў драўляным дамку каля Дома друку. Месца мне там адвялі... Каму скажаш — не паверыць. Маўляў, усё выдумаў. А ў сярэдзіне пакоя таго дома — стол, вялікі, круглы. Яны засцялілі абрус да самай падлогі, і я там, пад сталом, спаў. Якраз здаваў іспыты, паступаў. У нямецкіх салдацкіх штанах, зялёных і тоўстых. На нагах — тапачкі, на іх — галёшы, прывязаныя шпагацікам, і ваенная югаслаўская куртка. Так і пачаў вучыцца.

Наш выпуск быў першым пасля вайны. У той час у тэатрах ішлі скарачэнні, і мы, выпускнікі, пайшлі да Пятра Машэрава, які ўзначальваў камсамол Беларусі і сказаў, што наш выпуск абавязкова захаваюць. Так мы сталі акцёрамі тэатра на колах. Ездзілі на грузавіку без брызенту, поўным дэкарацый, па краіне, па гарадах і вёсках. Дзяўчаты мне тады казалі: «Ілья, ты праехаў з намі толькі палову шляху». Пытаюся: «Чаму?» А яны кажуць, што я, як джэнтльмен, прапускаў дзяўчат у глыбіню кузава. Таму адна нага была ў грузавіку, а другая — за бортам.

***— Раскажыце, калі ласка, як пазнаёміліся з жонкай.***

— Калі я быў на чацвёртым курсе, перад прыёмнымі іспытамі ў тэатральны інстытут ехаў ад парку Чалюскінцаў дадому ў трамваі. І бачу — на прыпынку стаіць дзяўчына. І так яна мне спадабалася! Падумаў, шкада, што не вучымся разам. І потым падумаў: калі яна сыдзе з трамвая на прыпынку насупраць опернага, можа, пойдзе туды, да нас. На наступны дзень пайшоў, пацікавіўся пра тых, хто паступае ў наш інстытут, і пабачыў яе. І яна таксама на мяне глядзела. Пасля даведаўся, што яна з Самары прыехала паступаць у тэатральны інстытут. Я яе праводзіў дадому... А пасля і пажаніліся. У яе зусім не было прытулку. Таму яна перайшла да мяне... пад той самы стол! Затое як запомнілася. Рамантычна было...

Калі скончыў 4-ты курс, мне прапанавалі пайсці ў віцебскі тэатр. Але жонка сказала: «Мне тры гады вучыцца, а ты з'едзеш. Што за сям'я такая будзе?» А пасля я пачуў па радыё аб'яву, што праводзіцца конкурс на месца дыктара-практыканта. Так трапіў на працу на беларускае радыё, і ўжо 1 лістапада 1949 года прыступіў да сваіх новых абавязкаў.

***— «Не патрэбен Левітан, калі ёсць Ілья Курган!»...***

— Так, гэтая фраза ў свой час хутка разышлася сярод маіх знаёмых і калег. ...У той дзень я атрымаў званне заслужанага артыста. Трэба ж было адсвяткаваць. А ў нас гасцяваў сам Юрый Левітан, вядомы на ўвесь Савецкі Саюз дыктар радыё. І я, разумеючы, што адной чаркай сёння не абыдзецца і заўтра будзе нясолодка, прапанаваў Юрыю Барысавічу падмяніць мяне. Той пагадзіўся, але з умовай, што мае начальства ўтрасе ўсё з Масквой. Дамовіліся. Нават тэкст пераклалі на рускую мову. Трэба было дамовіцца і накont пропуску, але ж было позна, і наш супрацоўнік не здолеў атрымаць стандартны пропуск — выпісалі толькі часовы. Левітан папрасіў мяне назаўтра папрысутнічаць у студыі з ім побач, бо і беларуская студыя, і апаратура ў ёй адрознівалася ад маскоўскай.

**«Пазней высветлілася, што Левітана з яго часовым пропускам затрымалі ўнізе. Тады рэдактар прыняў рашэнне, што весці рэпартаж буду я. Я, зразумела, стаў адмаўляцца: як, маўляў, мне чытаць, калі я нават гаварыць не магу нармальна?»**

Ноччу, натуральна, паспаць не ўдалося, а раніцай — эфір. Канферэнцыя кіраўнікоў кампартый усяго свету, якія прыбылі ў Мінск па запрашэнні самога Леаніда Брэжнева. Раніцай накіраваліся мы з Левітанам у Палац спорту. У фае на Юрыя Барысавіча накінуўся нейкі рэпарцёр і пацягнуў яго на інтэрв'ю. Ніколі больш не бачыў, каб журналіст так упарта хацеў пагутарыць... Мы дамовіліся так: я падымуся ў сваю студыю, а Левітан, як вызваліцца, таксама падыдзе туды. Аднак час ішоў, а ён усё не з'яўляўся. Хацелі паслаць людзей, ды да таго часу ўсё хаджэнні па палацы былі забароненыя. Як ні прасілі ахоўнікаў нас прапусціць, не дазвалялі. І іх можна зразумець: такая праца — выконваць загад.

Пазней высветлілася, што Левітана з яго часовым пропускам затрымалі ўнізе. Тады рэдактар прыняў рашэнне, што весці рэпартаж буду я. Я, зразумела, стаў адмаўляцца: як, маўляў, мне чытаць, калі я нават гаварыць не магу нармальна? А ён мне: «Калі мы не пачнём, то ты ўяўляеш, што зробяць з усімі намі?» Я пагадзіўся. Але тут паўстала яшчэ адна праблема: кінуліся шукаць тэкст — яго няма! Першы застаўся ў Левітана ўнізе. Выйсці са студыі нельга. Урэшце нейкім цудам у аднаго з карэспандэнтаў адшукаўся пакамечаны, перакрэслены шмат разоў асобнік на рускай мове. Нічога не разабраць. І вось на сцэну сталі выходзіць афіцыйныя прадстаўнікі ўладаў. Яшчэ не зусім цвярозы, я сеў за мікрафон і за секунду да таго, як Машэраў сказаў: «Таварышы!», паспеў агучыць бясконцы спіс з імёнаў і «тытулаў» прысутных на канферэнцыі кіраўнікоў замежных кампартый. А там столькі нязродных прозвішчаў — так і не вымавіш адразу нават у спакойным стане. І толькі значна пазней я звярнуў увагу на тое, што ў рэдактара, які падчас майго рэпартажу трымаўся за стол, пасінелі пальцы... Калі эфір скончыўся, заляцеў у студыю Левітан і сказаў: «Не патрэбен Левітан, калі ёсць Ілья Курган!»

**«Курган» — гэта прозвішча маці Ільі Львовіча, якое ён узяў падчас працы на радыё замест бацькавага «Эйдэльман».**
**— Заходжу ўпершыню ў аўдыторыю да студэнтаў. Кажу, што я — Курган. Што пра мяне яшчэ Янка Купала пісаў: «Здзірванелы курган векавечны». Жарт жартам, а некаторыя верылі! — смяецца юбіляр.**

**Вераніка ПУСТАВІТ**
*pustavit@zviazda.by*


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **Гродненское областное потребительское общество (Берестовицкий филиал), Гродненская обл., г.п. Берестовица, ул. Советская, д. 2** |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| Незавершенное законсервированное капитальное строение | Здание неустановленного назначения | 2848,5 кв.м | 411/U-15063 | Гродненская обл., Берестовицкий р-н, Пограничный с/с, д. Вороны, ул. Озерная, д. 2А |

**Готовность строения – 61% (**подземная часть, перекрытия, крыша – 100%, стены и перегородки – 93%, полы – 39%)

**Сведения о земельном участке**: предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 12.01.2114) пл. 0,6620 га для строительства и обслуживания здания цеха минеральной воды.
Ограничения: расположен в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, пл. 0,6620 га.

**Начальная цена с НДС – 632 000 000 белорусских рублей (снижена на 20%) (с учетом деноминации – 63 200 рублей)**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010, в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г.Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) дней** после заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 18.03.2016.

**Аукцион состоится 13.06.2016** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.06.2016** до 17.00 по указанному адресу.
**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-183-69-71. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

КАНТАКТ
№ 2 (36)
Спецпраект газеты «Звязда» сумесна з РУП «Белпошта» і РУП «Белсаюздрук»
Сумесны выпуск з РУП «Белсаюздрук»



■ Бліжэй да чытача

# ЯК ПРЫВАБІЦЬ КЛІЕНТА?

## Кіяскёраў і работнікаў кнігарняў навучаць хітрыкам сучаснага маркетынгу





Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**«Пакупнік ужо не той», — уздыхаюць сённяшнія прадаўцы. Каб прыцягнуць спажыўцоў мала прапанаваць разнастайны тавар, трэба яшчэ і кваліфікавана яго падаць. У выдавецкай дзейнасці праблема ўскладняецца тым, што канкурыраваць даводзіцца з інтэрнэтам. Як у цяперашніх умовах ладзіць рэалізацыю перыёдыкі і кніжнай прадукцыі? Каб навучыць прадаўцоў працаваць у новых абставінах, Саюз выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў друку распачаў серыю семінараў.**

### Патэнцыял кіёскаў

На першай сустрэчы распаўсюджвальнікі абмяркоўвалі праблемы, з якімі сутыкаюцца.

— Сёння назіраецца тэндэнцыя падзення пакупніцкага попыту, — заўважае **кіраўнік гандлёвага аддзела «Мінаблсаюздруку» Галіна САЙКОВА.** — Не толькі ў нас. Прыбытак насельніцтва ўпаў. Вядома, спрабуем прыцягваць кліентаў акцыямі. Але гэта часовы захад. На акцыях не заробіш: яны праводзяцца за кошт нашых рознічных нацэнак, таму гэта вымыванне сродкаў.

Нюансамі арганізацыі падпіскі ў кіёсках падзялілася магілёўская калега, **начальнік аддзела друку рэгіянальнага «Саюздруку» Наталля СТАРАВЕРАВА**:

— У нас ёсць дамоўленасць з многімі выдавецтвамі. Але паслугай карыстаюцца не часта. Ведамасную падпіску людзі афармляюць на прадпрыемствах. А калі казаць пра індывідуальную, то «Белпошта» тут па-за канкурэнцыяй, у іх гэта асноўны від дзейнасці. Мы прыдумалі арыгінальны рэкламны ход, каб зацікавіць падпісчыкаў. Маўляў, са скрыні газетку могуць сцягнуць, а ў кіёску яна зазсёды дачакаецца вас. Нават калі вы на месяц паедзеце адпачываць на поўдзень, наш ветлівы прадавец захавае вашы экземпляры. Праўда, сутыкнуліся з іншай праблемай: некаторыя падпісчыкі могуць па некалькі месяцаў не забіраць прэсу. А ў нас памяшканні не дазваляюць захоўваць «да запатрабавання» столькі газет і часопісаў.

Разам з тым нельга недаацэньваць патэнцыял кіёскаў і павільёнаў. У гэтых малых аб'ектаў вялікі радыус пакрыцця, таму і колькасць патэнцыйных пакупнікоў значная. Каб наведнік не сышоў з пустымі рукамі, важна паклапаціцца пра выкладку. Сённяшні спажывец, асабліва маладзейшая аўдыторыя, не будзе траціць шмат часу, каб вывучыць прадстаўленыя на стэлажах выданні. Проста хутка акіне позіркам асартымент. Таму тавар трэба правільна сегментаваць, каб пакупнік адразу заўважыў цікавае для яго выданне.

### Кантакт з выдаўцамі

Найбольшым попытам цяпер карыстаюцца дзіцячыя выданні і календарныя часопісы, якія прапануюць збіраць што-небудзь рукамі. З астатняй прэсай больш складана: кажуць, час друкаваных выданняў ужо прайшоў. Але вопыт Вялікабрытаніі паказвае, што не ўсё яшчэ страчана. Там летась змаглі нарэшце спыніць падзенне тыражоў. У брытанскай журналістыцы адраджаюцца жанры дэтэктываў, расследаванняў. Прычым матэрыялы па адной справе друкуюцца на працягу некалькіх нумароў. За эксклюзіў чытачы гатовы плаціць.

Распаўсюджвальнікі заўважаюць, што вельмі важна, каб быў наладжаны кантакт з выдаўцамі. Бо, ведаючы асаблівасці пэўнай газеты, яе лягчэй прапанаваць.

— Многае залежыць ад прадаўцоў, якія знаходзяцца ў рознічных аб'ектах, — кажа Галіна Сайкова. — Мы стараемся праводзіць сустрэчы рэдакцый менавіта з кіяскёрамі, а не з пакупнікамі, бо, што чалавеку гэтаму падабаецца, тое ён і будзе рэкамендаваць. Ніякія рэкламныя лістоўкі не будуць больш дзейснымі за парады прадаўца.

Як паказвае практыка, дадатковыя ўсплёскі продажаў могуць забяспечыць і інфармацыйныя дадаткі, якія выпускаюць выданні. Той жа каляндар для дачнікаў ці расклад руху электрычак. Трэба толькі загадзя папярэджваць чытачоў пра гэтыя ўкладкі. Зразумела, што распрацоўка спецыяльных дадаткаў — справа самiх рэдакцый. Але «Саюздрук», які бачыць агульную сітуацыю па выданнях, можа даць пэўныя парады па тэматыцы і даце выпуску, каб не апынулася, што ўсе газеты і часопісы адначасова выдалі падобныя ўкладкі.

Важны момант: інфармацыйныя дадаткі павінны быць зроблены прафесійна. Калі чытач зразумее, што разбіраецца ў тэме лепш за выданне, нічога не купіць. Так адбылося, напрыклад, калі адна з грамадскапалітычных газет вырашыла выпусціць пакецікі з насеннем. Чаканага попыту на той тавар не было: дачнікі, якія ўжо не першы год займаюцца агародам, аддалі перавагу спецыялізаваным крамам.

А вось задума з купонамі ў газетах і часопісах у беларускіх рэаліях не працуе. Не тая спажывецкая культура. Наталля Стараверава прызнаецца, што яны неяк спрабавалі ладзіць такую акцыю сумесна з сеткай абутковых крам. Першы нумар з купонамі разабралі на «ўра». Другі ўжо не выклікаў ажыятажу. А трэці нумар так і застаўся ляжаць на прылаўку.

### Мода на лекцыі

Закранулі на семінары і пытанне продажу кніг. **Вядучая трэнінгу, маркетолаг Святлана ПАПСУЙ** мяркуе, што калі за наступныя пяць гадоў не пазбавіцца ад складскіх запасаў кніг, што рабіліся па старой тэхналогіі, потым іх ужо немагчыма будзе збыць:

— Літаратура мяняе фармат. Набываюць папулярнасць інтэрактыўныя кнігі. Іншымі становяцца патрэбы чытачоў. Людзі хочуць здаволіць інфармацыйны голад і атрымаць рэальную інфармацыю.

**Мы стараемся праводзіць сустрэчы рэдакцый менавіта з кіяскёрамі, а не з пакупнікамі, бо, што чалавеку гэтаму падабаецца, тое ён і будзе рэкамендаваць. Ніякія рэкламныя лістоўкі не будуць больш дзейснымі за парады прадаўца.**

Каб зацікавіць пакупніка, трэба прыдумаць пра тавар гісторыю. Для кожнай аўдыторыі гэта гісторыя розная. Раней было дастаткова ведаць сярэдні ўзрост патэнцыйнага пакупніка, сярэдні прыбытак. Цяпер жа маркетолагі кажуць, што працаваць трэба на больш вузкія мэтавыя аўдыторыі. Бо, напрыклад, сям'я з адным дзіцем інакш бавіць вольны час, чым тая, дзе выхоўваецца некалькі малых.

**Даведка**

Семінары-практыкумы плануюць праводзіць для прадпрыемстваў сеткі «Саюздрук», таварыства «Белкніга», выдавецтваў і рэдакцый СМІ.

— Мы хочам павысіць кваліфікацыю супрацоўнікаў, павялічыць рэнтабельнасць прадпрыемстваў, наладзіць кантакты паміж выдаўцамі, СМІ і гандлёвай сеткай шляхам распрацоўкі маркетынгавай стратэгіі, правядзення сумесных мерапрыемстваў і акцый, — адзначае **выканаўчы дырэктар Саюза выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў друку Вікторыя ЛУКАШУТЭ.**

Падобныя семінары ўжо праводзіліся ў 2011 годзе і добра зарэкамендавалі сябе. Усё ж такі маркетынг — гэта тэхналогіі. І няважна, што ўводзіць на рынак. Калі ўсё рабіць сістэмна, вынік будзе.

Сярод моладзі папулярныя кнігарні, якія пазіцыянуюць сябе як інтэлектуальныя клубы.

— Ёсць цэлая катэгорыя маладых людзей, дастаткова адукаваных, якія гатовы траціць свой вольны час наведваючы лекцыі. Маючы такія сеткі, як у «Саюздруку» і «Белкнігі», варта было б пэўныя лекцыі праводзіць. Для гэтага нават не патрэбна вельмі вялікая прастора. Ладзіць інтэлектуальныя сустрэчы можна было б перыядычна, раз на месяц. І на гэтых жа мерапрыемствах прапаноўваць наведвальнікам адпаведную тэматычную літаратуру, — кажа Святлана Папсуй.

Падняць продажы дзіцячай літаратуры можна за кошт... экскурсій у крамы. Замест таго, каб усіх сталічных школьнікаў вазіць на завод Coca-Cola, лепш знаёміць іх з цікавымі выданнямі ў гульнявой форме. І экскурсія танней бацькам абыдзецца, і падарункамі — больш карыснымі за газіраваны салодкі напой — усе будуць забяспечаны.

Не трэба недаацэньваць і попыт на дарагія выданні. Кнігі-альбомы з каляровымі фотаздымкамі і малюнкамі, напрыклад, па гісторыі, беларускім нацыянальным касцюме знойдуць свайго пакупніка, бо інтэрнэт-падача такой інфармацыі прайграе друкаванаму варыянту. Тое ж і з вучэбнай літаратурай.

Увогуле крамам і кіёскам варта падглядзець рэкламныя хады, якія прымяняюць у астатнім гандлі. Умоўна кажучы, паказваць пакупніку, што набыць адразу тры выданні будзе больш выгадна, чым браць па адным. Гэта можа дапамагчы павялічыць абароты.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ З наваселлем!

# Карысна, утульна і... смачна!







Яшчэ год таму на гэтым скрыжаванні мінскага праспекта Незалежнасці і бульвара Талбухіна складана было ўявіць сабе якую-небудзь пабудову. Але майстры-архітэктары знайшлі прыдатную, арыгінальную форму. Сёння гэтая невялікая пабудова поўнасцю адпавядае запатрабаванням жыхароў навакольных вуліц. Трэба — заходзь, набывай газеты, часопісы, кнігі. Пажадаў марозіва, свежую выпечку, кубачак духмянай кавы — і гэта тут табе прапануюць. Ёсць такসама канцтавары, дзіцячыя цацкі, мінеральная вада, фруктовыя сокі.

Карацей, павільён №165 Белсаюздруку не бывае пустым, наведвальнікаў розных узростаў шмат у любы час (з 7.00 да 21.00). Пра тое сведчаць і нашы фотаздымкі. На гэтых фота вы бачыце руплівых і ветлівых гаспадароў — прадаўцоў Наталлю Алейнік і Алену Наркевіч.

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара**

# Усё пра Еву

■ Нататнік Яго жонкі

**Святлана ДЗЯНІСАВА, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»**

## ПАКУЛЬ ТЫ НЯВЕСТКА



**Хто, скажыце мне, прыдумаў, што свякроў азначае «святая кроў»? Каму прыйшла ў галаву ідэя назваць маці мужа не як-небудзь, а«другой мамай»? Ведай я, хто гэты чалавек, я б яго, бачыць Бог, з-пад зямлі дастала. А дастаўшы, доўга б з ім не цырымонілася. У тую ж хвіліну, бачыць Бог, сказала б яму ўсё, што я пра яго думаю.**

А думаю я шмат. Асабліва апошнім часам. Я б сказала гэтаму чалавеку, што для мяне ён святлейшы за любога анёла і разумнейшы за ўсіх геніяў разам.

Тое, што я збіраюся тут напісаць, не для вузкай калонкі прызначана, а цягне не менш чым на тузін старонак. На цэлы трактат, так бы мовіць. І я яго напішу. Іншым разам, лепшым часам, як казала мая бабка.

Мая бабка... Першая свякроў, пра якую я даведалася, — гэта яна.

Надумалася мая мама (нявестка, значыцца) вучобу ў інстытуце кідаць. Бо двое дзетак-пагодкаў — якая ўжо з імі вучоба? А свякроў ёй: «Вучобу кідаць не дазволю!» — і забрала дзетак да сябе. «Вучыся, дачушка, спакойна. З дзяўчынкамі тваімі ўсё добра, за іх не хвалюйся», — пісала маме падчас сесіі, з Капыльшчыны ў Гродна. Павучала: «Старайся!» Першая мая настаўніца — гэта яна, мая бабка. І першая свякроў, пра якую я даведалася...

А потым я даведалася больш. Нават пра тое, што ёсць нехта, хто за свякроў страшнейшы.

Калі ў твайго мужа ёсць сястра, табе яна залвіца, правільна? Калі яна старэйшая за мужа і цябе, табе яна, здараецца, становіцца свякроўю. Яшчэ адной. Але праскочым гэтую гісторыю. Гадоў на дваццаць пяць. Глядзі, што цяпер атрымліваецца. Калі ты сама — нявестка, якой, мякка кажучы, са свякроўю не пашанцавала, то як бы ты, сама ёю стаўшы, нявестку сваю прывячала? Не так ужо шмат варыянтаў. Палічыўшы, назавём толькі два. Першы — аддаць доўг. Так бы мовіць, за ўсё разлічыцца. Быццам слушна: чаму б і не? Другі...

Чытаю гэтымі днямі «Людзі і кветкі над Нёманам» пяра яснавяльможнай пані Арэшчыхі, як назваў Францішак Багушэвіч Элізу Ажэшку (юбілярку тыдня, між іншым), — і тут без стасункаў свекрыві з нявесткай не абышлося. І як, пытаецца аўтарка, стасункі гэтыя могуць быць добрымі? Як сэрца маці не зойдзецца ад горычы і зайздрасці, калі прыходзіць сын з працы дадому, яна яму боршч падае, а яму нясмачны боршч — мужчына раіць яго свінням выліць. А як сказала маці, што гатавала не яна, а Ганулька яго, дык ужо іншае прамаўляе сын: пасаліць толькі трэба, а так, маўляў, смачны.

«А ці любіць гэтага мужчыну хаця б адна з іх?» — падумала я. Корань сумнення тут просты: калі любіш, то гатуеш смачна. Яно неяк само так атрымліваецца. Па тэорыі кагнітыўных балансаў. Інакш — кагнітыўны дысананс.

А ці можна, любячы сына, не прымаць душою яго жонку? Прачытала вось у адным даследаванні, што толькі той раўнуе і зайздросціць, хто падсвядома адчувае, што сам нечага не дадаў.

...Калі ў мужа ёсць сястра — табе яна залвіца. І значыць, мае правы пацікавіцца ў цябе, калі ты ўжо сама свякроў: ці не крыўдзіць твайго сына «новая радня»? «Бо ўсе ж мы аднолькавыя», — запэўніць яна цябе. І адкіне на чвэрць стагоддзя назад. І прымусіць зноў думаць. І да чаго ты дадумаешся?

■

■ Паміж намі

# ДАВЯРАЙ І... ПРАВЯРАЙ?

**Заява ў ЗАГС была пададзена, да вяселля заставаліся лічаныя тыдні. У стане, які ўяўляў сабой сумесь эйфарыі, заклапочанасці і лёгкага смутку, Вольга насілася па крамах, час ад часу вар'яцеючы ад цэн на перадвясельныя дробязі і ўпрыгажэнні для нявест.**

З Пашам яна сустракалася гады тры, таму набыццё новага сацыяльнага статусу не абяцала якіх-небудзь заўважных перамен у трывалых, праверaных часам адносінах паміж маладымі... Яны бачыліся кожны дзень — пасля працы. Вольга, на ўсе сто працэнтаў упэўненая ў пачуццях свайго выбранніка, лёгка магла дазволіць сабе спазніцца — нават не на дзесяць хвілін, а на паўгадзіны. «Калі жанчына затрымліваецца, яна дае мужчыну падставу лішні раз падумаць пра яе», — апраўдвалася яна фразай, вывуджанай з вядомага кінафільма.

Часам яна і ўвогуле спазнялася на гадзіну, а то і на дзве, прычым спецыяльна,назіраючы ў гэты час з бліжэйшага ўніверсама, як бедны Паша марнее ў чаканні... Ёй прыносіла незвычайную асалоду бачыць яго хваляванні. Не тое, каб Вольга яго не кахала... Напэўна, такім чынам яна змагалася з уласным комплексам непаўнавартасці. Ёй мала было ведаць пра пачуцці свайго мужчыны — ёй неабходна было па некалькі разоў на тыдзень атрымліваць яскравыя пацвярджэнні гэтых пачуццяў.

Толькі так можна патлумачыць тое, што здарылася далей. А здарылася наступнае.

Неяк Вольга з сяброўкай выправіліся на вячэрні праменад. Зайшлі ў кавярню, выпілі па кактэйлі, потым яшчэ па адным, і яшчэ... І тут у прыгожай галоўцы Вольгі нарадзілася ідэя... (Дарэчы, усялякія цікавыя ідэі пачынаюць раіцца ў жаночых галовах ужо пасля першага кактэйлю. Але гэта зусім не азначае, што іх трэба адразу ж, не зыходзячы з месца, увасабляць у жыццё. А тут было выпіта па тры порцыі, і стоп-сігнал у выніку не спрацаваў.)

«А давай правядзем эксперымент!» — прапанавала Вольга. «У сэнсе?» — не зразумела сяброўка Віка. «А давай мы яго праверым!» — у без пяці хвілін жонкі аж вочы загарэліся. «Каго?» — удакладніла сяброўка. «Майго будучага мужа... Давай, тэлефануй!»

План быў да крыўднага прымітыўным. Набраць яго нумар, сказаць, што памылілася, знайсці зачэпку, каб прадоўжыць размову, і, нарэшце, прапанаваць сустрэцца... Сэнс эксперыменту (калі ў ім увогуле быў сэнс) заключаўся ў тым, што Вольга чарговы раз збіралася пераканацца ў непахіснасці маральных устояў свайго абранніка, а заадно і прадэманстраваць сяброўцы гранітную трываласць яго пачуццяў.

Шчыра кажучы, у яе ні на імгненне не ўзнікла думкі пра тое, што калі і адбываецца нейкая гульня, дык гульня з агнём...

А сяброўцы што? Узяла і патэлефанавала. Памурлыкала з ім, навешала локшыны пра тое, які ў яго прыемны голас — ну амаль як у таго вядомага тэлевядучага папулярнай праграмы... (Мужчыну ж для пацвярджэння таго, што ён самы цудоўны, шмат не трэба.) Ён і паддаўся! І доўга ўгаворваць нават не прыйшлося — праз сорак хвілін прымчаўся ў тую кавярню, як міленькі. Да Вікі. Папаўся, як той казаў, на гарачым.

Патэнцыяльная жонка — у слёзы:

— Ні бачыць, ні чуць цябе больш не жадаю, пралюбадзей няшчасны!

Сяброўка яе не супакойвала, бо не ведала, як. І чым увогуле можна суцешыць дзяўчыну, якая толькі што праглынула хлусню таго, з кім сабралася пад вянец?

Пазней Паша прыязджаў да яе, прасіў дараваць, тлумачыў, што ніякі ён не пралюбадзей, што хацеў сустрэцца з незнаёмкай, «толькі з цікаўнасці»... У кожным мужчыну, маўляў, сядзіць дух даследчыка. Яго цікавіць усё новае і неспазнанае. Але гэта зусім не азначае, што ён гатовы тут жа развітацца са старым. Ні ў якім разе!..

Вольга была няўмольная. Шлюбныя ўрачыстасці давялося адкласці да «лепшых часоў». Дзякуй Богу, гісторыя скончылася хэпі-эндам, віну сваю малады чалавек загладзіў узорна-паказальнымі паводзінамі, і вяселле нарэшце адбылося. Толькі вось сяброўку Віку маладая туды не запрасіла. Так ёй, сяброўцы, і трэба — не будзе ў наступны раз паддавацца на жаночыя правакацыі...

**Ала БЫВАЛАВА**

■



■ Гісторыя з канверта

## ЧОРНАЯ КОШКА Ў ЦЁМНЫМ ПАКОІ

СМІ часта любяць распавядаць пра раўнівых мужчын: маўляў, нешта там ён сабе нафантазаваў пра жонку — і гатова гісторыя, ад якой «у жылах стыне кроў». Лічыцца, што рэўнасць — гэта такая мужчынская асаблівасць, яшчэ з часоў Атэла. Прабачце, але ж і жанчыны ў гэтым сэнсе не лепшыя. У мяне перад вачамі жывы прыклад — мой сябар Антон. Яго (цяпер ужо былая) «палова» — назаву яе Валянцінай — была заўзятай прыхільніцай парадку. Толькі наводзіла яна яго, як бы гэта сказаць больш мякка... выбарачна. Аб'ектамі генеральнай прыборкі часцей за ўсё станавіліся пісьмовы стол мужа і яго вопратка. Калі ў Антона з'явіўся мабільны тэлефон, то наводзіць парадак Валянціна пачала і там. Раз-пораз праглядала «тэлефонную кніжку», пасля чаго ўчыняла мужу допыты з прыдзіркамі. Антон, чалавек інтэлігентны, ведаў жончыну слабасць і ставіўся да яе пафіласофску: асаблівa не пярэчыў. Больш за тое — у яго і ў думках не было хаваць свой тэлефон. І вось аднойчы, падчас чарговай «чысткі», Валянціна знайшла там новае жаночае імя, а менавіта «Святлана М.».

Антон (дарэчы, урач-стаматолаг) патлумачыў: гэта пацыентка, запісалася на пратэзаванне... Але Валянціна яго ўжо не чула. На наступны дзень, ледзь дачакаўшыся, пакуль муж пойдзе на працу, яна патэлефанавала гэтай самай Святлане... І адразу пайшла ў наступленне: маўляў, я ўсё ведаю, пакінь яго ў спакоі, а не пакінеш, я цябе... (ну, зразумела, што). У выніку на прыём да стаматолага Святлана М. у прызначаны час не з'явілася. Адчуваючы нядобрае, Антон сам патэлефанаваў ёй, а высветліўшы прычыну, папрасіў у медсястры валідол...

Добра, што Святлана М. аказалася жанчынай мудрай і некрыўдлівай. Яна зноў запісалася на прыём да Антона, яшчэ і супакойвала яго: маўляў, усё ў жыцці здараецца, не трэба так перажываць... Майму сябру, які не прывык да спачування, гэта вельмі спадабалася. Настолькі, што праз паўгода ён сабраў свае рэчы і пайшоў да Святланы назаўсёды.

Высновa? Не была б Валянціна такой раўнівай дурніцай, жыла б сабе сям'я і па сённяшні дзень. Так што, мілыя жанчыны, не варта шукаць чорную кошку ў цёмным пакоі, асабліва калі яе там няма.

**Андрэй Б-оў**, *г. Мінск*

■

■ Праверана на сабе

# СПАТКАННЕ ЎСЛЯПУЮ

**У аўторак я сустракалася з хлопцам з сайта знаёмстваў. Вечар атрымаўся. Напэўна, сышліся зоркі або проста дапамагла вывучаная ўздоўж і ўпоперак «інструкцыя да першага спаткання з віртуальным жаніхом».**



## ЛЮДНЫЯ МЕСЦЫ І СВЯТЛО

На спатканне Сяргея я паклікала сама: надакучыла глядзець у манітор камп'ютара. Пабачыць, як выглядае размоўца ў жыцці, адважылася на трэці дзень нашай перапіскі.

— Неяк у нас усё хутка закруцілася. Звычайна я з дзяўчатамі прыкладна пасля двухсотага паведамлення сустракаюся, а тут толькі 54, — пачаў размову «віртуальны жаніх».

Адназначнага адказу на пытанне, калі трэба анлайн-зносіны пераводзіць у рэальнасць, няма. Адны лічаць, чым хутчэй, тым лепш. Маўляў, можа прапасці цікавасць. Іншыя ўпэўненыя, што «сцiслыя тэрміны» актуальныя толькі для тых, хто шукае партнёра выключна для інтыму.

Сустрэліся мы ў цэнтры горада пасля працоўнага дня. «Правілы» раяць прызначаць спатканне толькі ў людных месцах і ў светлы час сутак. Перш за ўсё, дзеля вашай бяспекі. Забараняецца ехаць да кавалера на кватэру або на шашлыкі да яго сяброў. Кіно і тэатр таксама трэба адкласці: гэта не самае зручнае месца для знаёмства і размоў.

— Я цябе па абутку пазнаў, — усміхаючыся, сказаў Сяргей. — Чамусьці запомніўся ён мне. Перад тым, як да цябе падысці, зверыў усё з фотаздымкамі. Ведаеш, часта ў інтэрнэце бачыш адно, а ў жыцці зусім іншае.

Але «гэтая гісторыя» не пра мяне, запэўніў Сяргей, а я прыгадала правіла нумар 3. Дасведчаныя жанчыны раяць на першае спатканне ісці «сапраўднай», а яшчэ лепш падобнай да той, каго на фотаздымку ўбачыць хачу. Нядаўна прачытала на адным з жаночых форумаў «сардэчны крык» 25-гадовай дзяўчыны. Марына пытаецца, ці сустракацца ёй з хлопцам (перапісваюцца ўжо другі год!!!), калі яна направілася на 30 кілаграмаў? «На фота ў інтэрнэце я важу 55 кілаграмаў, а цяпер усе 85! Як ён гэта ўспрыме? Сяброўкі па інтэрнэце нават увагі на гэтыя слёзы не звярнулі. Усіх зацікавіў толькі той факт, што жаніх не прапанаваў сустрэцца раней. «Сто працэнтаў жонаты. Іншага тлумачэння такім паводзінам проста няма. Таму можаш есці далей свае булкі і таўсцець». Вось такая яна, жаночая анлайн-тэрапія...

## У ПАГОНІ ЗА ПРЫГОДАМІ

Сяргею 24 гады. Ён працуе і вучыцца на праграміста. Хлопец кажа, што на сайт знаёмстваў яго прывяла выключна цікавасць: як гэта працуе. За кампанію з Сяргеем на сайце паўгода таму зарэгістраваліся і пяць яго сяброў. Ніхто, дарэчы, анкету да гэтага часу не выдаліў. Эксперымент, відаць, спадабаўся...

— Я з чатырма дзяўчатамі з сайта знаёмстваў сустракаўся. Ні з адной не было другога спаткання. Ніхто не казаў, не зраслося. Адна ўвогуле дзіўная трапілася, усё пра нейкую секту расказвала. І голас непрыемны быў, — дзеліцца вопытам Сяргей.

Дарэчы, пра голас. Паводле «інструкцыі», абавязкова перад першым спатканнем трэба звязацца з кавалерам па тэлефоне, Viber, Skype, FaceTime. Лісты-лістамі, а голас і манера размовы могуць шмат што паведаміць пра чалавека нават за лічаныя хвіліны (сама ж гэты пункт я чамусьці праігнаравала).

— А што такая дзяўчына, як ты, шукае ў інтэрнэце? Упэўнены, у рэальным жыцці праблем з мужчынскай увагай у цябе дакладна няма, — запытаўся Сяргей.

— Напэўна, новых эмоцый захацелася, прыгод, — на хаду прыдумляю я.

— Тады ты дакладна па адрасе! Мішка, сябар, учора распавядаў, як хадзіў на спатканне з прыгажуняй Вікай з сайта знаёмстваў. Нёс кветкі Вікторыі, а падарыў іх... Свеце, суседцы па школьнай парце! Вось так бывае! Чым не прыгоды? — смяецца мой кавалер. — Аказваецца, Светка так змянілася, так папрыгажэла, што Мішка яе проста не пазнаў на фота! А назвацца ў інтэрнэце і каралевай Вялікабрытаніі можна, — дадаў Сяргей.

Паводле «інструкцыі», калі падчас інтэрнэт-зносін вы ўзялі нік (і выдалі яго за сваё асабістае імя), напрыклад Анжаліка, а на самой справе вас завуць Маша — пры сустрэчы скажыце кавалеру пра гэта. А яшчэ лепш — да сустрэчы. Можна перавесці гутарку ў жарт, маўляў, «заўсёды хацела быць Анжалікай, і ў інтэрнэце мая мара спраўдзілася». Раяць таксама казаць праўду і наконт астатніх рэчаў: месца працы, хобі, сямейнага становішча і г.д.

## УСЁ «ПА ІНСТРУКЦЫІ»

Ідэальны час для першага спаткання — паўтары, дзве гадзіны. За гэты час мы с Сяргеем паспелі папіць кавы (плаціў кавалер), пасядзець на дзвюх лаўках, паглядзець на фантаны і прайсціся пешшу некалькі прыпынкаў. Усё было добра, ён мяне не расчараваў... Калі ж вам не так моцна пашчасціць і суразмоўца не спадабаецца (а такіх выпадкаў шмат), — уцякайце! Але рабіце гэта прыгожа. «Правілы» раяць перад спатканнем папрасіць сяброўку патэлефанаваць вам праз паўгадзіны пасля вашай сустрэчы з «віртуальным жаніхом». Для яго гэты званок будзе званком «ад вашай мамы», якой тэрмінова спатрэбілася дапамога.

— Куды мы пойдзем у наступны раз? — раптам запытаўся Сяргей. — Якую кухню ты любіш? А якія кветкі?.. Ружы ці лілеі? Увогуле, трэба абмяняцца нумарамі тэлефонаў.

Па маёй ініцыятыве абышліся мы без нумароў, прозвішчаў і сяброўства ў сацыяльных сетках. Хлопец прапанаваў падвезці да дома на аўто, але я (усё «па інструкцыі») выбрала метро. Увечары Сяргей быў анлайн на сайце знаёмстваў. Запытаў, як я дабралася, і пажадаў добрай ночы. На наступны дзень і далей паведамленняў ад Сяргея не было... Відаць, не спадабалася яму тое, што я з ежай і кветкамі не вызначылася...

**Сафія ГРОМАВА**

■ Шкодныя парады

# ЯК РАЗБУРЫЦЬ СВОЙ ШЛЮБ? ЧЫТАЙЦЕ І РАБІЦЕ ВЫСНОВЫ

**Адгрымеў марш Мендэльсона, з'едзены ўсе салаты, распакаваны падарункі, а на вясельныя грошы набыты халадзільнік і тэлевізар... Надышлі звычайныя сямейныя будні, напоўненыя турботамі, прыцiркамі, бытавымі праблемамі, храпам мужа і брудным посудам... І цяпер самае галоўнае — не зрабіць ваш шлюб шчаслівым, а стаць у адзін шэраг з пераважнай большасцю пар, якія ўвесь час сварацца, не паважаюць думку сваёй палавінкі ішукаюць разумення ў іншым месцы. Гэта нескладана — проста трэба прытрымлівацца наступных парад.**

### ПАСТАЯННА КАНТРАЛЮЙЦЕ ЯГО

Вядома ж, ваш мужчына не здольны добра вымыць посуд, выбраць сардэлькі або купіць сабе футболку. Прыдзірлва сачыце за ўсімі яго дзеяннямі, кантралюйце кожны этап і перыядычна прыгаворвайце: «Ты як малое дзіця! Ну што ты робіш? Нічога без мяне не можаш». Так вы заб'яце ў мужу ініцыятыўнасць і самастойнасць — навошта яны яму? Лепш, калі ён успрымае вас як строгую маму і ўсё робіць толькі «з выспятка» — калі жонка не скажа, дык і паесці забудзецца.

### СТАНЬЦЕ РАЎНІВАЙ

Але не проста раўнівай, а раўнівай да вар'яцтва! Для пачатку пачніце тэлефанаваць мужу кожныя паўгадзіны і ўдакладняць, дзе ён, што робіць, як і навошта. Будзе злавацца — крыўдуйце, надзімайце губкі, але тэлефанаваць не перастаньце! Калі не будзе браць трубку — пішыце sms. Інтэрвал — дзесяць хвілін. Калі адключыць мабільны, тэлефануйце на працу, калегам. Нахабнічайце, як толькі можна!

Дома абавязкова правярайце сотавы тэлефон, электронную пошту, «гісторыю» ў інтэрнэце, вывaрочвайце кішэні, прынюхвайцеся да пінжака на прадмет паху жаночай парфумы, уважліва шукайце на кашулі плямы ад губной памады. Паверце, вельмі хутка вашаму мужу такі кантроль надакучыць, і ён навострыць ад вас лыжы. Але ж вам таго і трэба!

### ЖЫВІЦЕ ТОЛЬКІ СВАІМ ЖЫЦЦЁМ

Думайце толькі пра свае інтарэсы. Нічога страшнага, што няма часу накарміць мужа вячэрай або што вас няма дома ўжо пяты вечар за тыдзень. Вы ж такая самадастатковая асоба, у вас праекты, справы і г.д. Ён усё зразумее, пасумуе-пасумуе і... потым знойдзе тую, якая будзе чакаць яго пасля працы са смачным пловам.

### КАМАНДУЙЦЕ

Жанчына-кіраўнік абавязкова павінна, прыходзячы дадому, «строіць» мужа. Дайце яму зразумець, хто тут галоўны. Камандуйце, бо гэта ж у вас атрымліваецца лепш за ўсё. Вы так шмат дабіліся, што не павінны ні перад кім прыніжацца!

### ПАБОЛЬШ КРЫТЫКУЙЦЕ

Пастаянна бурчыце і крытыкуйце мужчыну за ўсё! Ён жа напэўна ўсё робіць няправільна, нават есць і мыецца. Бурчыце пастаянна, бурчыце заўсёды і ўсюды. Асабліва эфектыўна атрымліваецца бурчэць на публіку, дзе-небудзь пасярод гандлёвага цэнтра. Так, каб мужчыну было сорамна за сябе і яшчэ больш за вас. Урэшце яму захочацца знайсці жанчыну, якая не будзе дапякаць яго суткамі, і ён ад вас уцячэ.

### АРГАНІЗУЙЦЕ «СЕКСУАЛЬНЫ БУНТ»

Не займайцеся з мужам сексам ні пры якіх абставінах. Знаходзьце адгаворкі. Вы стаміліся, у вас баліць галава ці яшчэ што-небудзь... Галоўнае, каб мужчына зразумеў, што дома сексу ў яго не будзе, і пачаў яго шукаць у іншых месцах. Вось тут ужо і да разводу недалёка, трэба толькі праявіць кемлівасць і злавіць яго на месцы злачынства! (Гл. пункт 2-гі.)

### ПАРАЎНОЎВАЙЦЕ ЯГО З ІНШЫМІ

А вось муж сяброўкі зарабіў на новую машыну. А ў каляжанкі — ходзіць у спартзалу. А ў іншай сяброўкі муж наогул дэпутат. А ваш хто? Звычайны інжынер на звычайным заводзе. Ніякіх вам замежжаў і новых футраў — звычайнае ціхае сямейнае жыццё са старым рамонтам у кватэры. Параўноўвайце мужа з больш паспяховымі людзьмі, знішчайце яго самаацэнку. А каб дабіць канчаткова, параўноўвайце са сваімі былымі. Асабліва ў ложку. Мужчыны гэта вельмі «любяць»!

### АБМЯРКОЎВАЙЦЕ ЯГО З СЯБРОЎКАМІ

Вядома, сяброўкі павінны ведаць усё пра ваша асабістае жыццё. Асабліва дрэннае. Цудоўна, калі ў вас агульная кампанія, і мужы сяброўак кантактуюць з вашым сужэнцам. Тады і яны таксама будуць у курсе ўсіх яго промахаў і заган. Яшчэ адзін выдатны прыём: гаварыце пра мужа з сяброўкамі па тэлефоне ў яго прысутнасці. «Уяві, ён сёння ў ваннай зноў паслізнуўся! Вось няўклюда!» Ён гэта ацэніць, не сумнявайцеся.



### ЁН УВЕСЬ У БАЦЬКОЎ!

Пачніце гаварыць дрэннае пра яго бацькоў. Ніводзін нармальны чалавек не зможа вытрымаць, калі ганяць яго маці і бацьку. Так што сваркі і скандалы з нагоды вашага языка вам будуць забяспечаны, а там, глядзіш, і развод не за гарамі.

### НІЯКІХ ЗАХАПЛЕННЯЎ

У мужчыны не павінна быць сяброў і хобі. Толькі сям'я, праца і дом. І не дай Бог ён захапляецца лыжным спортам або паляваннем. Адбівайце ў яго любоў да гэтых неметазгодных мужчынскіх заняткаў з дапамогай скандалаў і ўльтыматумаў. Муж павінен быць побач з вамі. Крок направа, крок налева — расстрэл!

**Вы выконвалі ўсе нашы рэкамендацыі? Значыць, вынік дасягнуты — калі пасля ўсяго гэтага муж нікуды не сышоў, значыць, ён вас вельмі кахае. Ляжыць на канапе, ні да чога не імкнецца, увесь час ные і лічыць сябе нікчэмнасцю. Затое побач. Вы ж пра гэта марылі, праўда?**

**Вера ФЕМІНА.**

# Суботнік з Вожыкам

## ПЯРО СУМНЕННЯЎ

Мне здаецца, што дагэтуль
Столькі не было паэтаў.
Ці не спяць і не працуюць?
Усё рыфмуюць і рыфмуюць.

Пішуць вершы ўсе наўкола
Ад Кузьмы і да Міколы.
Як майстрыцы, ткуць радкамі:
Гэты — зрэб'е, той — арнамент.

У рэдакцыях — завалы:
Колькі мецяць у Купалы!
Ды смяюцца часам куры
З тонаў той макулатуры.

Вось і я мінулым летам
Палічыў сябе паэтам
І сур'ёзна з таго часу
Зацугляць рашыў Пегаса.

На паэзію стаў хворы,
Ў друк адправіў колькі твораў.
Каб пашырыць форму, тэму,
Замахнуўся на паэму!

У свой бок крытычна гляну —
Усё як быццам без заганаў.
Толькі, як Фама вядомы,
Сумняваюся да стомы.

На вушак прыбіў падкову:
Крытык скажа сваё слова
Плюс падтрымка з інтэрнэту —
Мо й запішуць у паэты...

**Валянцін ШВЕДАЎ,**
*г. Мінск.*

## Міранізмы




### Сярод аслоў

Больш не кідайце марна
Крыўдных слоў,
Як гэта адбывалася
Спрадвеку.
А што,
Як найдурнейшага з аслоў
Звяры за вочы
Клічуць чалавекам?..






— Ты ідэал шукаў,
Дык прама
Скажы:
Прапаў дарма запал?
— Знайшоў!..
Але яна таксама
Шукае ўласны
Ідэал...

**Міхась МІРАНОВІЧ.**

## Лімэрыкі

* * *

Паэт-летуценнік з Мёраў
Граматыку ледзьве агораў,
Ды строфы-аладкі
Пячэ без аглядкі
І нават рыхтуе збор твораў!




* * *



Шкаляр-выпускнік з Рагачова
Здаў тэсты свае паспяхова.
Цяпер для нявесты
Купляе сам тэсты —
Спазнаў юнак новы сэнс слова.

**Нічыпар ШЭРАНЬКІ.**
*г. Мінск.*

## У санаторыі

Як я трохі пастарэў,
Ў санаторый захацеў.
Трапіў — быццам на парад:
Добра ўсім за шэсцьдзясят.
Ды з пароды мы такія,
Што душою маладыя.
Для амурнае атакі
Можам выкінуць кульбакі
І з сястрыцай-маладзіцай
Спрытна ў танцы пакруціцца.
Хоць пасля — даўно вядома —
Будзем спіны лячыць дома,
Ды пакуль на адпачынку,
І стары дзядок — мужчынка!

**Уладзімір ЛАБКО,**
*г. Слонім.*

## Анекдоты




**З размовы з аператарам службы падтрымкі мабільнай сувязі:**

**— Прабачце, да мяне чамусьці не даходзяць паведамленні...**

**— Засяродзьцеся і ўважліва пачытайце іх яшчэ раз.**

☺☺☺

— Мілы, падары мне кацяня! Я яго буду любіць, лашчыць, цалаваць, купаць, у ложак з сабой браць...

— Мяў!..

☺☺☺

**Заходзячы ў інтэрнэт на пяць хвілін, памятайце: каструля пачынае смажыць пасля таго, як закончвае варыць.**




Малюнак Пятра КОЗІЧА.

## Вясёлы слоўнік




ВАНДРОЎНІК — кітайскі дрывасек.
ВЕСНІЦА — грак.
ВЫДРА — грэбень.
ГАДЗІННІК — серпентарый.
ГАРЛАЧ — оперны спявак.
ГРЭБЛЯ — канаістка.
ДРАПЕЖНІК — уцякач.
КАПЛІЦА — маленькі дождж.
ЛЕЦІШЧА — вырай.
НІЗКА — ліліпутка.
СМАКОЎНІЦА — жанчына-самельбе.

**Мікалай НАВАРЫЧ,**
*г. Мінск.*

## Вучыцца гуляючы

# СВЕТ У НЕБЯСПЕЦЫ!

**Злосныя пажыральнікі энергіі захапілі яго, прымушаючы нас шалёна марнаваць грошы. Але не ўсё страчана...**

Анлайн-гульню «SaveMan» на тэму энергаэфектыўнасці стварыў калектыў Віцебскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа машынабудавання.

Прайсці аўтарызацыю гульцы могуць праз сацыяльныя сеткі. Зарэгістраваныя ўдзельнікі разам з супергероем SaveMan (Зберагальнікам) праходзяць 10 узроўняў і перамагаюць пажыральнікаў энергіі. Перасоўваючыся ад узроўню да ўзроўню, яны знаходзяць рашэнне ў сітуацыях, з якімі мы ўсе сутыкаемся ў паўсядзённым жыцці. Усяго прадугледжана 1000 пытанняў. Правільна на іх адказваючы, гульцы эканомяць віртуальныя грошы, выдаткаваць якія можна на развіццё свайго персанажа. Гульня зроблена ў жанры MMRPG, які дазваляе далучаць неабмежаваную колькасць анлайн-удзельнікаў.

Віцебскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж машынабудавання з'яўляецца пілотным аб'ектам праекта ЕС / ПРААН «Энергаэфектыўнасць у школах».

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## Песню бярыце з сабой

# ЛАНДЫШАЎ ЦВЕТ

Лірыка Уладзіміра Карызны напоўнена пяшчотна-музычным гучаннем. Гэта адразу адчуваюць кампазітары. У вершах паэта іх прываблівае таксама і рамантычнае развіццё перажыванняў, і арганічнае судакрананне з фальклорнай вобразнасцю.

Шмат вершаў Уладзіміра Карызны пакладзена на музыку. Вельмі плённым стала супрацоўніцтва паэта з сынам-кампазітарам Уладзімірам Карызнам. Іх сумесныя песні «Каліна ў полі», «Зоркі золкае каханне», «Калі цябе сустрэў», «Чырванее каліна», «Хвіліна свята», «Жаночая ласка», «Звон часу», «Возера Свіцязь» з асаблівай далікатнасцю перадаюць хваляванні ў пачуццёвых зносінах. А песня «Ландышаў цвет» выглядае непамерклым успамінам пра маладосць.

